з асноўных. Патрэба правядзення з'езда была шмат у чым абумоўлена знешнімі фактарамі, а менавіта актывізацыяй у 1925 і 1926 г. прэтэнзій Польшчы і Літвы на атрыманне Метрыкі ВКЛ. Як адзначалася вышэй, у снежні 1925 г. IV з'езд польскіх гісторыкаў выказаў патрабаванне «вяртання» гэтага комплексу крыніц Польшчы. Тое ж патрабаванне было адной з умоў Літвы пры заключэнні дамовы з СССР аб ненападзе і мірным вырашэнні канфліктаў (падпісана 28 верасня 1926 г.) [14, с. 95]. Падтрымка з'езда была прадэманстравана вышэйшым кіраўніцтвам рэспублікі. Яго ганаровымі старшынямі з'яўляліся старшыня ЦВК БССР А. Р. Чарвякоў, старшыня СНК БССР Я. А. Адамовіч, першы сакратар ЦК КП(б)Б А. І. Крыніцкі і інш. Намеснік народнага камісара асветы А. В. Баліцкі ў вітальным слове адзначаў: «Адным з цікавейшых помнікаў з'яўляецца Літоўская Мэтрыка, якая знаходзіцца ў Маскве. Польшча дамагаецца ад СССР, каб гэты наш помнік забраць да сябе. Мы павінны заявіць тут, што гэты помнік старасьветчыны – наш, і *толькі Беларуская Савецкая ўлада* мае на яго права» [19, с. 8].

Вядучая роля на з'ездзе належала прадстаўнікам БДУ. Адметна, што праблема вяртання архіваў удзельнікамі з'езда напрамую звязвалася з навукова-даследчымі і адукацыйнымі патрэбамі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, а таксама Інстытута беларускай культуры – будучай Акадэміі навук Беларусі. Гэты падыход быў агучаны пры адкрыцці з'езда ў прывітальным слове ад імя БДУ, зачытаным дацэнтам, правадзейным членам Інстытута беларускай культуры В. Д. Дружчыцам (1886–1937): «У мінулым Беларусь мела свой універсітэт у Вільні. У пачатку (XVI ст.) гэта была акадэмія езуіцкая, а затым універсітэт шляхоцкі. Такім ён застаўся да самага зачыненьня ў 1832 г. З Кастрычніцкай рэвалюцыяй, калі рабочыя і сяляне ўзялі ўладу ў свае рукі, адчынілі сваю вышэйшую школу, якая павінна падрыхтаваць рабоча-сялянскую інтэлігенцыю. Падрыхтоўка, аднак, сустракае значныя перашкоды. Гэтыя перашкоды ляжаць у вадсутнасці сталых і належна распрацаваных навуковых падручнікаў, якія высьвятляюць прыродныя, гаспадарчыя, эканомічныя і гістарычныя веды аб Беларусі. Жаданьне Інбелкульту – сабраць крыніцы, падлічыць вынікі зробленага, пачаць плянавую працу ў археолёгіі і, разам з гэтым, высьветліць, дзе знаходзяцца архіўныя весткі. Грунтаваньне іх на тэрыторыі Беларусі з'яўляецца выжным момантам для гістарычнай навукі Беларусі, асабліва для тых новых дасьледчыкаў, якіх рыхтуе Беларускі Дзяржаўны Універсітэт…» [13, с. 222–223; 19, с. 10].

З'езд 1926 г. быў больш катэгарычным у сваіх патрабаваннях адносна лёсу архіўнай спадчыны краіны, і, у прыватнасці, той яе часткі, што адносіцца да перыяду ВКЛ. Акрамя Д. І. Даўгялы, гэту тэму закранялі ў сваіх дакладах і выступленнях М. В. Доўнар-Запольскі, В. Д. Дружчыц, Я. І. Васілевіч і інш. [19, с. 10, 11, 31–52]. Фактычна на аснове дакладаў і выступленняў прадстаўнікоў БДУ з'ездам больш востра было пастаўлена пытанне вяртання ў Беларусь з РСФСР, Украіны, Польшчы архіўных матэрыялаў айчыннага паходжання, звароту музейных і бібліятэчных каштоўнасцей. Рэзалюцыя № 1 з'езда датычылася менавіта Метрыкі ВКЛ. У адрозненне ад падзей 1924 г., калі прыярытэтам для кіраўніцтва архіўнай галіны БССР было недапушчэнне страты гэтага масіву крыніц для СССР, рэзалюцыя Першага з'езда даследчыкаў беларускай археалогіі і археаграфіі 1926 г. ужо выразна патрабавала «як найхутчэй перавезьці архіўны фонд Метрыкі Літоўскай у БССР». Аб частцы Метрыкі ВКЛ, якая апынулася ў іншых установах, напрыклад у архіве Міністэрства замежных спраў, згадвае другая рэзалюцыя [19, с. 5–6]. Акрамя таго, калі ў 1924 г. рэзалюцыі аб вяртанні архіваў датычыліся пераважна перамяшчэнняў перыяду 1915–1920 гг., то зараз размова ішла таксама аб фондах і дакументах, якія маглі трапіць у сховішчы Ленінграда, Масквы і іншых гарадоў Расіі ў ранейшыя перыяды айчыннай гісторыі. Такія дакументы былі згаданы ў выступленні М. В. Доўнар-Запольскага «Старыя Беларускія архівы за межамі Беларусі» [19, с. 31–52]. На ім варта спыніцца асобна.

У названым дакладзе вучоны ўпершыню называе акты з комплексу арыгіналаў дзяржаўнага архіва ВКЛ і адносіць іх да архіўнай спадчыны Беларусі. Аўтар прыводзіць каштоўны аналіз дакументаў, якія былі ім выяўлены за перыяд навукова-даследчай працы ў буйных дакументальных сховішчах Ленінграда, Масквы, Вільні, Варшавы, Львова, Кракава. Сярод рукапісных фондаў публічнай бібліятэкі ў Ленінградзе (цяпер – Расійская нацыянальная бібліятэка, далей – РНБ) вучоны называе групу матэрыялаў па сацыяльна-палітычнай, ваеннай, эканамічнай гісторыі ВКЛ і Рэчы Паспалітай XV–XVIII стст. [19, с. 31–36]. У фондзе лацінскіх рукапісаў М. В. Доўнар-Запольскім быў выяўлены зборнік з копіямі агульназемскіх прывілеяў ВКЛ і іншых дзяржаўна-прававых актаў за перыяд 1413 г. – не пазней за 1587 г. Зборнік быў створаны ў перыяд кіравання Стэфана Баторыя і ўяўляў сабой афіцыйна завераную копію актаў названага віду. Параўнанне спісу дакументаў з вядомым рэестрам дзяржаўнага архіва ВКЛ ад 26 лістапада 1623 г. дазваляе канстатаваць высокую ступень іх адпаведнасці [19, с. 31–32; 1, с. 252–263]. Згодна са зместам рэзалюцыі № 2 «Аб беларускіх архіўных фондах за межамі БССР», для якой артыкул М. В. Доўнар-Запольскага выступаў інфармацыйнай базай, «Публічная бібліятэка ў Ленінградзе» аднесена да месцаў, на матэрыялы якіх распаўсюджвалася «пажаданьне аб выкананьні звароту… у як найхутчэйшым часе (архіўныя фонды, што датычац-

ца Беларусі, дакументы і кнігі старых беларускіх архіваў)» [19, с. 5–6]. Такім чынам, відавочна, што прафесар М. В. Доўнар-Запольскі адназначна трактаваў названыя дзяржаўна-прававыя акты ВКЛ нават у форме копіі як частку беларускай архіўнай спадчыны[10].

Абгрунтаванне з'ездам такой трактоўкі матэрыялаў публічнай бібліятэкі пацвярджаецца наступным. Аналіз спісу, прыведзенага М. В. Доўнар-Запольскім, сведчыць, што гэта быў пераважна той масіў дакументаў бібліятэкі, які даследчыкамі ўжо другой паловы XX ст. ідэнтыфікаваны як «архіўная радзівіліяна» – частка фамільных збораў князёў Радзівілаў, якая ў пачатку XIX ст. трапіла на захоўванне ў Імператарскую публічную бібліятэку разам з калекцыяй першага загадчыка аддзела рукапісаў («Дэпо манускрыптаў») П. П. Дуброўскага (1754–1816) [22–24]. Сярод гэтых дакументаў знаходзіліся і асобныя акты з комплексу арыгіналаў дзяржаўнага архіва ВКЛ, якія яшчэ ў 1750-я гг. захоўваліся ў архіве Нясвіжскай ардынацыі Радзівілаў [25]. Ёсць падставы сцвярджаць, што радзівіліяна з калекцыі П. П. Дуброўскага паходзіла з Нясвіжа. Такая правеніенцыя некаторых рукапісаў была ўстаноўлена і самім М. В. Доўнар-Запольскім: па яго ацэнцы, «копіі Радзівілаўскага архіва» ў бібліятэцы дамінавалі ў агульным аб'ёме «дакументаў, якія адносяцца да Беларусі»[11].

Адметна, што акты, якія фігуруюць менавіта ў складзе комплексу арыгіналаў архіва ВКЛ, называе ў сваім дакладзе на Першым з'ездзе даследчыкаў беларускай археалогіі і археаграфіі таксама і Д. І. Даўгяла. Характарызуючы найбольш старажытныя і каштоўныя акты са складу Метрыкі ВКЛ, ён піша: «Ад старых часоў там захавалася ня дужа многа актаў, напрыклад: прысягі Карыбута (Зьмітро) Альгэрдавіча, Сьвідрыгайлы (Балеслава) Альгэрдавіча і інш., аб якіх ёсьць успаміны ў Мэтрыцы» [19, с. 54]. Гэтыя дакументы згаданы ў кнігах запісаў № 1 і № 2 Метрыкі ВКЛ сярод арыгіналаў у вопісе архіва ВКЛ 1570–1584 гг.[12] Ёсць падставы меркаваць, што яшчэ ў 1920-я гг. арыгінал першага з іх разам з некаторымі іншымі арыгіналамі актаў дзяржаўных архіваў ВКЛ і Каралеўства Польскага знаходзіўся ў публічнай бібліятэцы ў Ленінградзе, адкуль быў выдадзены Польшчы. Відавочна, што аднясенне актаў да каштоўных і шкадаванне аб невялікай іх колькасці ў Метрыцы ВКЛ сведчаць аб важнасці ва ўяўленні вучонага і саміх арыгіналаў.

Акрамя палажэнняў, якія датычыліся расійскіх архіваў, з'ездам былі сфармуляваны прэтэнзіі і да Польшчы ў частцы матэрыялаў менавіта XV–XVIII стст., «якія па сваім афіцыяльным пахаджэньні належаць да старых беларускіх архіваў». Спіс канкрэтных сховішчаў уключаў пераважна архівы і бібліятэкі Варшавы і Вільні і меў асновай даклад М. В. Доўнар-Запольскага. Просьба аб пастаноўцы пытання аб іх звароце накіроўвалася ва ўрад БССР. З'езд таксама прыняў важнае рашэнне аб унясенні ва ўрад Беларусі прапановы дэлегаваць прадстаўніка ў склад савецкай камісіі аб вяртанні Польшчы архіўных дакументаў згодна з артыкулам XI Рыжскай дамовы аб міры (у склад камісіі ўваходзіў прадстаўнік Украіны).

Апісаныя вышэй намаганні як навуковай, так і савецкай дзяржаўнай эліты Беларусі мелі свой плён. Зрухі пачаліся яшчэ пасля з'езда архіўных работнікаў БССР 1924 г. і працэсаў першага ўзбуйнення Беларусі. Даследчыкі адзначаюць, што ўжо ў пачатку 1925 г. з Расіі на Беларусь некаторыя фонды вярнуліся (дакументы фонду Мінскай духоўнай кансісторыі). Больш актыўна гэты працэс развіваецца ў другой палове 1925 – 1926 г. Маюцца звесткі аб вяртанні матэрыялаў Мураўёўскага музея ў Вільні, 25 скрынь з актавымі кнігамі былога Віцебскага цэнтральнага архіва старажытных актавых кніг[13]. Аднак найбольш істотнае значэнне ў дадзеных працэсах мелі стварэнне камісіі пры ЦВК СССР па праблеме вяртання архіваў саюзным рэспублікам (пастанова Прэзідыума ЦВК СССР ад 18 верасня 1925 г.) і адпаведныя рашэнні рэспубліканскіх органаў улады (пастанова Прэзідыума ЦВК БССР ад 2 кастрычніка 1925 г.

---

[10]Знаходка была зроблела вучоным яшчэ ў 1890-я гг. Яе лёс і сучасны стан не высветлены.

[11]У прыведзеным М. В. Доўнар-Запольскім спісе пазначаны наступныя ўліковыя нумары і такі каментарый даследчыка: «Поль., F. IV, № 183. Лісты фаміліі Радзівілаў 1548–1689 гг.»; «Поль. F. IV, № 184–223. Копіі з Радзівілаўскага архіву ў Нясьвіжы»; «Рас., F. в. № 42. Копія рэвізіі Берасьцейскага староства 1566 г., на 305 л. з Радзівілаўскай бібліотэкі»; «Тое ж, № 85. Выпісы з Радзівілаўскага архіву»; «У Публічнай Бібліотэцы я мог прымеціць толькі вельмі нямногае, бо кароткі час займаўся ў ёй. Усё-ж такі відаць, што тут павінна быць шмат дакументаў, якія адносяцца да Беларусі, не гаворачы ўжо аб копіях Радзівілаўскага архіву» [19, с. 34–35].

[12]Wiernoscz Corybutowa. 1388. Dymitr alias Corybut kx. Litewski czyni hold naiasnieissemu kx. panu Wladislawowi Croliowi Polskiemu, bratu swemu milemu, i naiasnieissey Croliowey Jadwidze, malzonce iego, i ich potomkom, i Coronie Polskiei. Datum w Crakowie w poniedzialek swiąteczny. Pod pieczęczią. Littera D.»; «[Wi]ernoscz Swidrygalowa. [1440. S]widrygal nawyssy wielki kx. litewski obieczuie i offiarue pod wiarą i podcziwosczią bycz wiernym naiassniessemu kx. Wladislawowi, z bozey laskj Croliowi Polskiemu i Ellectowi Kroliestwa Więgierskiego i iego bratu rodzonemu panu Cazimierzowi i wsytkiey Radzie Coronney Polskiei i Ruskiei. A nigdy niebycz przecziwko niem ani moczą ani slowem, uczynkiem, potęznosczią, alie onym zawse sprawiedliwą i prawdziwą radę i possilek dodawacz, wedlie szwey moznosczi, czo obeczuie dobrą wiarą i podcziwosczią wiernie zdzierzecz. Datum w Tlumaczu, w poniedzialek po octawie Swięta cziala Bozego. Littera C [26, с. 325].

[13]Факт вяртання з Расіі ў другой палове 1920-х гг. актавых кніг судовых устаноў ВКЛ з былых Віцебскага і Віленскага цэнтральных архіваў старажытных актавых кніг да канца не высветлены. Няма дакладных звестак, што канкрэтна паступіла з г. Яраслаўля. У каталозе Дзяржаўнага архіўнага фонда БССР 1935 г. (неапублікаваны) актавыя кнігі судовых устаноў ВКЛ адсутнічаюць. Асноўная частка былога Віцебскага цэнтральнага архіва была вернута Літвой у БССР толькі ў 1960 г. [9, с. 92–94, 163–164].

аб вяртанні архіўных матэрыялаў з-за межаў БССР) [27, с. 25]. Камісія функцыянавала фактычна да пачатку 1927 г. Пазіцыя БССР адносна прэтэнзій на дакументы перыяду ВКЛ фармулявалася ў межах дзейнасці камісіі наступным чынам: прад'яўляць прэтэнзіі на «ўсе дакументы Вялікага княства Беларуска-Літоўскага, якія ня маюць адносін да УССР» (пратакол ад 14 кастрычніка 1925 г.) [12, с. 81–82; 5, с. 570–571]. На першапачатковым этапе дзейнасці камісіі (лістапад 1925 г.) праблема перадачы Метрыкі ВКЛ БССР знаходзіла разуменне. Працэс стрымлівала адсутнасць канчатковага рашэння ў адказ на прэтэнзіі Польшчы адносна гэтага фонду. У далейшым пытанне сустрэла вострую апазіцыю з боку дзеячаў Цэнтрархіва РСФСР і расійскіх вучоных. Цалкам спынілі ўзгаданыя працэсы стварэнне ў 1929 г. саюзнага органа па кіраванні архіўнай справай і распрацоўка норм аб канцэнтраванні ў саюзным цэнтры архіўных матэрыялаў «агульнасаюзнага значэння» (пастанова калегіі Цэнтральнага архіўнага ўпраўлення РСФСР ад 7 студзеня 1931 г.). Да такіх адносілася і Метрыка ВКЛ. Гэтыя падзеі не толькі зрабілі немагчымым вяртанне яе ў Беларусь, але сталі пачаткам адваротных працэсаў – перадачы ў цэнтральныя архівы СССР каштоўных матэрыялаў з архівасховішчаў саюзных рэспублік, у тым ліку з БССР [9, с. 95–113]. Канстатацыя Другой нарадай архіўных работнікаў Беларусі (19–24 снежня 1927 г., Мінск) факта вяртання Метрыкі ВКЛ як здзейсненага не адпавядае рэчаіснасці [27, с. 35, 68]. Згодна з прынятай пастановай аб Адзіным дзяржаўным архіўным фондзе БССР ад 28 мая 1927 г., у яго межах выдзяляліся чатыры асноўныя часткі. Самастойную катэгорыю ўтваралі «Старажытныя актавыя кнігі і дакументы перыяду да Рэчы Паспалітай». У канцы 1927 г. кіраўніцтва галіны, аднак, прызнавала наступнае: «Архивных материалов этой категории не так много, и они собираются в Могилёвском историческом архиве и образуют секцию “старадаўных дакумэнтаў”» [27, с. 40]. Такім чынам, пераважна вярталіся матэрыялы ўстаноў Расійскай імперыі [12, с. 29–30]. Актаў органаў улады перыяду ВКЛ і Рэчы Паспалітай у 1920-я гг. амаль не паступіла.

У кантэксце вышэйапісанага для разгляду ўзнятай тэмы важнае значэнне мае наступны факт. Матэрыялы дзейнасці камісіі ЦВК СССР па вяртанні архіваў саюзных рэспублік, а таксама нацыянальнай камісіі ўтрымліваюць каштоўныя звесткі аб заяўках беларускага боку на дакументы, што мелі ўскосныя адносіны да комплексу арыгіналаў дзяржаўна-прававых актаў архіва ВКЛ. Так, 16 лістапада 1925 г. на пасяджэнні падкамісіі М. В. Доўнар-Запольскім узнімалася пытанне «О грамотах удельных князей литовских», якія, па яго даных, захоўваліся ў былым архіве Міністэрства замежных спраў, у фондзе так званага «Древлехранилища» (пункт 18)[14]. Гэта ж ці падобная пазіцыя названа і ў адным з чатырох больш дэтальных спісаў, якія ў працэсе працы камісіі былі падрыхтаваны беларускім бокам на аснове агульнага спіса, што складаўся з 68 пазіцый: «3. Грамоты Вел(икого) Кн(яжества) Литовского, переданные при перевозке Литовской Метрики из Сената в Московский архив М(инистерства) Юст(иции)» [12, с. 91]. Адметна, што гэты пункт у спісе змешчаны сярод першых і побач з пунктам «2. Архивный фонд Метрики Литовской». Вядома, што ў дзяржаўных архівах ВКЛ і Каралеўства Польскага захоўваліся акты прысягі шэрагу князёў ВКЛ у вернасці каралю польскаму Уладзіславу-Ягайлу і каралеве Ядвізе канца XIV – пачатку XV ст. Асноўная іх маса ўваходзіла ў склад так званага Архіва скарбца кароннага (Каралеўства Польскага), што пацвярджаецца адпаведнай уліковай дакументацыяй архіва, у тым ліку знакамітым вопісам М. Кромера 1551 г. [28, с. 453–460]. Гэтыя дакументы ў канцы XVIII ст. былі вывезены ў Расію і змешчаны разам з Кароннай метрыкай пры трэцім дэпартаменце Сената ў Санкт-Пецярбургу. У пачатку XIX ст. частка іх была перададзена ў Імператарскую публічную бібліятэку, дзе і захоўвалася да XX ст.[15] Частка актаў, у тым ліку згаданых вышэй, верагодна, патрапіла ў «Древлехранилище», а пазней – у архіў Міністэрства замежных спраў Расіі. Адзінкавыя акты названай групы яшчэ ў 1551–1584 гг. пры нявысветленых абставінах апынуліся ў складзе дзяржаўнага архіва ВКЛ і ўпершыню былі зафіксаваны ў яго вопісе 1570–1584 гг. Архіўны лёс асобных з іх падзяліў гісторыю комплексу, якім з другой паловы XVII ст. завалодалі Радзівілы [26, с. 325; 1, дадатак]. Фармулёўка пытання ў разгледжаным праекце пратакола 1925 г. не дае дакладнага адказу на пытанне аб ступені ідэнтычнасці дакументаў. Аднак факт цікавасці да названай групы актаў выразна сведчыць аб атаясамленні іх айчыннымі спецыялістамі з нацыянальнай гістарычнай каштоўнасцю Беларусі. У красавіку 1927 г. Цэнтрархіў РСФСР канстатаваў факт перадачы заяўленых грамат Польшчы: «Грамоты Великого княжества Литовского (п. 3), вывезенные из Краковского архива, Российско-Украинской делегацией возвращены

[14]Дзяржаўнае сховішча старажытных хартый, рукапісаў і пячатак (рус. *Государственное древлехранилище хартий, рукописей и печатей*) створана ў Маскве ў 1851 г. як аддзел Збройнай палаты. У 1882 г. асноўная маса дакументаў увайшла ў склад Маскоўскага галоўнага архіва Міністэрства замежных спраў, зараз яны знаходзяцца ў складзе Расійскага дзяржаўнага архіва старажытных актаў.

[15]«Выписка из книги, хранящейся в Метрике при Канцелярии 3-го Департамента Сената, под следующим заглавием: Опись делам в картонах находящимся, составленная 1808 года, по старым Варшавским регистрам, с отметками, какия пиесы по сличении с теми же регистрами не оказались, какия остались в Метрике и какия выданы в Императорскую Библиотеку под росписку Кол(ежского) Сов(етника) Дубровского» [28, с. 457, 461–467].

в 1923 г. Польше вместе с Коронной метрикой, по принадлежности» [12, с. 96].

У наступным пункце размова, верагодна, ідзе аб матэрыялах нясвіжскага паходжання, якія былі выяўлены М. В. Доўнар-Запольскім у Імператарскай публічнай бібліятэцы (гл. вышэй): «21. О рукописных книгах, в частности, о копиях с документов из Несвижского архива Радзивиллов, сделанных Гильдебрантом, и о рукописных статутах, хранящихся в Рукописном отделении Ленинградской публичной библиотеки» [9, с. 100]. У спісах прэтэнзій беларускага боку гэтыя пазіцыі адлюстраваны так: «2. Копии документов из Несвижского архива Радзивиллов. 3. Рукописные списки Статута Вел. кн. Литовского…» [12, с. 94]. Дадзены пункт з’яўляецца адным з найбольш ранніх фактаў дэманстрацыі інтарэсу беларускай дзяржавы да матэрыялаў Нясвіжскіх збораў Радзівілаў і прэтэнзій на гэтыя дакументы. Іх актывізацыя адбудзецца пасля 1939 г., калі стане вядома аб вывазе Радзівіламі часткі Нясвіжскага архіва ў Варшаву. Абодва пункты названага спісу не былі рэалізаваны.

На жаль, падзеі ў самой БССР у канцы 1920-х – 1930-х гг. таксама не спрыялі вырашэнню праблемы вяртання архіўнай спадчыны ВКЛ. У лютым 1926 г., неўзабаве пасля Першага з’езда даследчыкаў беларускай археалогіі і археаграфіі, супраць вядучага яго ўдзельніка – М. В. Доўнар-Запольскага – разгарнулася ідэалагічная барацьба, якая скончылася яго высылкай з БССР. Яна была звязана з крытыкай партыйнымі органамі і забаронай публікацыі яго працы «Гісторыя Беларусі» [15, с. 44–49]. Кампанія супраць вучонага стала пачаткам паступовага зварочвання прапанаваных ім і яго калегамі ініцыятыў. Пазней фактычна ўсе асноўныя дзеячы апісаных вышэй падзей у той або іншай ступені пацярпелі ад рэпрэсій. У 1930-я гг. дзейнасць па адстойванні законных правоў і інтарэсаў Беларусі ў галіне архіваў ставілася ў віну кіраўніцтву Цэнтрархіва БССР і кваліфікавалася як праяўленне «беларускага нацыяналізму», супраціўленне цэнтралізацыі архіўнай справы ў СССР [29, с. 17]. Прэтэнзіі на Метрыку ВКЛ сталі выступаць злачынствам, таму што былі выразным пасяганнем на фонды агульнасаюзнага значэння. Падпарадкаванне з 1938 г. архіўнай сістэмы БССР Народнаму камісарыяту ўнутраных спраў было адлюстраваннем тэндэнцый таталітарызму і праследавання нацыянальных рухаў ва ўнутранай палітыцы кіраўніцтва СССР[16]. Праблемы вяртання архіўнай спадчыны саюзных рэспублік гэтай палітыцы не адпавядалі. Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны, 29 сакавіка 1941 г., было прынята Палажэнне аб дзяржаўным архіўным фондзе СССР, якім зацвярджалася сетка цэнтральных архіваў СССР, чым канчаткова замацоўваўся іх профіль як устаноў з матэрыяламі агульнасаюзнага значэння. Адпаведна, вяртанне актаў высокай навуковай і гісторыка-культурнай каштоўнасці саюзным рэспублікам гэтаму прынцыпу супярэчыла. У 1960-я гг. прадстаўнікі кіраўніцтва архіўнай галіны СССР заяўлялі наступнае: «…вопрос о Литовской Метрике давно решен и в будущем к нему не следует возвращаться ни в письменном, ни в устном виде» [30, с. 33].

Вяртанне Метрыкі ВКЛ на Беларусь адбылося толькі ў 1992 г. Яна была вернута ў форме копій, выкананых на аснове тэхнікі мікрафільмавання. Аб завяршэнні праекта прадстаўнікамі дзяржаўнай архіўнай службы было паведамлена 28 студзеня 1992 г. на адным з пасяджэнняў камісіі «Вяртанне». Мікрафільмы (пазітывы) – 663 адзінкі захоўвання – з фонду № 389 Цэнтральнага дзяржаўнага архіва старажытных актаў былі ўключаны ў склад Цэнтральнага дзяржаўнага гістарычнага архіва Беларусі (НГАБ) у выглядзе калекцыі «КМФ-18»[17]. Айчынны даследчык М. Ф. Шумейка адзначае, што выраб копій адбываўся за кошт беларускага боку, у фінансавым выражэнні ён аказаўся дастаткова значным [9, с. 200, 202]. Важную ролю ў здзяйсненні гэтага сапраўды эпахальнага для краіны праекта адыграў тагачасны начальнік Галоўнага архіўнага ўпраўлення пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь, а з 15 кастрычніка 1992 г. – кіраўнік Камітэта па архівах і справаводстве пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь А. М. Міхальчанка – адзін са стваральнікаў першага ў рэспубліцы самастойнага гісторыка-архівазнаўчага аддзялення на гістарычным факультэце БДУ.

## Заключэнне

Такім чынам, у 1920-я гг. страчаная архіўная спадчына Беларусі і, у прыватнасці, Метрыка ВКЛ разглядалася кіраўніцтвам краіны, яе інтэлектуальнай элітай як важны элемент у працэсах дзяржаўнага будаўніцтва БССР. Асноўная роля ў ініцыяванні яе вяртання, навуковым абгрунтаванні, арганізацыйным і інфармацыйным суправаджэнні яго здзяйснення належала прафесарска-выкладчыцкаму складу і кіраўніцтву Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Рэалізацыя дадзенай ідэі аказалася немагчымай па прычыне змены пазіцыі саюзнага кіраўніцтва па гэтым пытанні, што ў значнай

[16]27 верасня 1938 г. была прынята пастанова Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР аб перадачы архіўных устаноў краіны пад кіраўніцтва НКУС. У складзе гэтага ведамства і яго правапераемнікаў дзяржаўныя архівы знаходзіліся да 1960 г.

[17]НГАБ. КМФ-18. Воп. 1. Прадмова да вопісу. Першай вяртання Метрыкі ВКЛ у форме копій, выкананых на аснове тэхнікі мікрафільмавання, здолела дабіцца ў 1967–1983 гг. Літоўская ССР (пазітывы і негатывы) [30, с. 39–40].

ступені было абумоўлена працэсамі цэнтралізацыі ў архіўнай галіне СССР у канцы 1920-х гг., а пазней – палітыкай згортвання беларусізацыі. Як падаецца, негатыўны ўплыў на працэс вяртання айчынных архіваў і яго вынікі мела таксама высылка з Беларусі ў 1926 г. прафесара БДУ М. В. Доўнар-Запольскага.

Пытанне вяртання ў той або іншай форме комплексу арыгіналаў дзяржаўна-прававых актаў у разглядаемы перыяд не фармулявалася як самастойнае па прычыне недастатковасці інфармацыі аб гісторыі і месцазнаходжанні комплексу, яго статусе як часткі дзяржаўнага архіва ВКЛ. Аднак вялікае навуковае і гісторыка-культурнае значэнне асобных актаў комплексу, а таксама цэлых іх відаў выразна прасочваецца ў кантэксце апісання складу Метрыкі ВКЛ, а пытанне вяртання актаў на Беларусь закранаецца ў дакументах, прысвечаных вяртанню архіўных матэрыялаў айчыннага паходжання ў цэлым, і дакументаў архіва Нясвіжскай ардынацыі князёў Радзівілаў у прыватнасці. Да цяперашняга часу дзяржаўныя архівы Беларусі не маюць у сваіх фондах ніводнага акта са складу названага комплексу, нават у форме копій. Выключэннем з'яўляюцца тэксты асобных актаў у складзе Метрыкі ВКЛ (НГАБ, мікрафільмаваная копія).

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Латушкін АМ. Рэестр дзяржаўнага архіва Вялікага Княства Літоўскага ад 26 лістапада 1623 г. і яго значэнне для рэканструкцыі складу комплексу арыгіналаў актаў кан. XIV – пач. XVII стст. *Беларускі археаграфічны штогоднік.* 2017;18:247–264.

2. Рыбакоў АЯ. Арганізацыя дзяржаўнага архіва Вялікага княства Літоўскага ў канцы XVI ст. *Архівы і справаводства.* 1999;2:70–76.

3. Ptaszycki S. Gdzie się przechowywały i przechowują obecnie akta unii Litwy z Polską? *Kwartalnik historyczny.* 1902;16(1):589–591.

4. Латушкін АМ. Дзяржаўныя акты Вялікага княства Літоўскага ў складзе Нясвіжскага архіва князёў Радзівілаў: стан і накірункі даследавання праблемы. У: Дзейчык НМ, Жумар СУ, Пазнякоў ВС і інш., рэдактары. *Мінулае і сучаснасць: архівы ў сістэме гуманітарных ведаў: матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі, прысвечанай 100-годдзю Віцебскай вучонай архіўнай камісіі; Мінск, Беларусь; 20 мая 2009 г.* Мінск: БелНДІДАС; 2010. с. 31–37.

5. Доўнар-Запольскі МВ. *Выбранае.* Мінск: Беларуская навука; 2017. 668 с.

6. Шумейка МФ. Гісторыка-прававыя і маральна-этычныя аспекты рэстытуцыі ў адносінах да беларускіх архіваў. *Архівы і справаводства.* 2000;4:91–100.

7. Пичета ВИ. Белоруссия и Литва XV–XVI вв. (исследования по истории социально-экономического, политического и культурного развития). В: Копысский ЗЮ, редактор. *В. И. Пичета*. Москва: Издательство АН СССР; 1961. 812 с.

8. Абламейка СУ, рэдактар. *Памяць і слава. Першы рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта – Уладзімір Іванавіч Пічэта.* Мінск: БДУ; 2011. 375 с.

9. Шумейко МФ. *Исторические и правовые аспекты реституции белорусских архивов.* Минск: БелНИИДАД; 2013. 269 с.

10. Баранава АУ. І. Пічэта і станаўленне архіўнай справы ў Беларусі ў 1920-я гг. *Архівы і справаводства.* 2007;3: 90–94.

11. Шумейко МФ, редактор. *Первая всебелорусская конференция архивных работников 12–15 мая 1924 г. Документы и материалы.* Минск: БелНИИДАД; 1999. 147 с.

12. Шумейко МФ. *Собрать рассеяное.* Минск: БелНИИДАД; 1997. 153 с.

13. Стражаў ВІ, рэдактар. *Памяць і слава. Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. 1921–1941.* Мінск: БДУ; 2006. 383 с.

14. Шумейко МФ. «Имеет мало организаторов ему равных»: к 150-летию со дня рождения М. В. Довнар-Запольского. *Беларуская думка.* 2017;6:90–98.

15. Унучак АУ. «Мы ёсьць народам»: М. В. Доўнар-Запольскі ў апошні перыяд жыцця і творчасці (1918–1934 гг.). У: Груша АІ, Аляхновіч РА, рэдактары. *Дзяржаўная гаспадарка Вялікага Княства Літоўскага пры Ягелонах.* Мінск: Беларуская навука; 2009. с. 28–49.

16. Лебедзева ВМ, рэдактар. *Мітрафан Віктаравіч Доўнар-Запольскі: біябібліяграфічны паказальнік.* 2-е выданне, дапоўненае. Мінск: БелНДІДАС; 2007. 168 с.

17. *Савецкая Беларусь.* 1925. 24 снежня. № 292.

18. Шумейко МФ. *Архивист и археограф Дмитрий Иванович Довгялло.* Минск: БелНИИДАД; 2002. 165 с.

19. *З'езд даследчыкаў беларускай археалогіі. Працы Першага з'езда даследчыкаў беларускай археалогіі і археаграфіі, 17–18 студзеня 1926 г.* Мінск: Інбелкульт; 1926. 86 с.

20. Даўгяла ДІ. Літоуская мэтрыка. *Савецкая Беларусь.* 1926. 29 студзеня. с. 6–7.

21. Даўгяла ДІ. *Літоўская Мэтрыка і яе каштоўнасьць для вывучэньня мінуўшчыны Беларусі.* Рыга: Беларускае выдавецтва ў Латвії; 1933. 14 с.

22. Копреева ТН. Обзор польских рукописей Государственной Публичной Библиотеки (Собрание П. П. Дубровского). *Труды Государственной публичной библиотеки имени М. Е. Салтыкова-Щедрина.* 1958;V(8):137–165.

23. Воронова ТП. Материалы к биографии П. П. Дубровского. В: *Источниковедческое изучение памятников письменной культуры: сборник научных трудов.* Ленинград: Государственная публичная библиотека; 1984. с. 120–130.

24. Кром ММ, редактор. *Памятники истории Восточной Европы. Источники XV–XVII вв. Том VI. Радзивилловские акты из собрания Российской национальной библиотеки: первая половина XVI в.* Москва, Варшава: Древлехранилище; 2002. 267 с.

25. Латушкін АМ. Акт перамір'я паміж Расійскай дзяржавай і Вялікім Княствам Літоўскім 1556 г. з Расійскай нацыянальнай бібліятэкі: пытанні правеніенцыі. В: Дулов АН, Румянцева МФ. *Актуальные проблемы источниковедения:*

*материалы IV Международной научно-практической конференции к 420-летию дарования городу Витебску магдебургского права; г. Витебск, Беларусь; 20–21 апреля 2017 г.* Витебск: ВГУ имени П. М. Машерова; 2017. с. 160–163.

26. Шамбинаго СК, Бережков НГ, редакторы. *Описание документов и бумаг, хранящихся в Московском архиве Министерства юстиции. Книга 21. Книги Литовской метрики. Часть XXVIII.* Москва: Товарищество Скоропечатни А. А. Левенсон; [1915, 1916]. 592 с.

27. Шумейко МФ, редактор. *Второе совещание архивных работников Беларуси, 19–24 декабря. 1927 г.* Минск: БелНИИДАД; 2001. 73 с.

28. *Книга посольская Метрики Великого Княжества Литовского, содержащая в себе дипломатическия сношения Литвы в государствование короля Сигизмунда-Августа (с 1545 по 1572 год)…* Москва: Университетская типография; 1843. 480 с.

29. Шумейка МФ. Цяжкі шлях вяртання. Намаганні беларускага нацыянальнага актыву дзеля звароту ў Беларусь архіўнай спадчыны ў 1920-я гг. *Спадчына.* 1998;6:10–24.

30. Ягелявичюс С. О том, каким образом микрофильмы Литовской Метрики оказались в Литве. *Новости Литовской Метрики.* 1999;3:32–40.

## References

1. Latushkin AM. [Register of State Archives of the Grand Duchy of Lithuania on 26 November 1623 and its significance for the reconstruction of the original composition of the complex acts of the late XIV – early XVII century]. *Belaruski arheagrafichny shtogodnik.* 2017;18:247–264. Belarusian.

2. Rybakou AYa. [Organization of the Grand Duchy of Lithuania in the state archive of the XVI century]. *Arhivy i spravavodstva.* 1999;2:70–76. Belarusian.

3. Ptaszycki S. Gdzie się przechowywały i przechowują obecnie akta unii Litwy z Polską? *Kwartalnik historyczny.* 1902;16(1):589–591. Polish.

4. Latushkin AM. [Public acts of the Grand Duchy of Lithuania as a part of Nesvizh archive of the Radziwill Princes: the status and direction of the research problem]. In: Dzeichyk NM, Zhymar SU, Paznjakow VS, editors. *Minulae i suchasnasc’: arhivy w sistjeme gumanitarnyh vedaw: matjeryjaly mizhnarodnaj navukovaj kanferjencyi, prysvechanaj 100-goddzju Vicebskaj vuchonaj arhiwnaj kamisii; Minsk, Belarus’; 20 maja 2009 g.* [The past and present in the archives of human knowledge system: materials of the International scientific conference dedicated to the 100th anniversary of the Viciebsk scientific archive commission; Minsk, Belarus; 20 May 2009. Minsk: Belaruski navykova-dasledchy instytut dakumentaznawstva i archiwnaj spravy; 2010. p. 31–37. Belarusian.

5. Dounar-Zapol’skiy MV. *Vybranae* [Favorites]. Minsk: Belaruskaya navuka; 2017. 668 p. Belarusian.

6. Shumejka MF. [Historical, legal and ethical aspects of restitution against the Belarusian archives]. *Archivy i spravavodstva.* 2000;4:91–100. Belarusian.

7. Picheta VI. [Byelorussia and Lithuania of the XV–XVI centuries (studies on the history of socio-economic, political and cultural development)]. In: Kopysskii ZYu, editor. *V. I. Picheta* [V. I. Picheta]. Moscow: Academy of Sciences of the USSR; 1961. 812 p. Russian.

8. Ablameika SU, editor. *Pamjac’ i slava. Pershy rjektar Belaruskaga dzjarzhawnaga wniversitjeta – Uladzimir Ivanavich Pichjeta* [Memory and Glory: The first rector of the Belarusian State University – Vladimir Picheta]. Minsk: Belarusian State University; 2011. 375 p. Belarusian.

9. Shumeyko MF. *Istoricheskie i pravovye aspekty restitutsii belorusskikh arkhivov* [Historical and legal aspects of the restitution of Belarusian archives]. Minsk: Belorusskii nauchno-issledovatel’skii institut dokumentovedeniya i arkhivnogo dela; 2013. 269 p. Russian.

10. Baranava AU. [Picheta and establishment of archives in Belarus in the 1920s.] *Archivy i spravavodstva.* 2007;3:90–94. Belarusian.

11. Shumeyko MF, editor. *Pervaya vsebelorusskaya konferentsiya arkhivnykh rabotnikov 12–15 maya 1924 g. Dokumenty i materialy* [First All-Belarusian Conference of Archival Workers May 12–15, 1924. Documents and materials]. Minsk: Belorusskii nauchno-issledovatel’skii institut dokumentovedeniya i arkhivnogo dela; 1999. 147 p. Russian.

12. Shumeyko MF. *Sobrat’ rasseyanoe* [Collect the scattered]. Minsk: Belorusskii nauchno-issledovatel’skii institut dokumentovedeniya i arkhivnogo dela; 1997. 153 p. Russian.

13. Strazhaw VI, editor. *Pamjac’ i slava. Belaruski dzjarzhawny wniversitjet. 1921–1941* [Memory and Glory. The Belarusian State University. 1921–1941]. Minsk: Belarusian State University; 2006. 383 p. Belarusian.

14. Shumeyko MF. [«It has few organizers to it»: on the 150th anniversary of the birth of M. V. Dovnar-Zapolskiy]. *Belaruskaya dumka.* 2017;6:90–98. Russian.

15. Unuchak AU. [«We have people»: M. V. Dounar-Zapolskiy in the last period of life and creativity (1918–1934.)]. In: Grusha AI, Alyahnovich RA, editors. *Dzjarzhawnaja gaspadarka Vjalikaga knjastva Litowskaga pry Jagelonah* [Granddaughters of the state economy of the Grand Duchy of Lithuania at the Jagiellonian]. Minsk: Belaruskaya navuka; 2009. p. 28–49. Belarusian.

16. Lebedzeva VM, editor. *Mitrafan Viktaravich Downar-Zapol’ski: bijabiblijagrafichny pakazal’nik* [Mitrafan Dounar-Zapol’sky: bibliographic index]. 2nd edition, added. Minsk: Belaruski navykova-dasledchy instytut dakumentaznawstva i archiwnaj spravy; 2007. 168 p. Belarusian.

17. *Savietskaya Belarus* [Soviet Belarus]. 1925. December 24. No. 292. Belarusian.

18. Shumeyko MF. *Arkhivist i arkheograf Dmitrii Ivanovich Dovgyallo* [Archivist and archeographer Dmitry Ivanovich Dovgyallo]. Minsk: Belorusskii nauchno-issledovatel’skii institut dokumentovedeniya i arkhivnogo dela; 2002. 165 p. Russian.

19. *Z’ezd dasledchykaw belaruskaj arhealogii. Pracy Pershaga z’ezda dasledchykaw belaruskaj arhealogii i arheagrafii, 17–18 studzenja 1926 g.* [The work of the First Congress of Belarusian researchers and archeology archeography, 17–18 January 1926]. Minsk: Inbelkult; 1926. 86 p. Belarusian.

20. Dawgjala DzI. [Lithuanian Metrics]. *Savietskaya Belarus*. 1926. January 29. p. 6–7. Belarusian.

21. Dawgjala DI. *Litowskaja Mjetryka i jae kashtownas'c' dlja vyvuchjen'nja minuwshchyny Belarusi* [Lithuanian Metrics and its value to the study of the past of Belarus]. Riga: Belaruskaye vydavectva w Latvii; 1933. 14 p. Belarusian.
22. Kopreeva TN. [Review of Polish manuscripts of the State Public Library (Collection of P. P. Dubrovsky)]. *Trudy Gosudarstvennoi publichnoi biblioteki imeni M. E. Saltykova-Shchedrina.* 1958(8):137–165. Russian.
23. Voronova TP. [Materials to the biography of P. P. Dubrovsky]. In: *Istochnikovedcheskoe izuchenie pamyatnikov pis'mennoi kul'tury: sbornik nauchnykh trudov* [Source study of written culture monuments: collection of scientific works]. Leningrad: Gosudarstvennaya publichnaya biblioteka; 1984. p. 120–130. Russian.
24. Krom MM, editor. *Pamyatniki istorii Vostochnoi Evropy. Istochniki XV–XVII vv. Tom VI. Radzivillovskie akty iz sobraniya Rossiiskoi natsional'noi biblioteki: pervaya polovina XVI v.* [Monuments of Eastern Europe. Sources XV–XVII centuries. Volume. VI: The Radziwill Acts from the Collection of the National Library of Russia: first half of the XVI century]. Moscow; Warsaw: Drevlekhranilishche; 2002. 267 p. Russian.
25. Latushkin AM. [Act armistice between the Russian state and the Grand Duchy of Lithuania in 1556 from the National Library of Russia: questions provenance]. In: Dulov AN, Rumyntseva MF, editors. *Aktual'nye problemy istochnikovedeniya: materialy IV Mezhdunarodnoi nauchno-prakticheskoi konferentsii k 420-letiyu darovaniya gorodu Vitebsku magdeburgskogo prava; g. Vitebsk, Belarus', 20–21 aprelya 2017 g.* [Actual problems of source. Materials IV International scientific-practical conference dedicated to 420th anniversary gift of Magdeburg law to the city of Vitebsk; Viciebsk, Belarus; 20–21 April 2017]. Viciebsk: Viciebsk State University named after P. M. Masherov; 2017. p. 160–163. Belarusian.
26. Shambinago SK, Berezhkov NG, editors. *Opisanie dokumentov i bumag, khranyashchikhsya v Moskovskom arkhive Ministerstva yustitsii. Kniga 21. Knigi Litovskoi metriki. Chast' XXVIII* [Description of documents and papers stored in the Moscow archive of the Ministry of Justice]. Moscow: Tovarishchestvo skoropechatni A. A. Levenson; [1915, 1916]. 592 p. Russian.
27. Shumeyko MF, editor. *Vtoroe soveshchanie arkhivnykh rabotnikov Belarusi, 19–24 dekabrya. 1927 g.* [The second meeting of the Archives of Belarus employees, 19–24 December 1927]. Minsk: Belorusskii nauchno-issledovatel'skii institut dokumentovedeniya i arkhivnogo dela; 2001. 73 p. Russian.
28. *Kniga posol'skaya Metriki Velikogo Knyazhestva Litovskogo, soderzhashchaya v sebe diplomaticheskiya snosheniya Litvy v gosudarstvovanie korolya Sigizmunda-Avgusta (s 1545 po 1572 god)…* [The ambassadorial book, Metrics of the Grand Duchy of Lithuania, containing diplomatic relations between Lithuania and the state of King Sigismund-August (from 1545 to 1572) … Moscow: Universitetskaya tipografia; 1843. 480 p. Russian.
29. Shumejka MF. [Hard way return. The efforts of the Belarusian national asset for the conversion to Belarus archival heritage in the 1920s]. *Spadchyna*. 1998;6:10–24. Belarusian.
30. Jageljevičius S. [About the way the microfilms of the Lithuanian Metric turned out to be in Lithuania]. *Novosti Litovskoi Metriki*. 1999;3:32–40. Russian.

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 10.10.2018.*
*Received by editorial board 10.10.2018.*

УДК 902:378.4(476-25)096«1934/1941»

# СТАНОВЛЕНИЕ АРХЕОЛОГИЧЕСКОГО ОБРАЗОВАНИЯ НА ИСТОРИЧЕСКОМ ФАКУЛЬТЕТЕ БЕЛОРУССКОГО ГОСУДАРСТВЕННОГО УНИВЕРСИТЕТА В 1934–1941 гг.

***А. В. ВАЙТОВИЧ***[1)]

[1)]*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь*

Рассматриваются малоизвестные страницы истории археологии и образования – преподавание дисциплин археологического профиля на историческом факультете БГУ в 1934–1941 гг. На основе архивных документов, материалов периодической печати и воспоминаний Р. А. Никольской прослежены основные вехи становления университетской археологии. Отмечено, что первоначальный учебный план включал целый ряд археологических дисциплин, однако в действительности студенты изучали только историю доклассового общества и основы археологии. Рассмотрены учебно-методические достижения преподавателей, характерные черты учебного процесса.

***Ключевые слова:*** история археологии; исторический факультет БГУ; археологическое образование; археологическая практика; музей.

***Благодарность.*** Автор высказывает искреннюю благодарность П. С. Курлович и В. В. Ашейчику за ценные советы в ходе обсуждения статьи.

# СТАНАЎЛЕННЕ АРХЕАЛАГІЧНАЙ АДУКАЦЫІ НА ГІСТАРЫЧНЫМ ФАКУЛЬТЭЦЕ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА Ў 1934–1941 гг.

***А. У. ВАЙТОВІЧ***[1*]

[1*]*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь*

Разглядаюцца малавядомыя старонкі гісторыі археалогіі і адукацыі – выкладанне дысцыплін археалагічнага профілю на гістарычным факультэце БДУ ў 1934–1941 гг. На падставе архіўных дакументаў, матэрыялаў перыядычнага друку і ўспамінаў Р. А. Нікольскай прасочаны асноўныя вехі станаўлення ўніверсітэцкай археалогіі. Адзначана, што першапачатковы вучэбны план уключаў цэлы шэраг дысцыплін археалагічнага профілю, аднак у рэчаіснасці студэнты вывучалі толькі гісторыю дакласавага грамадства і асновы археалогіі. Разгледжаны вучэбна-метадычныя дасягненні выкладчыкаў, адметнасці вучэбнага працэсу.

***Ключавыя словы:*** гісторыя археалогіі; гістарычны факультэт БДУ; археалагічная адукацыя; археалагічная практыка; музей.

***Падзяка.*** Аўтар выказвае шчырую падзяку П. С. Курловіч і В. У. Ашэйчыку за карысныя парады падчас абмеркавання артыкула.

**Образец цитирования:**
Вайтовіч АУ. Станаўленне археалагічнай адукацыі на гістарычным факультэце Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта ў 1934–1941 гг. *Часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Гісторыя.* 2019;1:23–33.

**For citation:**
Vaitovich AU. The becoming of the archaeological education at the faculty of history of the Belarusian State University in 1934–1941. *Journal of the Belarusian State University. History.* 2019;1:23–33. Belarusian.

**Автор:**
***Александра Владимировна Вайтович*** – кандидат исторических наук; доцент кафедры археологии и специальных исторических дисциплин исторического факультета.

**Author:**
***Aliaksandra U. Vaitovich***, PhD (archaeology); associate professor at the department of archaeology and special historical disciplines, faculty of history.
*vaitovich.aliaksandra@gmail.com*

Журнал Белорусского государственного университета. История. 2019;1:23–33
Journal of the Belarusian State University. History. 2019;1:23–33

# THE BECOMING OF THE ARCHAEOLOGICAL EDUCATION AT THE FACULTY OF HISTORY OF THE BELARUSIAN STATE UNIVERSITY IN 1934–1941

***A. U. VAITOVICH***[a]

[a]*Belarusian State University, 4 Niezaliežnasci Avenue, Minsk 220030, Belarus*

The article deals with the little-known pages of the history of archaeology and education. It reveals the main aspects of the teaching of archaeology and other disciplines of the relevant profile at the faculty of history of the BSU in 1934–1941. Using the archive sources, the materials of the periodicals and the memoirs of R. A. Nikolskaya, the author traces the most important stages of the becoming of the archaeological education at the BSU. The paper shows that the initial curricula of the faculty included several archaeological courses. Nevertheless, during the pre-war period the students studied only history of the pre-class society and archaeology. The article presents the main achievements of the teaching staff and the peculiarities of the learning process.

***Key words:*** history of archaeology; faculty of history of the BSU; archaeological education; field internship in archaeology; museum.

***Acknowledgements.*** The author expresses sincere gratitude to P. S. Kurlovich and V. U. Asheichyk for the valuable recommendations in the course of the discussion of the article.

## Уводзіны

Ключавой падзеяй 1930-х гг. у сферы айчыннай адукацыі стала Пастанова СНК СССР і ЦК УКП(б) «Пра выкладанне грамадзянскай гісторыі ў школах СССР», апублікаваная 16 мая 1934 г. Дакумент павінен быў прывесці гістарычную адукацыю ў адпаведнасць з патрабаваннямі часу, калі ва ўмовах складаных міжнародных абставін перад дзяржавай паўстала неабходнасць ідэалагічнай падрыхтоўкі моладзі да будучай абароны краіны. Асаблівая роля ў гэтым патрыятычным выхаванні адводзілася менавіта гісторыі. 24 мая 1934 г. выйшла Пастанова СНК БССР «Аб рабоце Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта», згодна з якой у БДУ быў створаны гістарычны факультэт. Пасля шматлікіх рэарганізацый вучэбнага працэсу канца 1920-х – пачатку 1930-х гг. было адноўлена выкладанне поўнага цыклу гістарычных дысцыплін, сярод якіх пэўнае месца заняла і археалогія.

Некаторыя аспекты станаўлення археалагічнай адукацыі на гістарычным факультэце БДУ ўжо закраналіся ў літаратуры. Так, спецыялістамі адзначалася ўключэнне археалогіі ў вучэбныя планы ўніверсітэта[1]. Даследчыкамі неаднаразова ўзгадваліся такія падзеі, як правядзенне першай археалагічнай практыкі студэнтаў і арганізацыя Гістарычна-археалагічнага музея[2] [1, с. 64, 161; 2, с. 187–190; 3, с. 16; 4, с. 35; 5, с. 51–57; 6, с. 104]. Аб'ектам вывучэння станавілася і выкладчыцкая дзейнасць славутага археолага А. М. Ляўданскага [7]. Тым не менш паўнавартаснага асэнсавання асаблівасцей выкладання археалогіі і гісторыі першабытнага грамадства на гістарычным факультэце БДУ ў даваенны час дагэтуль зроблена не было. Згаданым малавядомым старонкам гісторыі археалогіі і адукацыі і прысвечаны прапанаваны артыкул.

## Асноўная частка

Першы навучальны год на гістарычным факультэце пачаўся 1 верасня 1934 г. Вучэбны план (першую публікацыю дакумента гл. у [8, с. 345–349]), разлічаны на пяць гадоў, прадугледжваў падрыхтоўку выключна спецыялістаў-гісторыкаў, аднак уключаў цэлы шэраг дысцыплін археалагічнага профілю. Усе студэнты першага курса павінны былі слухаць агульны курс «Гісторыя дакласавага грамадства», на вывучэнне якога адводзілася 40 гадзін. Для студэнтаў чацвёртага курса ўсіх спецыяльнасцей прапаноўваўся факультатыў «Археалогія». Пяцікурснікі ў залежнасці ад выбранага кірунку былі абавязаны знаёміцца з наступнымі дысцыплінамі: «Гісторыя археалагічных адкрыццяў» (спецыяльнасць «Гісторыя старажытнага свету»), «Руская археалогія» (спецыяльнасць «Гісторыя СССР»), «Беларуская археалогія» (спецыяльнасць «Гісторыя Беларусі»), «Вывучэнне рэчавых помнікаў сярэдня-

[1]*Янин В. Л., Пряхин А. Д.* Археология на исторических факультетах классических университетов Российской Федерации. История, современность, перспективы // Commentarii de historia. 2000 [Электронный ресурс]. URL: http://www.hist.vsu.ru/cdh/Articles/04-06.htm (дата обращения: 01.08.2015).

[2]*Прыгодзіч Д. І.* Стварэнне і дзейнасць музеяў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта ў 1921–1941 гг. // София: электронный научно-просветительский журнал. 2018. № 2. С. 77 [Электронны рэсурс]. URL: http://elib.bsu.by/handle/123456789/208645 (дата звароту: 29.11.2018).

вечнай Еўропы» (спецыяльнасць «Гісторыя Сярэдніх вякоў»). Усе курсы былі разлічаны на 25–60 гадзін[3]. Забягаючы наперад, варта адзначыць, што згаданы план быў выкананы толькі часткова: на працягу ўсяго перадваеннага перыяду студэнты вывучалі толькі гісторыю дакласавага грамадства і асновы археалогіі (з 1938 г.).

Для выкладання дысцыпліны «Гісторыя дакласавага грамадства» быў запрошаны загадчык секцыі археалогіі Інстытута гісторыі Беларускай акадэміі навук А. М. Ляўданскі[4], які заняў пасаду дацэнта кафедры агульнай гісторыі[5]. Навуковец распрацаваў вучэбную праграму (першую публікацыю дакумента гл. у [7, с. 17–19]), у адпаведнасці з якой на занятках павінны былі разглядацца сем тэм: «Крыніцы для вывучэння дакласавага грамадства», «Перыядызацыя гісторыі дакласавага грамадства», «Стан вывучэння гісторыі дакласавага грамадства да Акцябрскай рэвалюцыі і пасля», «Праблемы паходжання чалавека», «Першабытнае стада», «Першабытная камуністычная арда», «Радавое грамадства»[6]. Мяркуючы па праграме, курс быў насычаны археалагічным матэрыялам, у тым ліку атрыманым на тэрыторыі Беларусі. Шырока прыцягваліся даныя прыродазнаўча-навуковых дысцыплін, выкарыстоўваліся дасягненні лінгвістыкі і этнаграфіі. Разам з тым у адпаведнасці з духам часу ў праграму быў уключаны і шэраг моцна палітызаваных пытанняў, напрыклад «Археалагічныя і іншыя сумежныя гістарычныя дысцыпліны на службе ў імперыялізму», «Археалогія на службе ў беларускіх нацдэмаў».

У 1935/36 навучальным годзе А. М. Ляўданскі стаў прафесарам кафедры агульнай гісторыі[7]. Як і раней, навуковец выкладаў дысцыпліну «Гісторыя дакласавага грамадства»[8]. Акрамя аўдыторных заняткаў, А. М. Ляўданскі праводзіў і прафарыентацыйную працу: разам з іншымі прафесарамі БДУ чытаў выязныя лекцыі для школьнікаў і навучэнцаў тэхнікумаў і рабфакаў[9]. Такая шматгранная дзейнасць не засталася не заўважанай кіраўніцтвам. У ліпені 1936 г. дэкан В. К. Шчарбакоў, падводзячы ва ўніверсітэцкай шматтыражцы чарговыя вынікі працы гістарычнага факультэта, узгадаў імя А. М. Ляўданскага ў спісе тых выкладчыкаў, якія «праявілі выключную актыўнасць і добрасумленнасць у сваёй рабоце»[10].

У 1936/37 навучальным годзе вядомы археолаг працягваў працу ў БДУ. У красавіку 1937 г. ён прыняў чарговы іспыт. Архіўныя матэрыялы сведчаць, што навуковец не быў надзвычай патрабавальным экзаменатарам: як правіла, пераважная большасць студэнтаў атрымлівала выдатныя адзнакі[11] (мал. 1).

Мернае акадэмічнае жыццё было раптоўна спынена. У маі 1937 г. А. М. Ляўданскі быў беспадстаўна арыштаваны, а 27 жніўня таго ж года – расстраляны [10, с. 9]. Згодна з тагачаснай практыкай, імя рэпрэсаванага выкладчыка перастала ўзгадвацца ў афіцыйнай дакументацыі. У выпісках з ведамасцей, якія атрымалі ў дадатак да дыпломаў першыя выпускнікі гістарычнага факультэта ў 1939 г., курс «Гісторыя дакласавага грамадства», прачытаны А. М. Ляўданскім, таксама адсутнічаў[12]. У тых выпадках, калі цалкам ігнараваць педагагічную дзейнасць вядомага навукоўца было немагчыма, яе прадстаўлялі выключна ў негатыўным святле. Так, у 1941 г. дэкан гістарычнага факультэта А. П. П’янкоў, падводзячы ў газеце «За ленінскія кадры» вынікі працы факультэта з нагоды дваццацігоддзя БДУ, сцвярджаў: «Для выкладання гістарычных дысцыплін былі запрошаны навуковыя работнікі Акадэміі навук БССР, сярод якіх былі замаскіраваныя ворагі народа. Арудуючы на факультэце, прадажныя найміты імперыялізма ўсяляк перашкаджалі яго развіццю. <…> Першыя два гады рад гістарычных курсаў чытаўся незадавальняюча. Асабліва гэта патрэбна сказаць аб гісторыі першабытна-абшчыннага ладу…»[13] Толькі ў 1960-х гг., пасля рэабілітацыі А. М. Ляўданскага, якая адбылася ў 1958 г., належная ацэнка дасягненняў аднаго з заснавальнікаў беларускай археалогіі зноў з’явілася ў працах універсітэцкіх выкладчыкаў [11].

Аднак варта вярнуцца да падзей 1930-х гг. У 1937/38 навучальным годзе курс па гісторыі дакласавага грамадства быў перададзены прафесару загадчыку кафедры гісторыі сярэдніх вякоў і старажытнай гісторыі М. М. Нікольскаму[14], які ўжо выкладаў гісторыю першабытнай культуры ў 1920-я гг. [12, с. 245–246].

[3]НАРБ. Ф. 205. Воп. 1. Спр. 1316а. Арк. 13–27.
[4]Там жа. Спр. 1318. Арк. 15.
[5]Адзіная кафедра, якая існавала на гістарычным факультэце БДУ ў 1934–1936 гг. Яе ўзначальваў дэкан факультэта В. К. Шчарбакоў (гл. [9, с. 32]).
[6]НАРБ. Ф. 205. Воп. 1. Спр. 1316а. Арк. 7–12 ; тут і далей цытаты прыводзяцца з захаваннем моўных асаблівасцей арыгінала. – *А. В.*
[7]Там жа. Спр. 636. Арк. 7, 31; Спр. 674. Арк. 2, 8, 26, 60.
[8]Там жа. Спр. 1322. Арк. 39–45.
[9]Там жа. Спр. 636. Арк. 31.
[10]За ленінскія кадры. 1936. 2 ліп. № 13 (24). С. 3.
[11]НАРБ. Ф. 205. Воп. 1. Спр. 1318. Арк. 15; Спр. 1322. Арк. 39–45; Спр. 1324. Арк. 49.
[12]Там жа. Спр. 1329. Арк. 69, 70, 87, 88.
[13]За ленінскія кадры. 1941. 25 сак. № 4 (119). С. 2.
[14]НАРБ Ф. 205. Воп. 1. Спр. 698. Арк. 1.


79
Экзамен по Истории доклассового общества
Список студентов 1-го к. Исторического факультета БГУ.

1. Вигдорчик И. В — Отлично
2. Гончаренок Н. Дм. — Отлично.
3. Кузнецов М. Е. — Отлично
4. Калинин И. Д. — Отлично
5. Кухаренок П. С. — Отлично
6. Карабельников Я. З. — Отлично
7. Куцевич Ф. С — Отлично
8. Левин — Посредственно
9. Луцкий И. — Посредственно
10. Марутко В. — Отлично
11. Михеев — Отлично
Ратклин — Отлично
13. Рейсон М — Отлично
14. Розин Ц. А — Отлично
15. Северин К. С — Посредственно
16. Станкевич К. Н — Отлично
17. Трякачев И. — Посредственно
18. Урванович Р. А. — Посредственно.
19. Файн М — Отлично
Центер Р. — Отлично
21. Чернявский П. Х. — Отлично
22. Шакаль — Отлично
23. Штейнгарт — Отлично
24. Эльяшев — Отлично
25. Юдин Н. А. — Отлично
Ульнов — отлично (пересдано).

Зачеты принял А. Н. Левданский 5

19/IV-937 г.

Зачеты заняли всего 7 ч.

*Мал. 1.* Экзаменацыйная ведамасць па курсе
«Гісторыя дакласавага грамадства» (1937).
Крыніца: НАРБ. Ф. 205. Воп. 1. Спр. 1324. Арк. 49

*Fig. 1.* Examination list for the course
on History of the Pre-Class Society (1937).
Source: The National Archives of the Republic of Belarus.
Fund. 205. Regist. 1. File 1324. P. 49

31 мая 1938 г. Усесаюзны камітэт па справах вышэйшай школы пры СНК СССР зацвердзіў новы вучэбны план па спецыяльнасці «Гісторыя». У адпаведнасці з ім у 1938–1941 гг. на гістарычным факультэце БДУ выкладаліся дзве дысцыпліны археалагічнага профілю: «Гісторыя дакласавага грамадства і Старажытнага Усходу» і «Асновы археалогіі»[15].

Аб’яднаны курс «Гісторыя дакласавага грамадства і Старажытнага Усходу» прапаноўваўся студэнтам-першакурснікам. Чытаць лекцыі павінен быў М. М. Нікольскі, аднак праблемы са здароўем прымусілі прафесара перадаць частку нагрузкі сваім аспірантам [6, с. 104]. Першы тэматычны блок курса па старажытнай гісторыі (варыятыўна ён называўся «Гісторыя першабытна-грамадскага ладу») быў даручаны М. С. Мохначу, другі, асноўны, – Р. А. Посэ[16] (мал. 2).

У 1938–1940 гг. М. С. Мохнач з’яўляўся выкладчыкам кафедры гісторыі старажытнага свету. У 1940/41 навучальным годзе ён заняў пасаду старшага выкладчыка кафедры, аднак свае абавязкі змог выканаць толькі часткова: у канцы першага семестра быў прызваны на зборы ў Чырвоную армію[17].

Лёс Р. А. Посэ ў 1930-х гг. складваўся больш драматычна. Пасля арышту былога мужа ў 1937 г. яна была звольнена з БДУ. Перамяніўшы некалькі месцаў працы, Р. А. Посэ ўладкавалася ў Аршанскім настаўніцкім інстытуце, а ў 1938 г. па ініцыятыве свайго навуковага кіраўніка была запрошана на гістарычны факультэт, дзе выконвала абавязкі дацэнта па сумяшчальніцтве[18] [13, с. 165–166, 187–197; 4, с. 48–52]. Ва ўспамінах яна з цеплынёй узгадвала гэты этап свайго жыцця: «Я снова вернулась в стены Университета, где я себя нашла. <…> Особые чувства я испытывала во время чтения лекций. Я сама переносилась в эту далекую древневосточную эпоху; мне казалось, что вместе со мной там оказывалась вся моя аудитория» [13, с. 198]. Універсітэцкае кіраўніцтва з падазронасцю ставілася да выкладчыцы з кляймом «жонка ворага народа»: на першай лекцыі Р. А. Посэ прысутнічаў нават сам дэкан гістарычнага факультэта А. П. П’янкоў, а наступныя заняткі часта стэнаграфаваліся [13, с. 189–190]. Тым не менш Р. А. Посэ пазбегла рэпрэсій і да пачатку Вялікай Айчыннай вайны працягвала працу ў БДУ [13, с. 189–198].

Стан крыніц не дазваляе высвятліць змест курса па гісторыі дакласавага грамадства і Старажытнага Усходу. У дакуменце «Сведения об имеющихся программах читаемых дисциплин по факультетам БГУ» ад 10 снежня 1938 г. прадмет, які выкладалі М. С. Мохначам і Р. А. Посэ, нават не ўзгадваўся[19]. У адпаведнасці з тыпавым статутам універсітэта, распрацаваным у 1939 г., гэты курс уваходзіў у лік тых дысцыплін, праграмы па якіх зацвярджаў Камітэт па справах вышэйшай школы пры СНК СССР[20]. Аднак яшчэ 14 мая 1939 г. выпускнікі гістарычнага факультэта абураліся на старонках універсітэцкай газеты: «22 мая студэнты V курса гістфака будуць здаваць першы прадмет – гісторыю старажытнага свету. <…> Яшчэ і зараз лектарамі праверана не ўсе праграмы. А між тым у праграмах ёсць многа спрэчных і неасветленых пытанняў»[21].

[15]НАРБ Ф. 205. Воп. 1. Спр. 708. Арк. 73, 75. Спр. 730. Арк. 23; Спр. 737. Арк. 89; За ленінскія кадры. 1938. 14 чэрв. № 11–12 (63–64). С. 3.
[16]Там жа. Спр. 708. Арк. 73; Спр. 716. Арк. 97; Спр. 719. Арк. 34; Спр. 1327. Арк. 18, 26, 29, 30.
[17]Там жа. Спр. 737. Арк. 89–90; Спр. 740. Арк. 304.
[18]Там жа. Спр. 719. Арк. 34.
[19]Там жа. Спр. 717. Арк. 61.
[20]Там жа. Спр. 725. Арк. 42.
[21]За ленінскія кадры. 1939. 14 мая. № 10 (84). С. 2.


26
Студентки I курса истфака БГУ т.т. Опацкая и Розенгауз сдали экзамен по истории первоб.-общинного строя и древн. Востока на отметку «хорошо».
Принял зачет Н. Мохнач.
18/V-39 г.

*Мал. 2.* Экзаменацыйная ведамасць па курсе
«Гісторыя дакласавага грамадства і Старажытнага Усходу» (1939).
Крыніца: НАРБ. Ф. 205. Воп. 1. Спр. 1327. Арк. 26

*Fig. 2.* Examination list for the course
on History of the Pre-Class Society and Ancient East (1939).
Source: The National archives of the Republic of Belarus.
Fund. 205. Regist. 1. File 1327. P. 26

З іншага боку, дакументы адлюстроўваюць незадаволенасць супрацоўнікаў кафедры ўзроўнем ведаў студэнтаў па згаданай дысцыпліне. У першым семестры 1940/41 навучальнага года «большая группа студентов истфака (I курс) не вошла во вкус вузовской серьезной работы. Не проработав учебных пособий и источников, они ограничились поверхностным повторением собственных записей лекций. В отдельных случаях знакомые с учебными пособиями студенты ограничивались их перелистыванием, не занимаясь их серьезным изучением и конспектированием. <…> Из 29 человек студентов I курса истфака 10 человек сдали на неудовлетворительно, а 8 заслужили той же отметки как не явившиеся на экзамен без уважительной причины, а просто чувствуя слабость в своих знаниях»[22].

Дысцыпліна «Асновы археалогіі», на вывучэнне якой адводзілася 60 гадзін, уваходзіла ў план трэцяга курса, а ў 1938/39 навучальным годзе чыталася і на чацвёртым курсе[23].

На працягу 1938–1941 гг. заняткі па археалогіі праводзіў У. І. Шаўчэнка. Яго жыццёваму шляху, навуковым і арганізатарскім дасягненням на гістарычным факультэце БДУ прысвечаны шэраг публікацый [2; 4], аднак архіўныя матэрыялы дазваляюць узгадаць і некаторыя малавядомыя эпізоды выкладчыцкай працы гэтага таленавітага чалавека. Выпускнік гістарычна-лінгвістычнага факультэта Ленінградскага ўніверсітэта, ён паспрабаваў свае сілы ў розных сферах дзейнасці, пакуль у 1938 г. не быў прыняты на пасаду дацэнта кафедры старажытнага свету і сярэдніх вякоў БДУ. Навуковыя інтарэсы У. І. Шаўчэнкі датычыліся гісторыі антычнай рэлігіі, але, нягледзячы на гэта, яму даручылі распрацаваць курс па асновах археалогіі. Разумеючы складанасць сітуацыі (пасля рэпрэсій 1937 г. у Беларусі ацалелі толькі два археолагі: супрацоўнік АН БССР К. М. Палікарповіч і В. Р. Тарасенка, які выкладаў у Магілёўскім педагагічным інстытуце), У. І. Шаўчэнка пагадзіўся чытаць згаданы курс, «только чтобы не срывать занятий»[24]. Выконваючы вялікую колькасць разнастайных абавязкаў, ён паспеў падрыхтаваць вучэбную праграму толькі напярэдадні зімовай сесіі 1938/39 навучальнага года, што было расцэнена ўніверсітэцкім кіраўніцтвам як «істотнае ўпушчэнне»[25]. Студэнцкія веды выкладчык ацэньваў даволі паблажліва, вельмі часта выстаўляючы выдатныя адзнакі[26] (мал. 3).

Менавіта з імем У. І. Шаўчэнкі звязаны пачатак правядзення археалагічных практык студэнтаў БДУ. Варта адзначыць, што пытанне аб неабходнасці арганізацыі археалагічнай экспедыцыі было ўзнята ўніверсітэцкім кіраўніцтвам яшчэ ў 1924 г. [12, с. 244], аднак спатрэбілася 15 год, каб «праект» стаў рэчаіснасцю. У 1938 г. у вучэбныя планы гістарычнага факультэта была ўключана вытворчая практыка. Упершыню яна была праведзена летам наступнага года. Большасць студэнтаўчацвёртакурснікаў працавалі ў архівах і бібліятэках

[22]НАРБ. Ф. 205. Воп. 1. Спр. 737. Арк. 90.
[23]Там жа. Спр. 708. Арк. 75; Спр. 737. Арк. 89; Спр. 1326. Арк. 50, 51.
[24]Там жа. Спр. 737. Арк. 92.
[25]За ленінскія кадры. 1939. 21 студз. № 2 (76). С. 2.
[26]НАРБ. Ф. 205. Воп. 1. Спр. 737. Арк. 89–90; Спр. 1326. Арк. 50, 51.



Ведомость Основы археологии
4 к. истфак. Б 24 гр. №

| Фамилия и имя студентов | оценка | № п/п | Фамилия и имя студентов | оценка |
|---|---|---|---|---|
| Буяков | хор. | 21 | Соболь | пос. |
| Василевич | отл. | 22 | Тризно | хор. |
| Гольдман И. И. | отл. | 23 | Фердер | хор. |
| Германт К. К. | хор. | 24 | Фицалевич | хор. |
| Герман К. И. | отл. | 25 | Шамаль | не явился |
| Гончаров В. | хор. | 26 | Шкрабов | отл. |
| Долгополов | отл. | 27 | Шамигов | отл. |
| Кучер | хорошо | 28 | Элькинд | посредств. |
| Кецко | не явился | | | |
| Лосковец | хор. | | | |
| Назаров | отл. | | Итоги: | |
| Панкевич | пос. | | отл. — 11 | |
| Петраченко | неуд. хор. 11/Г 39 | | хор. — 10 | |
| Панимусевич | неуд. посо. 11/Г 39 | | пос. — 5 | |
| Рудова | пос | | неуд. — 0 | |
| Рыбаков | хор. | | не явилось — 2 | |
| Савочкин | отл. | | Всего — 28 | |
| Свинкин | отл. | | | |
| Степаненко | отл. | | | |
| Санего | отл. | | | |

3/I 39

*Мал. 3.* Экзаменацыйная ведамасць
па курсе «Асновы археалогіі» (1939).
К р ы н і ц а: НАРБ. Ф. 205. Воп. 1. Спр. 1326. Арк. 51
*Fig. 3.* Examination list for the course
on Basic of Archaeology (1939).
S o u r c e: The National archives of the Republic of Belarus.
Fund. 205. Regist. 1. File 1326. P. 51

Мінска, Магілёва, Масквы і Ленінграда, 8 чалавек (крытэрыі іх выбару засталіся нявысветленымі) былі накіраваны ў гістарычна-археалагічныя музеі Феадосіі, Керчы, Херсанеса (мал. 4, 5). Кіраўніком групы быў прызначаны У. І. Шаўчэнка[27].

Праграма практыкі была вельмі насычаная. Студэнты працавалі на «пляцоўках раскопак музеяў» (гарадзішчах Херсанеса, Цырытакі, Фанагорыі і інш.), знаёміліся з «выключна багатымі музейнымі аддзеламі і заламі» і наведвалі шматлікія «выдатныя гістарычныя месцы» (у тым ліку Севастопаль, Бахчысарай, Інкерман)[28]. Вынікі «навукова-вытворчай» практыкі ацэньваліся студэнтамі вельмі высока: «Усё гэта дало нам магчымасць сабраць вялікія матэрыялы для курсавых работ. Лепшай характарыстыкай нашай работы з’яўляецца афіцыяльнае запрашэнне нас на сталую работу ў музеі, атрыманае намі на нарадах вучоных саветаў музеяў»[29]. Можна дадаць, што і дыферэнцыраваны залік практыканты здалі на выдатна[30] (мал. 6).

Надзвычай плённай аказалася паездка і для кіраўніка групы. Агучаная ў 1938 г. вучэбна-метадычная мэта яго камандзіроўкі (азнаямленне з методыкай правядзення археалагічных раскопак)[31] у 1939 г. была ўскладнена задачай фарміравання фондаў Гістарычна-археалагічнага музея БДУ [2, с. 188].

[27]НАРБ. Ф. 205. Воп. 1. Спр. 716. Арк. 25; Спр. 1326. Арк. 4, 7–9; За ленінскія кадры. 1939. 24 мая. № 11 (85). С. 1.
[28]За ленінскія кадры. 1939. 16 верас. № 12 (86). С. 2.
[29]Там жа.
[30]НАРБ. Ф. 205. Воп. 1. Спр. 1326. Арк. 4, 7–9.
[31]Там жа. Спр. 709. Арк. 32.



*Мал. 4.* Студэнты гістарычнага факультэта БДУ ў фондасховішчы Херсанескага гістарычна-археалагічнага музея (1939).
Крыніца: Музей гісторыі БДУ

*Fig. 4.* The students of the BSU in the depository of Historical and Archaeological Museum of Chersonesos (1939).
Source: Museum of the BSU History




*Мал. 5.* Студэнты гістарычнага факультэта БДУ ў бібліятэцы Херсанескага гістарычна-археалагічнага музея (1939).
Крыніца: Музей гісторыі БДУ

*Fig. 5.* The students of the BSU in the library of Historical and Archaeological Museum of Chersonesos. (1939).
Source: Museum of the BSU History


7

Деканат истфака БГУ.

Летняя практика студентов

1) Шалыгова Г.Т. } в Керченск. истор.-
2) Бобровского И.А. } археол. музее

3) Кокошинского А.Е. – в Херсонеск. гос. ист.-арх. музее

Зачтена на „отлично".

Доц. Шевченко

12/IX 1939 г.

*Мал.* 6. Заліковая ведамасць
па археалагічнай практыцы (1939).
Крыніца: НАРБ. Ф. 205. Воп. 1. Спр. 1326. Арк. 7

*Fig. 6.* Examination list
for the field internship in archaeology (1939).
Source: The National archives of the Republic of Belarus.
Fund. 205. Regist. 1. File 1326. P. 7

Арганізацыя гэтага новага падраздзялення ўніверсітэта стала яшчэ адным важным напрамкам дзейнасці У. І. Шаўчэнкі. У 1934/35 навучальным годзе на гістарычным факультэце быў адкрыты гістарычны кабінет[32], але яго праца выклікала нараканні з боку як студэнтаў, так і дэканата. Студэнты скардзіліся, што «работа ў габінеце не арганізавана. Габінет ператварыўся ў частку чытальні, ды к таму ж дрэннай чытальні, бо ў габінеце брудна, на падлозе смецце, шумна, наглядныя дапаможнікі, карты вісяць на сценах як папала. На шафах і за шафамі – склады ўціль-сыравіны»[33]. Кіраўніцтва факультэта было незадаволена кваліфікацыяй супрацоўнікаў гістарычнага кабінета і прызнавала мэтазгоднасць адкрыцця музея «в связи с курсом “Основы археологии”»[34]. Музей быў створаны, згодна з загадам рэктара, у лютым 1940 г., і менавіта У. І. Шаўчэнка быў прызначаны яго загадчыкам.

Сумяшчаючы новыя абавязкі з выкладчыцкай дзейнасцю і напісаннем дысертацыі, У. І. Шаўчэнка прыкладаў вялікія намаганні да папаўнення і ўпарадкавання музейных збораў. Аснову фондаў склалі шматлікія артэфакты, перададзеныя музеямі, на базе якіх студэнты БДУ праходзілі археалагічную практыку ў 1939 г. У лік атрыманых матэрыялаў уваходзілі надмагільныя помнікі, кераміка і манеты[35].

Вялікае значэнне надавалася і «калекцыі муляжэй па старажытна-ўсходніх рэлігіях»[36], якая мела адмысловую гісторыю. Яшчэ ў 1920-х гг. М. М. Нікольскі, ствараючы на педагагічным факультэце ўніверсітэта вучэбны музей па гісторыі культуры, атрымаў з Ленінграда гіпсавыя копіі «з прыгожых помнікаў Дзяржаўнага Эрмітажа»[37], а таксама «помнікаў па гісторыі рэлігіі Старажытнага Усходу»[38]. У хуткім часе музей быў ператвораны ў антырэлігійную выставу, а ў пачатку 1930-х гг. пасля «разукрупнения» БДУ і вывядзення педагагічнага факультэта са складу ўніверсітэта рэшткі збораў былі перададзены ў фонды Мінскага абласнога гістарычнага музея. Толькі ў 1940 г. копіі рарытэтаў зноў трапілі пад універсітэцкі дах[39]. Тады ж «аддзел Старажытнага Усходу» быў папоўнены новымі матэрыяламі, у тым ліку рэканструкцыяй фрэсак з палаца цароў шумерскага горада Мары, зробленай М. М. Нікольскім[40].

Вялікую падтрымку маладому музею аказаў Дзяржаўны Эрмітаж, перадаўшы ў 1940 г. багатую калекцыю антычных і візантыйскіх манет[41] [2, с. 189; 5]. Шэраг «каштоўных фота і экспанатаў» быў перададзены музейнымі ўстановамі Слоніма, Ваўкавыска і Гродна[42], што, верагодна, стала адным з вынікаў камандзіроўкі У. І. Шаўчэнкі ў Заходнюю Беларусь у якасці старшыні Музейнага савета Народнага камісарыята асветы БССР у тым жа 1940 г. [2, с. 189]. Нарэшце, фонды Гістарычна-археалагічнага музея БДУ папаўняліся і дзякуючы прыватным дарэнням: напрыклад, М. С. Мохнач прынёс зуб мамантa[43].

Асноўная экспазіцыя, прысвечаная гісторыі старажытнага свету, дапаўнялася выставамі на актуальную палітычную і ідэалагічную тэматыку[44]. Надзённай задачай з’яўлялася і стварэнне «аддзелу» гісторыі Беларусі[45].

[32]За ленінскія кадры. 1941. 25 сак. № 4 (119). С. 2.
[33]Там жа. 1935. 8 снеж. № 10. С. 3.
[34]НАРБ. Ф. 205. Воп. 1. Спр. 716. Арк. 113.
[35]Там жа. Спр. 737. Арк. 92–93; За ленінскія кадры. 1941. 4 сак. № 3 (118). С. 2.
[36]За ленінскія кадры. 1940. 29 снеж. № 21 (115). С. 2.
[37]Там жа. 1941. 4 сак. № 3 (118). С. 2.
[38]Там жа.
[39]За ленінскія кадры. 1940. 29 снеж. № 21 (115). С. 2.
[40]Там жа. 1941. 4 сак. № 3 (118). С. 2.
[41]Там жа. 1940. 29 снеж. № 21 (115). С. 2; За ленінскія кадры. 1941. 4 сак. № 3 (118). С. 2.
[42]Там жа.
[43]Там жа. 1940. 29 снеж. № 21 (115). С. 2.
[44]Там жа. 1940. 29 снеж. № 21 (115). С. 2; 1941. 4 сак. № 3 (118). С. 2; 21 мая. № 9–10 (124–125). С. 3.
[45]Там жа. 1941. 4 чэрв. № 11 (126). С. 2.

Музей, як небеспадстаўна заўважаў яго загадчык, з'яўляўся «добрым вучэбным падспор'ем у студэнцкіх занятках. <...> Акрамя вучэбных экскурсій па курсах гісторыі старажытнага свету, асноў археалогіі і гісторыі грэчаскіх калоній, тут можна атрымаць матэрыял для курсавых тэм»[46].

Шмат увагі ўдзялялася і асветніцкаму напрамку працы музея (мал. 7). У. І. Шаўчэнка, лабаранты музея і студэнты-актывісты рэгулярна праводзілі экскурсіі для розных катэгорый наведвальнікаў: студэнтаў БДУ, школьнікаў, слухачоў настаўніцкіх курсаў, супрацоўнікаў Віленскага і Каўнаскага ўніверсітэтаў і інш. Для ўсіх зацікаўленых арганізоўваліся дэманстрацыі дыяпазітываў «Першабытнае мастацтва», «Старажытны Егіпет», «Грэцыя», «Рым», «Іліяда і Адысея», «Міф пра Хрыста». Некалькі разоў праводзіўся паказ гукавога фільма «Херсанес Таўрычаскі». Усе прагляды суправаджаліся каментарыямі загадчыка музея[47].



*Мал. 7.* У. І. Шаўчэнка праводзіць экскурсію ў Гістарычна-археалагічным музеі БДУ.
К р ы н і ц а: За ленінскія кадры. 1940 24 кастр. № 17 (111). С. 1
*Fig. 7.* U. I. Shawchenka is conducting an excursion in the Museum of History and Archaeology of the BSU.
S o u r c e: Za leninskija kadry. 1940. 24 October. No. 17 (111). P. 1

Тым часам у канцы зімовага семестра 1940/41 навучальнага года кіраўніцтва кафедры старажытнага свету[48] зноў узняло кадравае пытанне. На пасяджэнні кафедры адзначылі, што У. І. Шаўчэнка «не может обеспечить ведение данного курса [«Основы археологии»] на высоком университетском уровне», і прызналі неабходнасць запрасіць на будучы навучальны год аднаго з «археолагаў-практыкаў»: К. М. Палікарповіча ці В. Р. Тарасенку[49]. Аднак усе планы засталіся на паперы: пачалася Вялікая Айчынная вайна.

Актыўным удзельнікам Мінскага падполля стаў М. С. Мохнач. У 1944 г. ён быў закатаваны ў Трасцянцы [13, с. 137–138, 267–268]. У. І. Шаўчэнка ў 1943–1944 гг. загадваў кафедрай гісторыі старажытнага свету і выконваў абавязкі дэкана гістарычнага факультэта БДУ на станцыі Сходня пад Масквой. Пасля вызвалення Беларусі ён не захацеў вяртацца ў Мінск, а пазней і ўвогуле перайшоў на літаратурную працу [2; 4, с. 34–37]. Р. А. Посэ падчас вайны знаходзілася ў эвакуацыі. У 1945 г. яна вярнулася ў беларускую сталіцу і ўладкавалася ў Інстытут гісторыі АН БССР. Абараніўшы дысертацыю па афінскай дэмакратыі, Р. А. Посэ (ужо Нікольская) працягнула навукова-педагагічную дзейнасць ва ўніверсітэце. Амаль два дзесяцігоддзі – у 1949–1968 гг. – яна чытала агульныя курсы па гісторыі першабытнага грамадства і гісторыі Старажытнага Усходу [13, с. 199–287; 4, с. 51]. Гістарычна-археалагічны музей БДУ падчас акупацыі быў амаль цалкам знішчаны: ацалелі толькі асобныя копіі старажытнаегіпецкіх прадметаў, адзінкавыя археалагічныя знаходкі і частка нумізматычнай калекцыі [5, с. 52]. Паўторнае адкрыццё музея адбылося ў 1959 г. [3, с. 25].

[46]За ленінскія кадры. 1940. 29 снеж. № 21 (115). С. 2.
[47]НАРБ. Ф. 205. Воп. 1. Спр. 737. Арк. 90–93.
[48]У 1939 г. кафедра гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў, на якой У. І. Шаўчэнка пачынаў сваю акадэмічную кар'еру, была падзелена на кафедру гісторыі старажытнага свету і кафедру гісторыі сярэдніх вякоў [9, с. 32].
[49]НАРБ. Ф. 205. Воп. 1. Спр. 737. Арк. 92.

## Высновы

Напрыканцы агляду гісторыі станаўлення археалагічнай адукацыі на гістарычным факультэце БДУ варта адзначыць, што асаблівасці развіцця беларускай універсітэцкай археалогіі цалкам адпавядалі агульнасавецкім тэндэнцыям 1934–1941 гг.[50] [14, с. 283–285; 15, с. 580; 16, с. 228–229].

У згаданы час былі згорнуты метадалагічныя пошукі, што мелі месца ў 1920-х гг., і археалогія была канчаткова ўключана ў сістэму гістарычных дысцыплін. Змяніліся і вучэбныя планы: «Гісторыя дакласавага грамадства» і «Асновы археалогіі» сталі абавязковым складнікам вышэйшай гістарычнай адукацыі. У БДУ выкладанне археалогіі ў якасці самастойнай вучэбнай дысцыпліны, а не ў выглядзе раздзела агульнай гісторыі, пачалося пазней, чым у Ленінградскім і Маскоўскім універсітэтах, аднак раней, чым у многіх навучальных установах тагачасных саюзных рэспублік. На жаль, стан крыніц не дазваляе аднавіць змест дысцыплін археалагічнага профілю, што вывучаліся беларускімі студэнтамі ў перадваенныя гады.

Вучэбныя планы БДУ не прадугледжвалі спецыялізацыі ў галіне археалогіі. Археалагічныя дысцыпліны чыталіся будучым спецыялістам-гісторыкам; выкладанне згаданых прадметаў і правядзенне археалагічнай практыкі ажыццяўлялася супрацоўнікамі гістарычных кафедр. Аналагічная сітуацыя была характэрнай для пераважнай большасці гістарычных факультэтаў СССР: у даваенны час структурныя падраздзяленні археалагічнага профілю існавалі толькі ў Ленінградскім і Маскоўскім універсітэтах.

Вышэйшая школа Беларусі, як і іншых савецкіх рэспублік, адчула на сабе негатыўнае ўздзеянне рэпрэсій 1930-х гг. Для айчыннай універсітэцкай археалогіі, якая толькі пачынала сваё станаўленне, наступствы вынішчэння навуковай эліты былі асабліва трагічнымі. Калі ў сярэдзіне дзесяцігоддзя яшчэ мела месца пэўнае перайманне традыцый у вывучэнні і выкладанні археалагічных дысцыплін, звязанае з дзейнасцю прафесійнага археолага А. М. Ляўданскага, то пасля сумна вядомых падзей 1937 г. наладжванне вучэбнага працэсу істотна ўскладнілася адсутнасцю ва ўніверсітэцкім штаце кваліфікаваных спецыялістаў. Новыя выкладчыкі не мелі адпаведнай падрыхтоўкі і пачыналі фактычна з чыстага аркуша. Аднак і іх здабыткі і дасягненні ў хуткім часе былі знішчаны.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Гужалоўскі АА. *Музеі Беларусі (1918–1941 гг.).* Мінск: Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь; 2002. 164 с.

2. Ходин СН. В. И. Шевченко – декан исторического факультета БГУ в эвакуации (1943–1944 гг.). В: Сальков АП, Янковский ОА, Меньковский ВИ и др., редакторы. *Российские и славянские исследования. Выпуск 4.* Минск: БГУ; 2009. с. 187–190.

3. Прохоров АА, Яновский ОА, Назаренко АМ, составители. *Исторический факультет БГУ. 80 лет.* Минск: БГУ; 2014. 154 с.

4. Евтухов ИО. *Кафедра истории древнего мира и средних веков БГУ. К 80-летию создания.* Минск: БГУ; 2015. 222 с.

5. Сідаровіч В. «Паўсталая з попелу?» (Лёс даваеннай нумізматычнай калекцыі музея БДУ). *Банкаўскі веснік.* 2016;3:51–57.

6. Малюгин ОИ. Николай Михайлович Никольский. Организатор исторической науки в Беларуси. В: Абламейко СВ и др., редакторы. *Интеллектуальная элита Беларуси. Основоположники белорусской науки и высшего образования (1919–1941 гг.).* Минск: БГУ; 2017. с. 98–107.

7. Зуева АУ, Курловіч-Бяляўская ПС. А. М. Ляўданскі і Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. У: Ляўко ВМ, Кошман ВІ, складальнікі. *Матэрыялы па археалогіі Беларусі. Выпуск 26. Вынікі даследаванняў першабытных і сярэдневяковых помнікаў на тэрыторыі Беларусі (да 120-годдзя з дня нараджэння А. М. Ляўданскага).* Мінск: Інстытут гісторыі НАН Беларусі; 2015. с. 15–19.

8. Ходзін СМ, Шумейка МФ, Яноўскі АА, складальнікі. *Памяць і слава: Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. 1921–1941.* Мінск: БДУ; 2006. 383 с.

9. Прохоров АА, Малюгин ОИ. К 80-летию создания кафедры истории древнего мира и средних веков БГУ. *Веснік БДУ. Серыя. 3, Гісторыя. Эканоміка. Права.* 2016;2:31–36.

10. Мядзведзева ВУ. Гісторыя і гістарыяграфія навуковай дзейнасці А. М. Ляўданскага. У: Ляўко ВМ, Кошман ВІ, складальнікі. *Матэрыялы па археалогіі Беларусі. Выпуск 26. Вынікі даследаванняў першабытных і сярэдневяковых помнікаў на тэрыторыі Беларусі (да 120-годдзя з дня нараджэння А. М. Ляўданскага).* Мінск: Інстытут гісторыі НАН Беларусі; 2015. с. 5–14.

11 Загорульский ЭМ. *Археология Белоруссии.* Минск: Высшая школа; 1965. 221 с.

12. Вайтовіч АУ, Курловіч-Бяляўская ПС. «Если бы на мою долю выпала честь преподавать первобытную культуру и археологию в Белгосуниверситете…», або Універсітэцкая археалогія ў 1921–1931 гг. В: Федосик ВА, Агичич Д, Баева И и др., редакторы. *Российские и славянские исследования. Выпуск 10.* Минск: БГУ; 2015. с. 240–248.

13. Никольская РА. *Воспоминания.* Харьков: Права людини; 2013. 304 с.

[50] *Янин В. Л., Пряхин А. Д.* Археология на исторических факультетах классических университетов Российской Федерации. История, современность, перспективы // Commentarii de historia. 2000 [Электронный ресурс]. URL: http://www.hist.vsu.ru/cdh/Articles/04-06.htm (дата обращения: 01.08.2015); *Янин В. Л., Канторович А. Р.* К 75-летию кафедры археологии исторического факультета МГУ // Исторические исследования. 2015. Вып. 3. С. 10–14 [Электронный ресурс]. URL: http://www.historystudies.msu.ru/ojs2/index.php/ISIS/article/view/44 (дата обращения: 01.03.2017).

14. Носов ЕН, Тихонов ИЛ. Кафедра археологии. В: Дворниченко АЮ, редактор. *Исторический факультет Санкт-Петербургского университета. 1934–2004.* Санкт-Петербург: Издательство Санкт-Петербургского университета; 2004. с. 278–316.
15. Шер ЯА. Возродится ли в России археологическое образование? В: Вишняцкий ЛБ, Белецкий СВ, Бочкарев ВС и др., редакторы. *Российский археологический ежегодник. Выпуск 1.* Санкт-Петербург: Санкт-Петербургский университет; 2011. с. 574–588. Совместное издание с ИИМК РАН, Государственный Эрмитаж.
16. Самойленко ЛГ. Создание кафедры археологии и музееведения в Киевском университете. *Археологія і давня історія України.* 2012;9:228–234.

## References

1. Guzhalowski AA. *Muzei Belarusi (1918–1941)* [Museums of Belarus (1918–1941)]. Minsk: National Archives of the Republic of Belarus; 2002. 164 p. Belarusian.
2. Khodzin SM. [The Dean of Belarusian State University history board V. I. Shevchenko in the evacuation in 1943–1944]. In: Sal'kov AP, Yankovskii OA, Men'kovskii VI, et al., editors. *Rossiiskie i slavyanskie issledovaniya. Vypusk 4* [Russian and Slavic research. Issue 4]. Minsk: Belarusian State University; 2009. p. 187–190. Russian.
3. Prokhorov AA, Yanovskii OA, Nazarenko AM, compilers. *Istoricheskii fakul'tet BGU. 80 let* [The faculty of history. 80 years]. Minsk: Belarusian State University; 2014. 154 p. English and Russian.
4. Evtukhov IO. *Kafedra istorii drevnego mira i srednikh vekov BGU. K 80-letiyu sozdaniya* [The Ancient and Medieval History department. By the 80th anniversary of the foundation]. Minsk: Belarusian State University; 2015. 222 p. Russian.
5. Sidarovich V. [«Arisen from the ashes?» (The story of the pre-war numismatic collection of the Belarusian State University Museum)]. *Bankawski vesnik.* 2016;3:51–57. Belarusian.
6. Maliugin OI. [Nikolay M. Nikolsky. The organizer of the historical science in Belarus]. In: Ablameiko SV, et al., editors. *Intellektual'naya elita Belarusi. Osnovopolozhniki belorusskoi nauki i vysshego obrazovaniya (1919–1941 gg.)* [Intellectual elite of Belarus. The founders of Belarusian science and higher education (1919–1941)]. Minsk: Belarusian State University; 2017. p. 98–107. Russian.
7. Zueva AU, Kurlovich-Bjaljawskaja PS. [A. M. Liaudansky and Belarusian State University]. In: Ljawko VM, Koshman VI, compilers. *Matjeryjaly pa arhealogii Belarusi. Vypusk 26. Vyniki dasledavannjaw pershabytnyh i sjarjednevjakovyh pomnikaw na tjerytoryi Belarusi (da 120-goddzja z dnja naradzhjennja A. M. Ljawdanskaga)* [Materials on the archaeology of Belarus. Issue 26. The results of investigations of the prehistoric and medieval sites on the territory of Belarus (to the 120th anniversary of the birth of A. M. Liaudansky)]. Minsk: Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus; 2015. p. 15–19. Belarusian.
8. Khodin SN, Shumejka MF, Yanowski AA, compilers. *Pamjac' i slava: Belaruski dzjarzhawny universitjet* [Memory and glory: Belarusian State University. 1921–1941]. Minsk: Belarusian State University; 2006. 383 p. Russian and Belarusian.
9. Prokhorov AA, Maliugin OI. To the 80th anniversary of the department of ancient and medieval history of BSU. *Vesnik BDU. Series 3, Gistoryja. Jekanomika. Prava.* 2016;2:31–36. Russian.
10. Mjadvedzeva VU. [History and historiography of the scientific activity of A. M. Lyavdansky]. In: Ljawko VM, Koshman VI, compilers. *Matjeryjaly pa arhealogii Belarusi. Vypusk 26: Vyniki dasledavannjaw pershabytnyh i sjarjednevjakovyh pomnikaw na tjerytoryi Belarusi (da 120-goddzja z dnja naradzhjennja A. M. Ljawdanskaga)* [Materials on the archaeology of Belarus. Issue 26: The results of investigations of the prehistoric and medieval sites on the territory of Belarus (to the 120th anniversary of the birth of A. M. Liaudansky)]. Minsk: Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus; 2015. p. 5–14. Belarusian.
11. Zagorulskii EM. *Arkheologiya Belorussii* [Archaeology of Belarus]. Minsk: Vysshaya shkola; 1965. 221 p. Russian.
12. Vaitovich AU, Kurlovich-Bjaljawskaja PS. [«If I were honored of teaching the Prehistoric culture and Archaeology at the Belarusian State University…» or University archaeology in the 1921–1931]. In: Fedosik VA, Agichich D, Baeva I, et al., editors. *Rossiiskie i slavyanskie issledovaniya. Vypusk 10* [Russian and Slavic Studies. Issue 10]. Minsk: Belarusian State University; 2015. p. 240–248. Belarusian.
13. Nikol'skaya RA. *Vospominaniya* [Memoirs]. Charkiv: Prava ludyny; 2013. 304 p. Russian.
14. Nosov EN, Tikhonov IL. [The Department of Archaeology]. In: Dvornichenko AYu, editor. *Istoricheskii fakul'tet Sankt-Peterburgskogo universiteta. 1934–2004* [The Faculty of History of the Saint Petersburg State University. 1934–2004]. Saint Petersburg: Publishing House of the Saint Petersburg State University; 2004. p. 278–316. Russian.
15. Sher YaA. [Archaeological education in Russia: will it revive?]. In: Vishnyatskii LB, Beletskii SV, Bochkarev VS, et al., editors. *Russian Archaeological Yearbook. Issue 1.* Saint Petersburg: Saint Petersburg State University; 2011. p. 574–588. Co-published by the Institut istorii Material'noi kultury Rossiiskoi Akademii Nauk, Hermitage Museum.
16. Samoilenko LG. [Development of the Department of Archaeology and Museum Studies at Kiev University]. *Archeologija i davnja istorija Ukrai'ny*. 2012;9:228–234. Russian.

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 04.04.2018.*
*Received by editorial board 04.04.2018.*

# История беларуси

# Гісторыя беларусі

# Belarusian history

УДК [94(476):34]«1772/1796»

## ТРАНСФОРМАЦИЯ СУДЕБНОЙ СИСТЕМЫ НА ТЕРРИТОРИИ БЕЛАРУСИ (1772–1796)

***И. Г. ГУЩИНСКИЙ*** [1)]

[1)]*Белорусский государственный педагогический университет им. Максима Танка, ул. Советская, 18, 220030, г. Минск, Беларусь*

Детально и комплексно раскрываются изменения в судебной системе на территории Беларуси после ее включения в состав Российской империи (в результате трех разделов Речи Посполитой 1772, 1793, 1795 гг.). В период правления Екатерины II местная судебная система подверглась значительным преобразованиям, направленным на ее упорядочение, усиление государственного контроля над ней, а также внедрение модели судоустройства по российскому образцу. Важнейшее значение в данном контексте имело введение документа «Учреждения для управления губерний Всероссийския империи». При этом в сфере гражданского судопроизводства сохранялось действие местных норм права (Статута ВКЛ 1588 г. и сеймовых конституций Речи Посполитой) и использование польского языка. Это позволяло адаптировать новые порядки в сфере суда под специфику данной территории и, естественно, способствовало их внедрению. С другой стороны, это было в определенном смысле приметой признания и закрепления за краем особого политико-правового статуса. После смены на российском престоле Екатерины II ее сыном Павлом I в общих чертах была восстановлена структура судебных органов периода ВКЛ и Речи Посполитой.

***Ключевые слова:*** разделы Речи Посполитой; Российская империя; белорусские губернии; судебная система; Статут ВКЛ; Екатерина II; губернская реформа 1775 г.

***Благодарность.*** Автор выражает благодарность доктору исторических наук профессору кафедры истории Беларуси и славянских народов Белорусского государственного педагогического университета имени Максима Танка Анатолию Павловичу Житко за помощь в подготовке статьи.

**Образец цитирования:**
Гушчынскі ІГ. Трансфармацыя судовай сістэмы на тэрыторыі Беларусі (1772–1796). *Часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Гісторыя.* 2019;1:34–45.

**For citation:**
Hushchynski IH. Transformation of the judicial system in the territory of Belarus (1772–1796). *Journal of the Belarusian State University. History.* 2019;1:34–45. Belarusian.

**Автор:**
***Игорь Геннадьевич Гущинский*** – кандидат исторических наук, доцент; заместитель декана по учебной работе факультета дошкольного образования.

**Author:**
***Ihar H. Hushchynski***, PhD (history), docent; deputy dean for educational work at the pre-school faculty.
*hushchynski@gmail.com*

# ТРАНСФАРМАЦЫЯ СУДОВАЙ СІСТЭМЫ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ (1772–1796)

*І. Г. ГУШЧЫНСКІ*[1*]

[1*]*Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка, вул. Савецкая, 18, 220030, г. Мінск, Беларусь*

Дэталёва і комплексна раскрываюцца змены ў судовай сістэме на тэрыторыі Беларусі пасля яе ўключэння ў склад Расійскай імперыі (у выніку трох падзелаў Рэчы Паспалітай 1772, 1793, 1795 гг.). У перыяд праўлення Кацярыны II мясцовая судовая сістэма падверглася значным пераўтварэнням, накіраваным на яе ўпарадкаванне, узмацненне дзяржаўнага кантролю над ёй, а таксама ўкараненне мадэлі судаўладкавання па расійскім ўзоры. Важнейшае значэнне ў дадзеным кантэксце мела ўвядзенне дакумента «Учреждения для управления губерний Всероссийския империи». Пры гэтым у сферы грамадзянскага судаводства захоўвалася дзеянне мясцовых норм права (Статута ВКЛ 1588 г. і сеймавых канстытуцый Рэчы Паспалітай) і выкарыстанне польскай мовы. Гэта дазваляла адаптаваць новыя парадкі ў сферы суда да спецыфікі дадзенай тэрыторыі і, натуральна, спрыяла іх укараненню. З іншага боку, гэта было ў пэўным сэнсе прыкметай прызнання і замацавання за краем асобага палітыка-прававога статусу. Пасля замены на расійскім прастоле Кацярыны II яе сынам Паўлам I у агульных рысах была адноўлена структура судовых органаў перыяду ВКЛ і Рэчы Паспалітай.

***Ключавыя словы:*** падзелы Рэчы Паспалітай; Расійская імперыя; беларускія губерні; судовая сістэма; Статут ВКЛ; Кацярына II; губернская рэформа 1775 г.

***Падзяка.*** Аўтар выказвае ўдзячнасць доктару гістарычных навук прафесару кафедры гісторыі Беларусі і славянскіх народаў Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка Анатолю Паўлавічу Жытко за дапамогу ў падрыхтоўцы артыкула.

# TRANSFORMATION OF THE JUDICIAL SYSTEM IN THE TERRITORY OF BELARUS (1772–1796)

*I. H. HUSHCHYNSKI*[a]

[a]*Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank, 18 Savieckaja Street, Minsk 220030, Belarus*

Changes in the judicial system on the territory of Belarus after incorporation into the Russian Empire (as a result of the three partitions of the Polish-Lithuanian Commonwealth 1772, 1793, 1795) are described in detail and comprehensively in this article. During the reign of Catherine II, the local judicial system had become the object of the governments activities aimed at streamlining it, strengthening state control over it, introducing a model of the judiciary based on the Russian model. In this context the introduction of the provincial reform of 1775 by Catherine II was especially important. At the same time, in the sphere of civil proceedings Polish language and local legal norms (the Statute of the Grand Duchy of Lithuania of 1588 and the resolutions of the Polish-Lithuanian Commonwealths Sejm) were remained. This contributed to adaptation of new courts to specificity of this territory. On the other hand, it was a sign of recognition and securing a special political and legal status for the western borderland of the empire. After the change on the Russian throne of Catherine II by her son Paul I, the structure of the judicial authorities of the Grand Duchy of Lithuania and the Polish-Lithuanian Commonwealth was restored.

***Key words:*** partitions of the Polish-Lithuanian Commonwealth; the Russian Empire; Belarusian provinces; the judicial system; the Lithuanian Statute; Catherine II; the provincial reform of 1775.

***Acknowledgments.*** The author is grateful to Anatoly Pavlovich Zhitko, doctor of science, professor at the department of history of Belarus and Slavic peoples of the Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank for assistance in preparing the article.

## Уводзіны

У выніку трох падзелаў Рэчы Паспалітай тэрыторыя Беларусі была ўключана ў склад Расійскай імперыі. Такім чынам, край стаў часткай краіны з прынцыпова іншым дзяржаўна-палітычным ладам – абсалютнай манархіяй, якая сутнасна арыентавана на ўніфікацыю структуры органаў улады і пазбяганне праяў аўтаноміі ўскраін. Таму з самага пачатку палітыка расійскіх улад была накіравана на інтэграцыю далучаных зямель у складзе імперыі. Пры гэтым маштаб сацыяльнай, канфесійнай, культурнай, прававой і іншай спецыфікі краю вымушаў расійскія ўлады дзейнічаць дастаткова гнутка, пазбягаць рэзкіх і радыкальных крокаў, якія маглі б справакаваць рост апазіцыйных настрояў у асяродку мясцовага насельніцтва, перш за ўсё – шляхты. Сутнасць і супярэчнасці такой палітыкі выраз-

на выявіліся на прыкладзе захадаў па ўніфікацыі судовай сістэмы далучаных зямель і Расійскай імперыі. З аднаго боку, укараняліся расійскія нормы права ў сферы крымінальнага судаводства, а таксама ўводзілася агульнарасійская сістэма судаўладкавання. Разам з тым у грамадзянскім судаводстве былі захаваны польская мова і мясцовыя прававыя нормы, аснову якіх складаў Трэці Статут ВКЛ. А пры Паўле I тут увогуле была аднаўлена і сама структура судовых устаноў часоў ВКЛ.

Розныя аспекты трансфармацыі судовай сістэмы на тэрыторыі Беларусі пасля далучэння яе да Расіі разглядаліся ў працах У. Л. Лехтанена [1, с. 278–295], М. Ф. Дэ-Пуле [2], У. А. Грыгор'ева [3, с. 324], П. М. Жуковіча [4–8], Л. Жытковіча [9], В. В. Шведа [10, с. 117–120, 134], Я. К. Анішчанкі [11, с. 71, 87, 116, 184], С. Л. Лугаўцовай [12], С. Годэка [13], Н. М. Яфрэмавай [14], А. П. Жытко, С. А. Талмачовай, І. Г. Гушчынскага [15] і інш. Пры гэтым у гістарыяграфіі многія аспекты дадзенай праблемы застаюцца слаба асветленымі альбо наогул нявывучанымі. Шэраг трактовак і сцвярджэнняў падаецца рознымі аўтарамі супярэчліва. Адпаведна, мэтай артыкула з'яўляецца дэтальнае і комплекснае раскрыццё змен у судовай сістэме на тэрыторыі Беларусі, якія адбыліся ў выніку ўключэння краю ў склад Расійскай імперыі. Гэта будзе садзейнічаць больш глыбокаму асэнсаванню палітыкі самадзяржаўя ў Беларусі, прынамсі падчас праўлення Кацярыны II, а таксама ўсебаковаму вывучэнню гісторыі Беларусі ў разглядаемы перыяд.

## Метадалогія даследавання

Прадстаўленае ў артыкуле даследаванне базіруецца на асноўных тэарэтыка-метадалагічных прынцыпах: гістарызму, аб'ектыўнасці, сістэмнага аналізу і каштоўнаснага падыходу. Непасрэдным інструментарыем дасягнення даследчай мэты сталі як агульнанавуковыя (аналіз і сінтэз, індукцыя і дэдукцыя, статыстычны аналіз і г. д.), так і канкрэтна-гістарычныя метады (гісторыка-генетычны, гісторыка-параўнальны, гісторыка-тыпалагічны). Гэта дазволіла паслядоўна і дэтальна асвяціць змены ў судовай сістэме на тэрыторыі Беларусі з 1772 па 1796 г., выявіць матывы і змест палітыкі расійскіх улад у сферы правасуддзя ў краі ў канкрэтных гістарычных умовах. Крыніцазнаўчую базу даследавання склалі заканадаўчыя акты Расійскай імперыі, факталагічная інфармацыя з прац П. М. Жуковіча [4–8], Л. Жытковіча [9], а таксама матэрыялы справаводства судовых органаў з фондаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі.

## Вынікі і абмеркаванне

Усходнебеларускія землі былі ўключаны ў склад Расіі ў 1772 г. у выніку першага падзелу Рэчы Паспалітай. Фармальна ён быў аформлены 22 верасня 1772 г. Аднак адпаведныя дамоўленасці паміж Расіяй, Прусіяй і Аўстрыяй былі дасягнуты яшчэ ў пачатку 1772 г. [16, с. 482] Натуральна, ужо тады перад расійскімі ўладамі паўстала пытанне аб мерапрыемствах па арганізацыі на далучанай тэрыторыі сваёй улады. Гэта датычыла і сферы права і суда.

На пасяджэнні Дзяржаўнага савета 19 красавіка 1772 г. у прысутнасці Кацярыны II слухаўся даклад генерал-пракурора Сената Аляксандра Вяземскага. У ім гаварылася аб першых мерапрыемствах па ўладкаванні далучаных тэрыторый. Тут планавалася стварыць дзве губерні – Магілёўскую і Пскоўскую. У далейшым у афіцыйным справаводстве яны таксама называліся агульным тэрмінам «беларускія губерні», хаця ў склад Пскоўскай, натуральна, уваходзілі і ўласна рускія губерні. Сярод іншага, у дакладзе А. Вяземскага прапаноўвалася ўкараненне тут рускага заканадаўства. Аднак, выслухаўшы яго, Кацярына II прыняла рашэнне ўзяць на сябе складанне інструкцый мясцовым губернатарам[1]. Наказ Пскоўскаму і Магілёўскаму губернатарам (Міхаілу Крачэтнікаву і Міхаілу Кахоўскаму адпаведна) быў падпісаны імператрыцай 28 мая 1772 г. У ім абвяшчалася, што правасуддзе тут будзе ажыццяўляцца паводле мясцовых норм і правіл (гэта значыць Трэцяга Статута ВКЛ, пастаноў сейма Рэчы Паспалітай, судовай практыкі) і «их языком» (відавочна, мелася на ўвазе польская мова). Аднак тут жа ўдакладнялася, што гэта не датычыць злачынстваў аб парушэнні цішыні і спакою грамадзян, а таксама спраў, якія «дотрагиваются до власти нашей»[2]. Фактычна гэта азначала, што крымінальныя справы, а таксама некаторыя грамадзянскія, у якіх улады бачылі закрананне інтарэсаў дзяржавы (напрыклад, аб казённай маёмасці), планавалася перадаць з юрысдыкцыі мясцовых судоў да створаных расійскімі ўладамі ўстаноў. Тым не менш на дадзеным этапе папярэднія судовыя ўстановы (гродскія, земскія, падкаморскія суды, а таксама гарадскія суды – магістраты і ратушы) былі захаваны. Па словах П. М. Жуковіча, гэта было, па сутнасці, першым вопытам аддзялення функцый суда ад адміністрацыйнай улады ў Расійскай імперыі [4, с. 303]. З гэтым можна пагадзіцца, бо на той мо-

[1]Архив Государственного совета. Т. 1, ч. 2. СПб. : Тип. Второго отд. Собств. Е. И. В. Канцелярии, 1869. С. 205–206.
[2]Полное собрание законов Российской империи (далей – ПСЗРИ). Собр. 1. Т. 19. 1770–1774. № 13808.

мант (да правядзення Кацярынай II рэформы мясцовага кіравання 1775 г.) у Расіі суд быў ніяк не аддзелены ад адміністрацыйнай улады [4, с. 293].

Увогуле ні пры першым, ні пры наступных падзелах Рэчы Паспалітай у планы Кацярыны II не ўваходзіла даваць правы аўтаноміі далучаным тэрыторыям. Захаванне ж мясцовых судовых органаў і сістэмы права, прычым частковае, мела сітуацыйны характар і вынікала з матываў палітычнай мэтазгоднасці і практычнай зручнасці для эфектыўнага кіравання краем. Расійскім уладам на той момант бачылася мэтазгодным захаванне ў цэлым зладжанай і звыклай для насельніцтва мадэлі прыватнаправавых стасункаў. Таму ў сферы грамадзянскага судаводства працягвалі дзейнічаць нормы мясцовага права. Разам з тым перадача крымінальных спраў на разгляд расійскім адміністрацыйным уладам павінна была садзейнічаць падтрыманню парадку і спакою ў краі.

Дадзеная логіка неўзабаве знайшла адлюстраванне ў наступных дзеяннях расійскага ўрада. Спачатку, паводле ўказа Кацярыны II ад 16 жніўня 1772 г., на далучанай тэрыторыі правасуддзе павінна было часова ажыццяўляцца папярэднімі судовымі ўстановамі па мясцовых законах, але ад імя рускай імператрыцы[3]. Удакладненне, відавочна, сведчыла аб часовым характары дадзенага распараджэння. І ўжо ў верасні – кастрычніку ў Пскоўскай і Магілёўскай губернях, якія былі падзелены на правінцыі, па расійскім узоры былі створаны губернскія і правінцыйныя канцыляры[4]. Гэта былі мясцовыя органы ўлады, якія сумяшчалі ў сабе функцыі адміністрацыйнага кіравання і суда. У іх кампетэнцыю перадаваліся функцыі правасуддзя па крымінальных справах, што азначала паглынанне імі юрысдыкцыі гродскіх судоў[5] (у Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі захоўваюцца дакументы Аршанскага, Полацкага, Рэчыцкага і Мсціслаўскага гродскіх судоў[6] аж да 1795 г., аднак гэта звязана з тым, што дадзеныя ўстановы пасля 1772 г. працягвалі дзейнічаць на тэрыторыі Рэчы Паспалітай да другога яе падзелу). У той жа час для разгляду грамадзянскіх спраў пакідаліся ў дзеянні земскія і падкаморскія суды, а таксама магістраты ў гарадах [4, с. 304, 310]. Пры гэтым магістраты працягвалі разглядаць не толькі грамадзянскія, але і крымінальныя справы па мясцовых, а не расійскіх праваых нормах [4, с. 312]. Можна меркаваць, што гэта стала праявай абяцання Кацярыны II пакінуць за гарадамі былыя правы і прывілеі[7]. Аднак рашэнні магістратаў па крымінальных справах не з'яўляліся канчатковымі, а павінны былі перадавацца губернатару для прагляду і зацвярджэння [4, с. 312].

Паводле ўказа Кацярыны II ад 13 снежня 1772 г. у далучаных правінцыях уводзіліся пасады пракурораў, што таксама некалькі набліжала мясцовую судова-адміністрацыйную сістэму да ўнутрырасійскіх губерняў[8]. Яны былі прызначаны Сенатам у пачатку 1773 г. і неўзабаве прыступілі да выканання сваіх абавязкаў[9].

Наступным крокам па ўніфікацыі агульнарасійскай судовай сістэмы і судовай сістэмы беларускіх губерняў было ўвядзенне губернскіх і правінцыйных земскіх судоў (паводле даклада Сената, зацверджанага Кацярынай II 8 мая 1773 г.). Да іх пераходзілі функцыі правасуддзя па грамадзянскіх справах, якія да гэтага выконвалі земскія і падкаморскія суды. Губернскія і правінцыйныя земскія суды дзейнічалі на падставе мясцовага права і выкарыстоўвалі ў судаводстве польскую мову. Правінцыйныя земскія суды былі судом першай інстанцыі, а губернскія – апеляцыйнай. У сваю чаргу, апеляцыю на рашэнне губернскага земскага суда можна было падаць у Юстыц-калегію ліфляндскіх, эстляндскіх і фінляндскіх спраў[10]. Прычым там справы павінны былі разглядацца на падставе тых законаў, што і ў ніжэйшай інстанцыі, гэта значыць грамадзянскія справы з беларускіх губерняў разглядаліся галоўным чынам паводле Трэцяга Статута ВКЛ. Праз паўтара года пры Юстыц-калегіі ліфляндскіх, эстляндскіх і фінляндскіх спраў быў створаны спецыяльны дэпартамент для спраў з беларускіх губерняў[11].

Склад правінцыйных і губернскіх земскіх судоў быў цалкам выбарным (тэрмінам на чатыры гады). Гэта датычыла і старшынь судоў (прэзусаў). Дваранства кожнай правінцыі выбірала склад свайго правінцыйнага земскага суда (першага прэзуса і трох членаў), а таксама аднаго члена ў губернскі земскі суд. Выбары галоўнага суддзі губернскага земскага суда павінны былі праводзіцца асобна з удзелам дваран усіх правінцый губерні. Пры гэтым для выбараў у суды ўводзіўся маёмасны цэнз, чаго да гэтага не было. Выбарцы павінны былі мець не менш за 10 душ мужчынскага полу, а прэтэндэнты на пасады – 20 душ. Гэта мела важнае значэнне, бо пазбаўляла значную колькасць дробнай шлях-

[3]ПСЗРИ. Собр. 1. Т. 19. 1770–1774. № 13850.
[4]Там же. № 13866, 13879.
[5]Там же. № 13977.
[6]НГАБ. Ф. 1731, 1734, 1736, 1729.
[7]ПСЗРИ. Собр. 1. Т. 19. 1770–1774. № 13808.
[8]Там же. № 13920.
[9]НГАБ. Ф. 3225. Воп. 1. Спр. 2.
[10]ПСЗРИ. Собр. 1. Т. 19. 1770–1774. № 13977.
[11]НГАБ. Ф. 3310. Воп. 2. Спр. 9. Арк. 266.

ты права ўдзелу ў выбарах. Яшчэ адным важным новаўвядзеннем стала змена крыніцы аплаты працы суддзяў: цяпер яна ажыццяўлялася не за кошт пошлін з зацікаўленых бакоў, як гэта было ў часы Рэчы Паспалітай, а з казны. Памер жалавання залежаў ад пасады і адпаведнага ёй чыну па «Табелі аб рангах»[12].

Даклад беларускага генерал-губернатара Захара Чарнышова быў зацверджаны Кацярынай II 22 ліпеня 1773 г. У ім прадугледжвалася раздзяленне правінцый на паветы і ўвядзенне пасады павятовых камісараў (па два на правінцыю). Сярод абавязкаў камісараў, якія знаходзіліся ў падпарадкаванні правінцыйных канцылярый, было вырашэнне цяжбаў паміж сялянамі, калі сума іску не перавышала 25 руб. Пры гэтым спрэчкі пазямельнага характару ім былі непадсудныя[13].

Тым часам расійскім урадам вялася праца па падрыхтоўцы карэннай рэформы сістэмы мясцовага кіравання і суда ў імперыі. Яна знайшла ўвасабленне ў дакуменце пад назвай «Учреждения для управления губерний Всероссийския империи»[14] (далей – «Учреждения...»), падпісаным Кацярынай II 7 лістапада 1775 г. Ужо праз месяц, 6 снежня 1775 г., беларускім генерал-губернатарам З. Чарнышовым на імя імператрыцы быў пададзены дэталёвы даклад аб увядзенні «Учреждений...» у беларускіх губернях [5, с. 89]. У ім ужо былі вызначаны мяркуемыя штаты і выдаткі на ўтрыманне новых устаноў [5, с. 90, 99]. Аднак іх адкрыццё магло адбыцца толькі пасля неабходных падрыхтоўчых мерапрыемстваў – правядзення адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу, падбору ці пабудовы памяшканняў для ўстаноў, вызначэння крыніц фінансавання і інш. Даволі значны час пайшоў на правядзенне новага тэрытарыяльна-адміністрацыйнага падзелу беларускіх губерняў [5, с. 91–96]. У 1776 г. у выніку рэарганізацыі Пскоўскай губерні была ўтворана асобная Полацкая губерня[15]. І толькі ў 1777 г. быў дакладна вызначаны падзел губерняў на паветы [5, с. 99]. Акрамя таго, неабходнай умовай для паспяховага ўкаранення ў беларускіх губернях «Учреждений...» было папярэдняе азнаямленне насельніцтва са зместам дакумента, аднак руская мова на той момант у краі яшчэ не мела дастаткова шырокага распаўсюджання. Таму было неабходна перакласці дакумент на больш зразумелую, прынамсі для шляхты, польскую мову і выдаць яго. Пераклад быў зроблены мясцовым каталіцкім біскупам Станіславам Сестранцэвічам. У пачатку 1777 г. у Магілёве быў надрукаваны тыраж выдання, а сам С. Сестранцэвіч атрымаў за сваю працу ад імператрыцы залатую табакерку [5, с. 100–101].

Нягледзячы на згаданыя складанасці аб'ектыўнага характару, увядзенне ў дзеянне «Учреждений...» у беларускіх губернях адбылося раней, чым у большасці іншых, – у 1778 г. [5, с. 102] (паводле ўказа Кацярыны II ад 10 студзеня 1778 г.[16]). У Полацкай губерні новыя ўстановы былі ўрачыста адкрыты ў маі, а ў Магілёўскай – у чэрвені 1778 г.[17]

Судовая сістэма, паводле «Учреждений...», насіла яскрава выяўлены саслоўны характар. Юрысдыкцыя большасці судовых устаноў выразна акрэслівалася па саслоўнай прыкмеце. Структурна судовая сістэма складалася з трох інстанцый павятовага і губернскага ўзроўняў (ніжняй, сярэдняй і верхняй), а таксама вышэйшай судовай інстанцыі – Сената (гл. малюнак).

Для дваран судом першай (ніжняй) інстанцыі з'яўляліся павятовыя суды, якія знаходзіліся ў павятовых гарадах. Яны складаліся з павятовага суддзі і двух засядацеляў, якія выбіраліся мясцовым дваранствам на тры гады, іх кандыдатуры зацвярджаліся губернатарам. Павятовыя суды разглядалі справы не круглы год, а падчас трох сесій: ад 8 студзеня да перадвелікоднага тыдня, ад дня Троіцы да 27 чэрвеня, ад 2 кастрычніка да 18 снежня. Гэта былі стандартныя тэрміны для ўсіх судоў, якія дзейнічалі перыядычна, а не пастаянна. Пры павятовых судах знаходзіліся дваранскія апекі. Яны займаліся пытаннямі апякунства над сіротамі, удовамі, састарэлымі, недзеяздольнымі, марнатраўцамі з ліку дваран, кіраваннем вымарачнымі маёнткамі і інш. У склад дваранскіх апек уваходзілі суддзі і засядацелі павятовых судоў, а таксама павятовы прадвадзіцель дваранства ў якасці старшыні[18].

Кроме концептуальных трудностей, открытию выставки для посетителей могло мешать и плачевное состояние, в котором собор оставила управлявшая им двадцатка. Ярким примером состояния, в котором находился в то время собор, может служить история мозаик, выполненных для третьего яруса главного иконостаса собора. В 1917 г. их привезли из Академии художеств в собор для установки[83]. Община установить их не могла, поэтому 10 мозаик были сложены в штабеля на северном портике собора. Так как мозаики не были закреплены, смальта по краям оказалась утрачена, сохранились лишь центральные части. В отчетах музея начала 1930-х гг. (вероятно, со слов кого-то из служителей) констатировалось: «Смальта по краям мозаик была расхищена ребятами»[84]. У верхней мозаики была утрачена и центральная фигура. В 1926 г. их передали обратно в Академию художеств[85]. Уже в 1929 г. из-за протечек купола в левом приделе собора имели место падения лепных карнизов и штукатурки[86].

Судя по тому, что перечень представленных на выставке экспонатов датируется августом 1929 г., к этому моменту они все еще находились в здании собора. Возможно, перечень был составлен как раз перед расформированием выставки и возвращением собранных для нее предметов на места первоначального хранения. Вместе с тем ряд из них до сих пор представлен в экспозиции музея «Исаакиевский собор»: модель лесов для установки колонн, деревянная модель Исаакиевского собора, модель разреза купола и бюст О. Монферрана вошли в фонды музея. Впрочем, когда музей в 1931 г. все же открылся для посетителей, центральными были отнюдь не указанные экспонаты, а установленный в центре собора маятник Фуко, опыт с которым доказывал вращение Земли. Однако это относится уже к следующему этапу истории музеефикации Исаакиевского собора.

Как видим, начальный этап музеефикации Исаакиевского собора оказался встроенным в сеть противоречий идеологического, академического и экономического характера. В формировании предметного ряда его первой выставки принимало участие несколько научных учреждений Ленинграда, а обсуждение концепции проходило с участием представителей академического сообщества, государственной власти, политико-просветительских учреждений и даже технических служащих собора. Все они являлись группами интересов, так или иначе влиявшими на формирование образа будущего музея. Несмотря на существенную критику со стороны групп, находившихся, казалось, в привилегированном положении, опорные элементы выставки сохранились практически в неизменном виде вплоть до настоящего времени. Представляется, что такая история позволяет увидеть в соборе не столько транслятора авторизованного дискурса власти, сколько рассредоточенный музей, сконструированный несколькими группами акторов, встроенных в сетевые отношения с предметами, имеющими собственную биографию.

## Библиографические ссылки

1. Любезников ОА, Доник КВ. Завещание и смерть Огюста Монферрана: легенды и документы. *Клио.* 2015; 10(106):196–201.

2. Любезников ОА. *Исаакиевский собор: малоизученные вопросы истории создания храма.* Санкт-Петербург: Лема; 2015.

3. Финн Л, Трошин Н. *Из очага мракобесия в очаг культуры.* Ленинград: Прибой; 1931.

4. Доминов МШ, Окунев СН. Государственный музей «Исаакиевский собор». Этапы исторической хронологии. В: Бутиков ГП, редактор. *Музеи России: поиски, исследования, опыт работы. Выпуск 6.* Санкт-Петербург: Ассоциация музеев России; 2001. с. 3–6.

[80]ЦГАЛИ СПб. Ф. 330. Оп. 1. Д. 4. Л. 24.
[81]Там же.
[82]Там же. Д. 6. Л. 21 об.
[83]Там же. Л. 19.
[84]Там же. Л. 21 об.
[85]Там же. Л. 21.
[86]Там же.

## References

1. Ljubeznikov OA, Donik KV. [Testament and death of Auguste Montferrand: legends and documents]. *Klio*. 2015; 10(106):196–201. Russian.

2. Ljubeznikov OA. *Isaakievskii sobor: maloizuchennye voprosy istorii sozdaniya khrama* [St. Isaac Cathedral: the poorly studied issues of the creation of cathedral]. Saint Petersburg: Lema; 2015. Russian.

3. Finn L, Troshin N. *Iz ochaga mrakobesiya v ochag kul'tury* [From the source of obscurantism to the source of culture]. Leningrad: Priboy; 1931. Russian.

4. Dominov MSh, Okunev SN. [The state museum St. Isaac Cathedral. Main points of Historical chronology]. In: Butikov GP, editor. *Muzei Rossii: poiski, issledovaniya, opyt raboty. Vypusk 6* [Museums of Russia: searches, research, experience. Issue 6]. Saint Petersburg: Association of museums of Russia; 2001. p. 3–6. Russian.

*Статья поступила в редколлегию 10.11.2018.*
*Received by editorial board 10.11.2018.*

# Критика и библиография

# Крытыка і бібліяграфія

# Review and bibliography

**Metryka Litewska. Rejestry podymnego Wielkiego Księstwa Litewskiego. Województwo połockie 1667 i 1690 r.** / oprac. H. Lulewicz, A. Rachuba. Warszawa: Instytut Historii PAN, 2018. 182 s.
**Lithuanian Metrica. Grand Duchy of Lithuania household tax registers. Polatsk province 1667 and 1690** / publ. by H. Lulevich, A. Rahuba. Warsaw: Polish Academy of Sciences, History Institute, 2018. 182 p.

Даследаванне мінулага, несумненна, мае свой пачатак і не скончыцца, пакуль існуе чалавецтва. Калі так, то вывучэнне і публікацыя гістарычных крыніц, асноўнага матэрыялу, на падставе і з дапамогай якога адбываецца рэканструкцыя мінулага ў свядомасці гісторыкаў, будзе заставацца галоўнай і першапачатковай задачай навукі. Кожная асобная крыніца мае сваю каштоўнасць, але для аналізу маштабных з'яў і працэсаў асаблівую значнасць маюць матэрыялы, якія акумулююць вялікія аб'ёмы інфармацыі. Такой крыніцай па айчыннай гісторыі з'яўляецца дакументацыя скарбу Вялікага Княства Літоўскага XVII ст., так званыя падымныя рэестры (абюраты), якія ўжо некалькі дзесяцігоддзяў выдаюцца польскімі гісторыкамі ў межах праекта пад агульнай назвай «Літоўская метрыка».

Унікальная серыя публікацый ажыццяўляецца дзякуючы тытанічнай працы варшаўскіх прафесараў Анджэя Рахубы і Генрыха Люлевіча – аўтарытэтнейшых і буйнейшых знаўцаў гісторыі Вялікага Княства Літоўскага[1]. Пачынаючы з 2000 г. польскія гісторыкі сканцэнтраваліся на выданні матэрыялаў, якія адрасаваны і цікавыя пераважна беларускай аўдыторыі: *гэта падатковыя рэестры Берасцейскага, Наваградскага і Мсціслаўскага ваяводстваў*[2]. Напрыканцы 2018 г. спіс апублікаваных тамоў быў дапоўнены рэестрамі падымных збораў у Полацкім ваяводстве за 1667 г. і 1690-я гг.

Полаччыне як аб'екту навуковага вывучэння ў чарговы раз пашанцавала, паколькі ў архівах захаваліся і былі адшуканы ажно два падатковыя рэестры: за 1667 і 1690 гг. Справа ў тым, што далёка не адносна ўсіх паветаў ВКЛ у архівах маюцца адпаведныя камплекты крыніц. Так, па ўсёй верагоднасці, не захаваліся падатковыя рэестры 1690 г. Віцебскага і Мсціслаўскага ваяводстваў, Мазырскага павета Менскага ваяводства і Пінскага павета Берасцейскага ваяводства[3]. Акрамя таго, дадзены том толькі трэці з ліку тых, што ўтрымліваюць звесткі за 1667 г.

Асобна можна адзначыць, што звесткі пра полацкія падатковыя рэестры яшчэ не так даўно не былі вядомыя выдаўцам, бо знаходзіліся яны не ў польскіх архівах, дзе захоўваецца даволі вялікая частка скарбавай дакументацыі ВКЛ[4]. Больш за тое, яшчэ ў 2000 г. інфармацыі пра месцазнаходжанне полацкай абюраты 1690 г. у Г. Люлевіча не было, але

[1]Першы том серыі быў падрыхтаваны А. Рахубам яшчэ ў 1989 г.: Metryka Litewska. Rejestry podymnego Wielkiego Księstwa Litewskiego. Województwo wileńskie 1690 r. / oprac. A. Rachuba. Warszawa, 1989. Наступны том выдадзены дзякуючы намаганням Г. Люлевіча ў 2000 г.: Metryka Litewska. Rejestry podymnego Wielkiego Księstwa Litewskiego. Województwo trockie 1690 r. / oprac. H. Lulewicz. Warszawa, 2000.

[2]Metryka Litewska. Rejestry podymnego Wielkiego Księstwa Litewskiego. Województwo brzeskie litewskie 1667–1690 r. / oprac. A. Rachuba. Warszawa, 2000; Metryka Litewska. Rejestry podymnego Wielkiego Księstwa Litewskiego. Województwo nowogródzkie 1690 r. / oprac. H. Lulewicz, A. Rachuba. Warszawa, 2002; Metryka Litewska. Rejestry podymnego Wielkiego Księstwa Litewskiego. Województwo mscisławskie 1667 r. / oprac. A. Rachuba. Warszawa, 2008.

[3]*Lulewicz H.* Wstęp // Metryka Litewska. Rejestry podymnego Wielkiego Księstwa Litewskiego. Województwo trockie 1690 r. / oprac. H. Lulewicz. Warszawa, 2000. S. 5–6.

[4]*Lulewicz H., Sienkiewicz W.* Rejestry podatkowe Wielkiego Księstwa Litewskiego z lat 1637–1717 // Przegląd historyczny. T. LXXII. 1981. Zesz. 1. S. 111–118.

даследчык з аптымізмам адзначаў, што «адшуканне яе можа быць толькі праблемай часу на архіўныя даследаванні» (тут і далей пераклад наш. – *В. Г.*)[5]. На шчасце, так і сталася.

Рэестр 1667 г. быў падрыхтаваны прафесарам А. Рахубам (s. 41–76), а рэестр 1690 г. набраны прафесарам Г. Люлевічам (s. 79–138). Дакументы выдадзены ў адпаведнасці з правіламі і парадкам, уласцівым папярэднім тамам серыі.

Для даследчыкаў гісторыі Полацкага ваяводства апублікаваныя матэрыялы з'яўляюцца не столькі невядомымі, колькі – сёння правільней будзе сказаць – маладаступнымі, бо праца з імі вымагала спецыяльных камандзіровак за мяжу – у Літву і Расію. Арыгіналы выдадзеных крыніц захоўваюцца ў розных архівах. Рэестр 1667 г. зберагаецца ў Літоўскім дзяржаўным гістарычным архіве, а рэестр 1690 г. – у Бібліятэцы Расійскай акадэміі навук у Пецярбургу. Рэестр 1667 г. знаходзіцца ў складзе фонду Скарбавай камісіі ВКЛ. Гэты фонд (па літоўскай архіўнай нумарацыі F-11) даволі падрабязна апісаны, таму адшукаць полацкі рэестр у ліку яго адзінак захоўвання нескладана. Акрамя таго, цікава, што рэестр гэты раней трапляў у поле зроку гісторыкаў, больш за тое, была зроблена яго копія, якая захоўваецца ў той жа справе, што і арыгінал. Пра падатковы рэестр Полацкага ваяводства 1667 г. ведаў знакаміты знаўца гісторыі Полаччыны Рышард Мяніцкі, які ў сваёй публікацыі, прысвечанай попісу полацкай шляхты 1765 г., згадаў пра кепскі стан захавання рэестра і немагчымасць атрымання з яго «дакладнай» інфармацыі: «Як пра колькасць дымоў на момант сканчэння вайны, гэта значыць сельскіх і месцкіх гаспадарак, так і пра саму полацкую шляхту, спіс якой складзены ў алфавітным парадку, не мае першых дзвюх літар»[6].

Ведаў Р. Мяніцкі і пра існаванне полацкай «падымнай тарыфы» 1690–1691 гг., якая захоўвалася ў Віленскім цэнтральным архіве, потым была вывезена ў Расію ў 1915 г. і там засталася[7]. У сувязі з гэтым актуальным застаецца пытанне, ці не адзін гэта дакумент – віленскі і пецярбургскі рукапісы. З вопісу пецярбургскага спіса рэестра вынікае, што ён трапіў у зборы Бібліятэкі Расійскай акадэміі навук пры невядомых абставінах з былой Рымска-каталіцкай акадэміі ў Санкт-Пецярбургу (s. 30). На жаль, адсутнасць у выданні прынамсі фота «складаных для інтэрпрэтацыі» былых інвентарных нумароў на гэтым рукапісе не дазваляе паразважаць над магчымымі лёсамі рукапісу (s. 30).

Кожны з выдадзеных дакументаў мае свае, у нечым падобныя, «шкілеты». Рэестр 1667 г. падрыхтаваны да друку па пашкоджаным рукапісе, у якім бракуе пачатку і канца, гэта значыць, ён утрымлівае пералік падаткаплацельшчыкаў, пачынаючы з літары *C* да літары *W*. Сам рэестр з'яўляецца копіяй, прычым першапачатковая крыніца была спецыяльна перапрацавана, паколькі спіс шляхціцаў сфарміраваны па алфавіце.

Яшчэ больш складаная сітуацыя з «арыгінальнасцю» рэестра 1690 г. Нязначная частка яго не захавалася ў выніку матэрыяльнага пашкоджання – вырваных старонак (№ 3–4). Выдаўцы падрыхтавалі тэкст, асновай якога дэ-факта выступаў толькі рэестр 1690 г., прыстасаваны пад падатковыя нормы, прынятыя падчас «нямога» сойма 1717 г. Такім чынам, тэкст рэестра 1690 г. з пункта гледжання дакладнасці можа выклікаць пэўныя пытанні, бо, па сутнасці, гэта, хаця і верыфікаваная, але ўсё ж копія, зробленая праз некалькі дзесяцігоддзяў.

«Захаваннем» рэестра 1690 г. гісторыя абавязана дзвюм асобам – Даніэлю Шпакоўскаму і Дамініку Храпавіцкаму, якія былі ў 1722 г. прызначаны люстратарамі ў Полацкае ваяводства і ў адпаведнасці з соймавымі пастановамі здзейснілі раскладку падаткаў. Пры ажыццяўленні люстрацыі ў 1723 г. за аснову былі ўзяты матэрыялы 1690 г., дапоўненыя рэаліямі пачатку 1720-х гг. Фактычна гэта азначае, што ў рэестры ў алфавітным парадку пададзены прозвішчы ўласнікаў маёмасці з «абюраты» 1690 г. з пазначэннем змен, актуальных на 1723 г. Апошняя акалічнасць надае публікацыі выключную каштоўнасць для вывучэння гісторыі шляхецкага землеўладання ў дынаміцы, а самі звесткі рэвізіі робіць незаменнай крыніцай па генеалогіі полацкай шляхты. На жаль, паўнавартасна зрабіць гэту працу не дазваляе сам рукапіс, найбольшай хібай якога з'яўляецца абмежаванне пераліку полацкіх падаткаплацельшчыкаў толькі да літары *R*, а гэта, па падліках выдаўцоў, можа азначаць страту да 174 полацкіх абывацеляў, чые імёны пачыналіся на літары *S*–*Ż* (s. 28–34).

Публікацыю рэестраў можна таксама назваць спробай своеасаблівай крыніцазнаўчай рэканструкцыі пачатковага тэксту. Гэта тычыцца страчаных фрагментаў, якія польскія гісторыкі кампенсавалі за кошт адшуканых у розных крыніцах звестак: да рэестра 1667 г. быў дададзены невялікі спіс падаткаплацельшчыкаў-святароў за 1672 г., знойдзены ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі (s. 76–77). Да абюраты 1690 г. далучаны тры невялікія дадаткі з вытрымкамі з люстрацыйных квітоў 1723 г., з фрагментамі са звесткамі аб падатках віленскага ваяводы Казіміра Яна Сапегі з полацкіх уладанняў 1690 г. і са спісам, зрэш-

[5]*Lulewicz H.* Wstęp // Metryka Litewska. Rejestry podymnego Wielkiego Księstwa Litewskiego. Województwo trockie 1690 r. / oprac. H. Lulewicz. Warszawa, 2000. S. 6.
[6]*Mienicki R.* Rejestr popisowy województwa połockiego z dn. 30 IX. 1765 r. // Ateneum Wileńskie. R. XI. 1936. S. 308.
[7]Ibid.

ты, раней друкаваным, неаплаціўшых своечасова падаткі, згодна з пастановай полацкага рэляцыйнага сойміка 1736 г. (s. 139–143).

Прынцыповая важкасць гэтай кампенсаванай інфармацыі для аналізу той жа абюраты 1690 г. грунтуецца на тым, што датычыцца яна маёмасці Полацкага езуіцкага калегіума і віленскага ваяводы Казіміра Яна Сапегі, памер уладанняў якіх (216 і 294 дымы адпаведна) меў выключную значнасць у адсоткавым вымярэнні ад агульнай сумы дымоў па ваяводстве (s. 81, 140). У выніку запаўнення роўнавартаснымі матэрыяламі памеры прабелаў у рэестры 1690 г. былі зменшаны да 9,5 % (s. 34). Такім чынам, публікацыя дазваляе ўявіць крыніцы прыходу крыху больш за 90 % падаткаў з Полаччыны.

Аснову рэестраў складаюць спісы асоб, якія мелі ўласнасць на тэрыторыі Полацкага ваяводства. Канешне, большасць з іх былі шляхцiцамі, але не толькі: напрыклад, у абюраце 1667 г. пачэснае месца са сваім адным дымам займаў «Пан Аўлас Вус, дзісненскі райца, з Аметнай» (s. 75). Самі рэестры дазваляюць канстатаваць нязменнасць асноўнага складу мясцовай спадчыннай эліты – так званай полацкай шляхты, якая ў цэлым дэманстравала зайздроснае генетычнае здароўе і, як і стагоддзі раней, была рэпрэзентавана кланамі Корсакаў, Глазкаў, Падбіпентаў, Мяніцкіх, Рэвутаў, Рыпінскіх і г. д. Да роднай Полацкай зямлі шляхта была прывязана ў прамым сэнсе слова, што відаць па дамінуючай мадэлі пераходу зямлі ў спадчыну: уласнасць звычайна трапляла да сваякоў – носьбітаў адных і тых жа прозвішчаў (s. 31–32).

Варта звярнуць увагу на звесткі «падымнай тарыфы» 1690 г. з улікам наяўнасці ў ёй інфармацыі пра расклад гіберны на насельніцтва Полацкага ваяводства (s. 79–81), а таксама няпоўнага, але вельмі падрабязнага пераліку каталіцкіх і ўніяцкіх святароў з пазначэннем колькасці дымоў у падпарадкаваных ім уладаннях (s. 81–88).

Таксама нельга абмінуць і таго, што ва ўступнай аналітычнай частцы публікацыі істотна скарэктаваны вылічаныя ў польскай гістарыяграфіі і пераняты беларускімі даследчыкамі даныя пра памеры страт Полаччыны ў вайне 1654–1667 гг.[8] Так, згодна з падлікамі, якія зрабіў польскі даследчык Ежы Можы, у выніку пераходу на новыя правілы збору падаткаў на тэрыторыі Полацкага ваяводства ў 1650 г. было налічана 23 204 дымы, што давала 174 030 жыхароў (s. 17). Па падліках гэтага ж гісторыка, на 1667 г. у Полацкім ваяводстве заставалася 6927 дымоў, што азначала страту 70 % адзінак падаткаабкладання і, адпаведна, папуляцыі. Аднак гэтыя даныя не адпавядаюць рэчаіснасці, паколькі Е. Можы няслушна далучыў да Полацкага ваяводства Невельскую і Себежскую воласці, якія на 1667 г. не ўваходзілі ў склад гэтага ваяводства. Фактычна падатковы рэестр 1667 г. налічвае максімум 3322 дымы, **што дае новы максімум агульных страт на Полаччыне, роўны 83,4 % дымоў і, адпаведна, насельніцтва** (s. 18). Апошняя лічба лепш карэлюе з рэальнымі стратамі самога места Полацкага, якое не далічылася 93,2 % дымоў[9]. Такім чынам, агульныя вынікі расійскай экспансіі на тэрыторыю Беларусі ў сярэдзіне XVII ст. найбольш катастрафічныя наступствы мелі менавіта для Полацкага ваяводства, якое пасля 1667 г. пачынала сваю дэмаграфічную гісторыю ледзь не з чыстага аркуша.

Том, падрыхтаваны польскімі гісторыкамі, па сваёй вартасці мае ўнікальны характар яшчэ і таму, што дазваляе запоўніць відавочны інфармацыйны прабел, які склаўся паміж 1552 і 1765 гг., гэта значыць за больш чым два стагоддзі.

Полацкія рэестры з’яўляюцца каштоўным матэрыялам для вывучэння розных аспектаў гісторыі полацкай шляхты, якая перажыла не самыя лепшыя гады ваеннага ліхалецця сярэдзіны XVII ст. і была вымушана прыстасоўвацца да розных умоў. Так, у ліку падаткаплацельшчыкаў рэестр 1667 г. згадвае полацкага войскага Тэафіла Дадзібога Храпавіцкага (s. 47), які дванаццаць гадоў таму апынуўся ў ліку здраднікаў-палачан, якія прысягнулі на вернасць маскоўскаму цару[10].

Апублікаваныя крыніцы маюць каштоўнасць не толькі самі па сабе. Асобную вартасць мае навуковы апарат, які суправаджае спісы землеўладальнікаў. У вялікай колькасці выпадкаў выдаўцы парупіліся змясціць у падрадках лаканічную інфармацыю прасапаграфічнага характару пра полацкіх шляхціцаў (што пад сілу было зрабіць, бадай, толькі прафесарам А. Рахубе і Г. Люлевічу, складальнікам даведнікаў пра ўраднікаў ВКЛ), прывялі звесткі, якія дазваляюць удакладніць, параўнаць альбо скарэктаваць даныя крыніц.

Полацкія падатковыя рэестры з’яўляюцца выключна цікавай і каштоўнай гістарычнай крыніцай, але да іх, як і да ўсіх падобных матэрыялаў, трэба ставіцца без асаблівых ілюзій. Падатковыя рэестры, па агульным меркаванні, не з’яўляюцца дакладнай крыніцай, паколькі даныя для паборцаў перадаваліся самімі землеўладальнікамі, якія, натуральна, імкнуліся зменшыць памер сваіх выплат. На гэта польскія даследчыкі звярнулі ўвагу раней[11] і не абмінулі гэту прынцыповую праблему ў прад-

[8]*Можы Ю.* Дэмаграфічны спад на Беларусі й Ліцьве ў сярэдзіне XVII стагодзьдзя // Спадчына. 1992. № 5. С. 19–35; Сагановіч Г. Невядомая вайна: 1654–1667. Мінск, 1995. С. 130, 139–140.

[9]Паводле Е. Можага: *Сагановіч Г.* Невядомая вайна: 1654–1667. Мінск, 1995. С. 139.

[10]Крестоприводная книга шляхты Великого княжества Литовского 1655 г. Памятники истории Восточной Европы. Источники XV–XVII вв. Т. IV. М.; Варшава, 1999. С. 54.

[11]*Rachuba A.* Wstęp // Metryka Litewska. Rejestry podymnego Wielkiego Księstwa Litewskiego. Województwo wileńskie 1690 r. / oprac. A. Rachuba. Warszawa, 1989. S. 17–19.

мове да публікацыі полацкіх рэестраў другой паловы XVII ст. Справа ў тым, што, згодна з данымі падатковага рэестра 1690 г., на ўсёй тэрыторыі Полацкага ваяводства налічвалася толькі 5460 дымоў, і гэта разам з далучанымі да яго пасля 1678 г. Невельскай і Себежскай валасцямі (!). Калі не ўлічваць апошнія, а гэта ў суме 1845 дымоў, то, па даных на 1690 г., на тэрыторыі Полацкага ваяводства ў межах 1667 г. колькасць дымоў у рэальнасці скарацілася на 6 %: было 3853 дымы, стала 3615. Зыходзячы з гэтага, лёгка прыйсці да высновы, што даныя 1690 г. альбо фіксуюць адмоўную дынаміку ў дэмаграфічных зменах, альбо, што больш верагодна, не адпавядаюць рэчаіснасці і свядома сфальсіфікаваны (s. 19–20).

Увогуле, на нашу думку, матэрыялы рэестраў дазваляюць даследаваць не толькі пытанні эканамічнай і дэмаграфічнай гісторыі, а з'яўляюцца падставай для разваг над лёсамі самой Рэчы Паспалітай. Рэестр 1690 г. быў складзены ва ўмовах адноснай стабілізацыі другой паловы XVII ст., а ў XVIII ст. ён становіцца асноўнай матрыцай, на падставе якой вызначаўся памер падаткаў, у тым ліку на ўтрыманне акупацыйнай расійскай арміі, якая цыклічна прысутнічала на ўсходзе Беларусі. Але важна тут наступнае: рэестр 1690 г. утрымлівае звесткі, мякка кажучы, «заніжаючыя» колькасць дымоў, і зроблена гэта было яшчэ да рэгулярных наездаў усходняга суседа, гэта значыць дэградацыя грамадскай салідарнасці і нежаданне падтрымліваць палітычную сістэму былі вынікам не знешніх, а ўнутраных працэсаў, і бяруць яны свой пачатак яшчэ ў XVII ст. Ці не адпавядаюць такія змены ў адносінах да грамадскай справы пэўнай тэндэнцыі ў эвалюцыі грамадзянскай свядомасці шляхты ВКЛ? Нежаданне плаціць падаткі ўласцівае людзям ва ўсе часы, але гэты крытэрый з'яўляецца важным паказчыкам даверу грамадства да дзяржавы. Адсюль вынікае наступнае пытанне: ці не трэба разглядаць прыхаванне падаткаплацельшчыкамі памераў сваёй маёмасці і адпаведных прыбыткаў як сведчанне недаверу да аўтарытэту «шляхецкай рэспублікі», якую можна было падманваць у асабліва буйных памерах, бо ад велічыні ўладання залежалі памеры недаплаты ў дзяржаўны скарб, пра што сведчаць гісторыі з Сапегамі і Радзівіламі[12]. Хто ж будзе лічыцца з такой дзяржавай і яе грамадзянамі? Магчыма, у гэтым заключаецца прычына выканання Рэччу Паспалітай ролі так званай «перыферыйнай дзяржавы, падпарадкаванай уплывам і інтарэсам Расійскай імперыі», як слушна заўважана ва ўступе да рэцэнзуемага выдання (s. 21).

Публікацыю рэестраў падымнага 1667 і 1690 гг. можна без ваганняў аднесці да самых неардынарных і непараўнальных археаграфічных эксперыментаў А. Рахубы і Г. Люлевіча ў межах падрыхтоўкі скарбавай дакументацыі часоў ВКЛ. Выданне дае магчымасць даследчыкам карыстацца ўнікальнай, існуючай у адзінай версіі крыніцай інфармацыі, якая запаўняе даволі значны прабел у матэрыялах падаткова-статыстычнага і генеалагічнага характару па гісторыі Полаччыны і Беларусі ў цэлым. Адначасова гэта публікацыя ставіць на дзённы парадак выданне яшчэ аднаго комплексу матэрыялаў – падатковага рэестра Полацкага ваяводства, складзенага ў 1775 г. Матэрыялы яго захоўваюцца ў Літоўскім дзяржаўным гістарычным архіве, дзе, дарэчы, на іх распаўсюджваецца самы ліберальны спосаб капіравання. Увядзенне ў навуковае абарачэнне і аналіз рэестра 1775 г. у сукупнасці з іншымі аналагічнымі матэрыяламі дазволіць прадпрымаць адносна цэласныя і верагодныя рэканструкцыі эканамічнай і дэмаграфічнай гісторыі Полаччыны XVI–XVIII стст.

***В. У. Галубовіч***[13]

[12] *Lulewicz H.* Wstęp // Metryka Litewska. Rejestry podymnego Wielkiego Księstwa Litewskiego. Województwo Trockie 1690 r. / oprac. H. Lulewicz. Warszawa, 2000. S. 21–22.

[13] *Виталий Владимирович Голубович* – доцент кафедры общественных наук факультета бухгалтерского учета Гродненского государственного аграрного университета.

*Віталій Уладзіміравіч Галубовіч* – дацэнт кафедры грамадскіх навук факультэта бухгалтарскага ўліку Гродзенскага дзяржаўнага аграрнага ўніверсітэта.

*Vitali V. Halubovich*, associate professor at the department of social sciences, faculty of accounting, Hrodna State Agrarian University.

E-mail: *halubovich2007@tut.by*

# Научная жизнь

# Навуковае жыццё

# Scientific events

## МЕЖДУНАРОДНАЯ НАУЧНАЯ КОНФЕРЕНЦИЯ «ИСТОРИЯ И ИСТОРИОГРАФИЯ: ОБЪЕКТИВНАЯ РЕАЛЬНОСТЬ И НАУЧНАЯ ИНТЕРПРЕТАЦИЯ» (МИНСК, ИСТОРИЧЕСКИЙ ФАКУЛЬТЕТ БЕЛОРУССКОГО ГОСУДАРСТВЕННОГО УНИВЕРСИТЕТА, 5 ОКТЯБРЯ 2018 г.)

## МІЖНАРОДНАЯ НАВУКОВАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ «ГІСТОРЫЯ І ГІСТАРЫЯГРАФІЯ: АБ'ЕКТЫЎНАЯ РЭАЛЬНАСЦЬ І НАВУКОВАЯ ІНТЭРПРЭТАЦЫЯ» (МІНСК, ГІСТАРЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА, 5 КАСТРЫЧНІКА 2018 г.)

## INTERNATIONAL SCIENTIFIC CONFERENCE «HISTORY AND HISTORIOGRAPHY: OBJECTIVE REALITY AND SCIENTIFIC INTERPRETATION» (MINSK, FACULTY OF HISTORY, BELARUSIAN STATE UNIVERSITY, 5 OCTOBER, 2018)

На историческом факультете Белорусского государственного университета 5 октября 2018 г. состоялась Международная научная конференция «История и историография: объективная реальность и научная интерпретация», приуроченная к 140-летию со дня рождения первого ректора университета – выдающегося историка, академика Академии наук БССР и Академии наук СССР Владимира Ивановича Пичеты (1878–1947). В работе конференции приняли участие более 70 представителей учреждений высшего образования, научных и архивных учреждений Беларуси, Польши, России. В программе конференции были заявлены также исследователи из Казахстана и Украины.

С приветственным словом к участникам конференции обратился заместитель председателя организационного комитета, проректор БГУ по учебной работе и интернационализации образования доктор исторических наук С. Н. Ходин. Он отметил, что глубоко символично проведение пленарного заседания конференции в мемориальной аудитории имени В. И. Пичеты, находящейся в здании, в котором зарождался первый государственный университет Беларуси.

Открывая конференцию, декан исторического факультета профессор А. Г. Кохановский выразил благодарность всем участникам и пожелал успехов в постижении важных проблем отечественной и всемирной истории.

В ходе пленарного заседания были заслушаны доклады заведующего кафедрой истории России исторического факультета БГУ профессора О. А. Яновского «Историк В. И. Пичета в контексте политических пертурбаций первой половины XX века», заведующего кафедрой истории древнего мира и средних веков исторического факультета БГУ профессора В. А. Федосика «Всемирная история по библейской концепции “четырех царств” в россий-

ских хрониках и летописях XV–XVI вв.», проректора по научной работе Смоленского государственного университета, заведующего кафедрой истории России профессора Е. В. Кодина «Н. П. Вакар и начало американского послевоенного белорусоведения», доцента кафедры истории России исторического факультета БГУ кандидата исторических наук С. Н. Темушева «Проблемы этнического и политического развития домонгольской Руси в представлении В. И. Пичеты». Все доклады достаточно точно отразили общую тему конференции: постоянный поиск историками путей к объективному постижению прошлого.

Опираясь на сравнительно недавно введенные в научный оборот эго-документы (среди которых написанная В. И. Пичетой во время пребывания в 1930 г. в печально знаменитом ленинградском следственном изоляторе «Кресты» своего рода исповедь «Мое общественное кредо»; личный дневник, который бывший ректор БГУ вел после Великой Отечественной войны; статья о войне 1812 г., подготовленная к столетнему юбилею и явно диссонировавшая официально-охранительной историографии того времени и др.), О. А. Яновский сделал вывод о значительном влиянии событий общественно-политического характера на научное творчество ученого.

Предметом исследования В. А. Федосика стали основные российские средневековые источники по всемирной истории: «Летописец Еллинский и Римский» (XV в.) и «Русский хронограф» (1512 г.). Анализ этих материалов, по мнению профессора, дает доказательства использования в них библейской концепции четырех царств, по которой «Римское царство» – последнее из них, что, в свою очередь, было использовано для обоснования теории «Москва – третий Рим».

Говоря о Н. П. Вакаре как об историке, профессор Е. В. Кодин отметил, что у специалистов по белорусской истории это имя ассоциируется в первую очередь с книгой «Белоруссия. Создание нации», изданной Гарвардским университетом в 1956 г. Однако обстоятельства разработки Н. П. Вакаром белорусской темы до сих пор остаются малоизвестными. Прояснить их и явилось задачей, которую поставил перед собой смоленский историк, известный белорусскому научному сообществу прежде всего исследованиями о так называемом Смоленском партийном архиве.

Анализ наработок В. И. Пичеты из области древнерусской истории, проделанный в докладе доцента С. Н. Темушева, позволил докладчику отнести ученого к числу ведущих советских специалистов по древнерусской истории. До наших дней, по мнению выступавшего, сохраняет научную состоятельность видение ученым принципов организации власти и управления в древнерусских княжествах, среди которых достойное место принадлежало Полоцкому княжеству.

Первая секция конференции, что вытекало из ее названия, носила мемориальный характер: «В. И. Пичета: научная и общественно-политическая ипостаси историка». На ней были заслушаны сообщения о деятельности университетского ректора в качестве лидера краеведческого движения, развернувшегося в советской Беларуси в первой половине 1920-х гг. (А. В. Денисов) и о трудах ученого, посвященных истории воссоединения Западной Беларуси и БССР осенью 1939 г. (Д. А. Дедюля). Информационно насыщенным было сообщение сотрудника Центрального научного архива Национальной академии наук Беларуси К. В. Сытько, в котором выступавший подверг анализу хранящиеся в фондах архива документы о деятельности В. И. Пичеты в Институте белорусской культуры и Белорусской академии наук. Его выступление было дополнено сообщением М. Ф. Шумейко, в центре внимания которого находились преимущественно эго-документы из личного архивного фонда ученого в Архиве Российской академии наук. Опираясь на впервые вводимые в научный оборот источники, выступавший проследил историю поступления после смерти ученого ряда его рукописей и книг из личной библиотеки в Музей истории БГУ, отдел редкой и рукописной книги Государственной библиотеки БССР имени В. И. Ленина и др. Сообщение А. В. Вайтович затрагивало археологическую сферу в многогранной научной деятельности В. И. Пичеты

Логическим продолжением мемориальной части стала работа второй секции «Наука и образование в просопографическом прочтении». Большинство сообщений было посвящено коллегам В. И. Пичеты по БГУ, а также тем, кто продолжал его дело в университете, кто знал ученого по московскому периоду жизни. Это доклады «Народный комиссар просвещения БССР А. М. Платун как представитель советской номенклатуры» (О. И. Ершова), «В. П. Тёпин — первый декан рабфака БГУ» (А. А. Кондратенко), «Борьба за право быть неоклеветанным: профессор С. З. Каценбоген в условиях партийных чисток в 1930–1940-е гг.» (А. Н. Максимчик), «Заснавальнік школы фізічнай хіміі ў БДУ: прафесар М. М. Паўлючэнка» (В. А. Кохнович), «Профессор Е. Е. Сиротин как организатор физической науки в Беларуси в 1920-е гг.» (А. М. Назаренко), «Николай Павлович Шкляев – хранитель минских архивов (1888–1959 гг.)» (Т. Д. Гернович), «Забыты беларускі этнограф: жыццё і творчасць Аляксандра Ануфрыевіча Шлюбскага» (С. А. Захаркевич), «И. О. Царюк – историк, декан, педагог» (А. С. Хадасевич), «Историк и Вечность: С. О. Шмидт

и историческое архивоведение» (Т. И. Хорхордина), «Советский университет: руководители и преподаватели вуза в период его становления (на примере Смоленского государственного университета в 1920–30-е гг.» (Т. И. Тарасенкова).

Не была забыта историческая ретроспектива БГУ и деятельности его первого ректора. Об этом шла речь в сообщениях «От филомата до ректора императорского университета: О. М. Ковалевский на службе науке и образованию» (С. Ф. Шимукович), «Студенты Виленской медико-хирургической академии в борьбе за свои права» (С. Л. Луговцова). В рамках работы секции были рассмотрены также носившие методологический и методический характер вопросы: «Михаил и Павел Бобровский: воспитание историка» (Е. И. Мелешко), «Национальное многообразие в учебных программах БГУ в 20–30-е гг. XX в.» (Л. И. Мосейчук), «Концепция истории Беларуси в трудах В. К. Щербакова» (В. А. Белозорович), «Историки Итальянских войн: персональные судьбы и "большая история"» (Д. В. Мазарчук) и др.

Методологические проблемы исторической науки рассматривались и на третьей секции «Многообразие истории в когнитивной практике исследователя». Об этом шла речь в сообщениях О. И. Ханкевич «Полисная демократия в оценках древних и современных авторов», Л. В. Ландиной «Соотношение подходов в изучении западноевропейского и российского абсолютизма в российской историографии конца XIX – начала XXI в.», О. В. Бригадиной «Мы – другие: евразийская концепция российской истории», В. И. Меньковского «Новая "имперская история" как историографическое направление», А. П. Салькова «Болгаро-греческий конфликт в Западной Фракии (1912–1938): историографические интерпретации и объективная реальность», О. С. Ивановой «Лёс падручніка нідэрландскіх архівістаў С. Мюлера, І. Фэйта і Р. Фруіна ў архівазнаўчай гістарыяграфіі XX ст.» и др.

Широкие хронологические рамки (XIV–XXI вв.) охватывали сооббщения, прозвучавшие на четвертой секции «История как интеллектуальная основа неразрывной связи поколений белорусского народа». О шляхте ВКЛ XIV–XVI вв. в современной белорусской историографии шла речь в выступлении Н. В. Козловской. А. В. Любый обратил внимание на актуальность и степень разработанности в современной историографии истории династии Ягеллонов в ВКЛ. Социально-экономической истории Беларуси конца XVIII – начала XX в. были посвящены сообщения А. В. Ерошевича «Дзяржаўныя фінансы губерняў Беларусі канца XVIII – першай паловы XIX ст.: сучасная гістарыяграфія праблемы», А. В. Бурачонка «Дзелавая актыўнасць насельніцтва Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. як актуальная праблема сучаснай айчыннай гістарыяграфіі», А. Г. Кохановского «Аграрны крызіс 80-х гг. XIX ст. і трансфармацыйныя змены ў беларускай вёсцы», И. В. Лебедевой «Дзеці ў сацыяльна-палітычных працэсах Беларусі 1861–1914 гг.: стан гістарыяграфіі», А. А. Кухаренко «Историография ипотечного кредитования крестьянского населения белорусских губерний», С. В. Вайтовича «Вопросы налогообложения крестьянства БССР в 1920-х гг. в работах отечественных исследователей» и др.

Военная история, история культуры, анализируемые через призму историографии, стали объектами исследований Ю. И. Литвиновской «События войны 1812 года на территории Беларуси в работах российских исследователей XIX – начала XX века» и В. В. Сергеенковой «Политика правительства в области начального образования в земских губерниях России в 1860–1870-х гг.: историография проблемы». Вопросы коммеморации рассматривались в выступлениях Д. К. Ракова «Международный День памяти "Березина": история, проблемы и перспективы проведения», М. А. Лавринович «День памяти жертв коммунистического режима в Чешской Республике: история его возникновения и современные практики коллективного воспоминания периода социализма», В. Н. Кухаренко «Фарміраванне культу лідара Харвацкай сялянскай партыі Сцяпана Радзіча і яго рэалізацыя ў межах харвацкай палітыкі памяці».

Работа пятой, заключительной, секции конференции «Исторический источник: поиск, сохранение, научное прочтение» носила как теоретический, так и прикладной характер применительно к источниковедению, историографии и другим специальным историческим дисциплинам. К первому направлению можно отнести сообщения Д. С. Самохвалова «История и психология: сложный путь междисциплинарной интеграции», А. М. Белявского «О деконструктивистской критике как методе источниковедческого изучения архивов», В. А. Петровской «Литературные произведения в свете визуального поворота: источниковедческий потенциал для исторического исследования», В. В. Репина «Устная история как методологическая перспектива для изучения и репрезентации чехословацкого общества в период тоталитаризма», В. Хоронжичевского и А. Росы «К глобальному сообществу архивистов». Ко второму – доклады И. О. Евтухова «Пропавшая грамота: борьба за наследство в англосаксонской Англии X века», С. И. Михальченко «Письма Ф. В. Тарановского в зарубежных архивах», М. Глебенека «Проблемы издания сфрагистических материалов», М. Яблоньской и Б. Кешковской «Аудиовизуальная документация как источник по истории университета на примере фонда Архива Университета Николая Коперника в Торуне», А. Н. Латушкина «Калекцыя фотакопій сярэднявечных актаў Інстытута гісторыі Ягелонскага ўніверсітэта і яе

каштоўнасць для рэканструкцыі складу архіва ВКЛ», С. Б. Кауна «Городельский привилей 2 октября 1413 г. как исторический источник по истории Беларуси: опыт формулярного анализа», С. А. Толмачевой «Працы з'езда неадменных членаў губернскіх прысутнасцей як крыніца вывучэння аграрнай палітыкі самадзяржаўя ў Беларусі ў пачатку XX ст.», З. В. Антонович «Вучэбная дакументацыя рымска-каталіцкіх навучальных устаноў як крыніца па гісторыі штодзённасці XIX – пачатку XX ст.».

Доработанные авторами и озвученные на заседаниях секций материалы составили основу издания сборника научных статей, посвященных 140-летию со дня рождения академика В. И. Пичеты, «История и историография: объективная реальность и научная интерпретация» (редколлегия: А. Д. Король и др., издан в Минске Издательским центром БГУ в 2018 г.).

***М. Ф. Шумейко***[1]
***О. А. Яновский***[2]

[1]*Михаил Фёдорович Шумейко* – кандидат исторических наук, доцент; заведующий кафедрой источниковедения исторического факультета Белорусского государственного университета.

*Міхаіл Фёдаравіч Шумейка* – кандыдат гістарычных навук, дацэнт; загадчык кафедры крыніцазнаўства гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Michail F. Shumeiko*, PhD (history), docent; head of the department of the source study, faculty of history, Belarusian State University.

E-mail: *jesti@inbox.ru*

[2]*Олег Антонович Яновский* – кандидат исторических наук, профессор; заведующий кафедрой истории России исторического факультета Белорусского государственного университета.

*Алег Антонавіч Яноўскі* – кандыдат гістарычных навук, прафесар; загадчык кафедры гісторыі Расіі гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Aleh A. Yanouski*, PhD (history), full professor; head of the department of the Russian history, faculty of history, Belarusian State University.

E-mail: *helgoleg@mail.ru*

# МЕЖДУНАРОДНАЯ НАУЧНАЯ КОНФЕРЕНЦИЯ «ФОРМИРОВАНИЕ БЕЛОРУССКОЙ ГОСУДАРСТВЕННОСТИ В УСЛОВИЯХ ГЕОПОЛИТИЧЕСКИХ СДВИГОВ XX в.»

# МІЖНАРОДНАЯ НАВУКОВАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ «ФАРМІРАВАННЕ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ ВА ЎМОВАХ ГЕАПАЛІТЫЧНЫХ ЗРУХАЎ XX ст.»

# INTERNATIONAL SCIENTIFIC CONFERENCE «FORMATION OF BELARUSIAN STATEHOOD IN CONDITIONS OF GEOPOLITICAL SHIFTS OF THE XX CENTURY»

У Беларускім дзяржаўным універсітэце 29–30 лістапада 2018 г. прайшла Міжнародная навуковая канферэнцыя «Фарміраванне беларускай дзяржаўнасці ва ўмовах геапалітычных зрухаў XX ст.». Навуковы форум быў прысвечаны стагадовай гадавіне падзей, якія прывялі да ўтварэння ССРБ (БССР) і прадвызначылі далейшы шлях развіцця беларускай дзяржаўнасці ў XX ст. Арганізатарам навуковага мерапрыемства выступіў гістарычны факультэт БДУ. У рабоце канферэнцыі актыўны ўдзел прынялі прадстаўнікі юрыдычнага факультэта, факультэта міжнародных адносін і факультэта філасофіі і сацыяльных навук БДУ.

Навуковы форум праходзіў пры падтрымцы Міжнароднага праекта COMPASS («Комплекснае павышэнне патэнцыялу ва Усходнім суседстве і Цэнтральнай Азіі: інтэграцыя даследаванняў, эфектыўнае кіраванне і ўстойлівыя супольнасці»). Праект ажыццяўляе ў 2018–2021 гг. кансорцыум Кенцкага і Кембрыджскага ўніверсітэтаў (Вялікабрытанія), Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, Універсітэта АДА (Азербайджан), Таджыкскага нацыянальнага ўніверсітэта, Універсітэта сусветнай эканомікі і дыпламатыі (Узбекістан). Праект фінансуецца Даследчым фондам па глабальных выкліках (*Global Challenges Research Fund*, GCRF) Службы па даследаваннях і інавацыях Злучанага Каралеўства (*United Kingdom Research & Innovation*, UKRI).

Рэалізацыя праекта COMPASS у Беларусі стала магчымай дзякуючы перамозе Кенцкага ўніверсітэта і створанага ім кансорцыума ў конкурсе заявак Даследчага фонду па глабальных выкліках. Усяго на конкурс было пададзена звыш 500 заявак, для фінансавання адабралі 37 праектаў ва ўсіх галінах ведаў. COMPASS – адзіны праект, падтрыманы GCRF у галіне сацыяльных навук. Яго кіраўніком з'яўляецца прафесар Алена Карасцялёва – дырэктар Цэнтра глабальнай Еўропы Школы палітыкі і міжнародных адносін Кенцкага ўніверсітэта. У Беларусі праект COMPASS рэалізуецца сумесна гістарычным факультэтам і факультэтам міжнародных адносін БДУ з удзелам Цэнтра сацыялагічны і палітычных даследаванняў, іншых падраздзяленняў БДУ. Да ажыццяўлення мерапрыемстваў праекта, акрамя выкладчыкаў і навуковых работнікаў, актыўна прыцягваюцца аспіранты і студэнты розных факультэтаў.

У рамках праекта COMPASS праводзяцца даследаванні і абмен вопытам у галінах адукацыі, эфектыўнага кіравання ва ўмовах развіцця IT, міграцыйных працэсаў і рэгіянальнай бяспекі, устойлівага развіцця. Рыхтуюцца розныя сумесныя навуковыя і вучэбныя публікацыі, вядзецца распрацоўка новых курсаў і праграм на англійскай мове, рыхтуецца шэраг сумесных навуковых і адукацыйных праектаў. Праект COMPASS паслядоўна падтрымлівае ініцыятывы, накіраваныя на ўмацаванне даследчага патэнцыялу БДУ ў сацыяльна-гуманітарнай сферы, пашырэнне міжнароднага навуковага і экспертнага дыялогу па значных для Беларусі пытаннях, у тым ліку па праблеме фарміравання беларускай дзяржаўнасці.

Міжнародная навуковая канферэнцыя «Фарміраванне беларускай дзяржаўнасці ва ўмовах геапалітычных зрухаў XX ст.» сабрала больш за 120 удзельнікаў, у тым ліку звыш 100 вядомых айчынных і замежных спецыялістаў, якія займаюцца вывучэннем актуальных праблем нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва ў Беларусі ў XX ст., развіцця Рэспублікі Беларусь ва ўмовах інтэграцыйных і глабалізацыйных працэсаў сучаснасці, пытанняў міжнароднай актыўнасці краін Усходняй і Цэнтральнай Еўропы. Праграма канферэнцыі ўключала даклады не толькі прадстаўнікоў БДУ, але і Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка, Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта, Беларускага дзяржаўнага аграрнага тэхнічнага ўніверсітэта, Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна, Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны, Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы, Акадэміі МУС Рэспублікі Беларусь, Беларускай дзяржаўнай акадэміі сувязі і інш. На адрас аргкамітэта канферэнцыі былі дасланы даклады з расійскіх, украін-

скіх, нямецкіх, чэшскіх адукацыйных і іншых устаноў, такіх як Расійская акадэмія народнай гаспадаркі і дзяржаўнай службы пры Прэзідэнце Расійскай Федэрацыі, Расійскі дзяржаўны гуманітарны ўніверсітэт, Дзяржаўны архіў навейшай гісторыі Смаленскай вобласці, Кіеўскі нацыянальны ўніверсітэт імя Тараса Шаўчэнкі, Цюбінгенскі ўніверсітэт, Зігенскі ўніверсітэт, Карлаў універсітэт у Празе і інш. На секцыях былі прадстаўлены таксама даклады студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў БДУ і Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна.

Праблемнае поле канферэнцыі ахоплівала пытанні, якія звязаны з асэнсаваннем ролі геапалітычных трансфармацый пачатку XX ст. у Цэнтральнай і Усходняй Еўропе ў дзяржаваўтваральных працэсах на тэрыторыі Беларусі, адлюстраваннем этапаў і асаблівасцей нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва і развіцця БССР ва ўмовах міжнародных выклікаў і пагроз канца 1930-х – першай паловы 1940-х гг. Асобныя блокі навуковага форуму былі сфакусіраваны на разглядзе пытанняў узаемаадносін улады і грамадства ў БССР у пасляваенны час, трансфармацыі грамадска-палітычнага жыцця ў другой палове 1980-х – пачатку 1990-х гг. Вялікая ўвага была нададзена пытанням абвяшчэння незалежнасці Рэспублікі Беларусь і станаўлення прэзідэнцкай палітычнай сістэмы ў краіне, а таксама геапалітычнага патэнцыялу Рэспублікі Беларусь ва ўмовах інтэграцыйных і глабалізацыйных працэсаў сучаснасці.

Адкрыццё і пленарнае пасяджэнне канферэнцыі прайшло ў зале пасяджэнняў вучонага савета БДУ ў будынку рэктарата ўніверсітэта. Адкрыў мерапрыемства першы прарэктар БДУ акадэмік А. А. Івашкевіч, які ад імя старшыні арганізацыйнага камітэта рэктара БДУ, доктара педагагічных навук, прафесара А. Д. Караля звярнуўся з прывітальным словам да ўсіх удзельнікаў канферэнцыі. Было адзначана, што дадзенае мерапрыемства працягвае традыцыю буйных навуковых форумаў, якія арганізуюцца ўніверсітэтам і прысвечаны ключавым падзеям беларускай гісторыі. У прывітальным слове Андрэя Дзмітрыевіча была падкрэслена важнасць разгляду дзяржаваўтваральных працэсаў на тэрыторыі Беларусі ў XX ст. з сапраўды навуковага пункта гледжання, пры якім недапушчальнае ўжыванне кан'юнктурных або папулісцкіх інтэрпрэтацый падзей стагадовай даўніны. Было таксама адзначана, што вельмі важна ў межах навуковага форуму даць глыбокі аналіз названых падзей, паказаць іх сапраўднае значэнне для сучаснага развіцця беларускай дзяржавы, беларускага народа, яго культуры і менталітэту.

Пленарнае пасяджэнне адкрыў даклад «Беларускае нацыянальнае дзяржаўнае будаўніцтва ва ўмовах рэвалюцыйнага працэсу (1918–1919)», з якім выступіў дэкан факультэта філасофіі і сацыяльных навук БДУ, кандыдат гістарычных навук, дацэнт В. Ф. Гігін. У першай частцы свайго выступлення дакладчык звярнуўся да характарыстыкі асноўных этапаў і кірункаў развіцця беларускага нацыянальнага руху ў канцы XIX – пачатку XX ст., змен у настроі яго ўдзельнікаў на працягу акрэсленага перыяду. Вадзім Францавіч засяродзіў увагу аўдыторыі і на геапалітычных умовах, у якіх адбывалася фарміраванне беларускай дзяржаўнасці, ахарактарызаваўшы іх як «неадназначныя». На думку дакладчыка, традыцыі беларускай нацыянальна-культурнай справы пад уздзеяннем пераўтварэнняў, якія былі прыўнесены Кастрычніцкай рэвалюцыяй, і геапалітычных зрухаў пачатку XX ст. далі магчымасць займець беларусам уласную дзяржаўнасць у межах БССР.

У працяг паднятай тэмы прагучаў пленарны даклад дырэктара Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, кандыдата гістарычных навук, дацэнта В. В. Даніловіча «Моладзь у нацыянальна-дзяржаўным будаўніцтве БССР у 1920-я гг.», у якім было адзначана, што далейшае паспяховае вырашэнне пытанняў нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва ў БССР залежала ад цэлага шэрагу ўмоў і фактараў, найважнейшым з якіх з'яўлялася забеспячэнне падтрымкі савецкай улады рознымі пластамі насельніцтва, асабліва моладдзю. Вячаслаў Віктаравіч звярнуў увагу на той факт, што ўрадам БССР важная роля ў органах улады і кіравання рэспублікай адводзілася камсамолу, які быў створаны ў якасці апоры і сродку распаўсюджвання ўплыву новай бальшавіцкай улады ў маладзёжным асяроддзі. Аднак, па меркаванні дакладчыка, нягледзячы на значныя высілкі з боку прадстаўнікоў савецкай улады, рост грамадска-палітычнай актыўнасці юнакоў і дзяўчат БССР на працягу 1920-х гг. быў нестабільны.

Прарэктар па вучэбнай рабоце і інтэрнацыяналізацыі адукацыі БДУ доктар гістарычных навук С. М. Ходзін у дакладзе «Прынцып працы ў беларускай нацыянальнай ідэі» прадэманстраваў, што базісным элементам разумення справядлівасці ў беларускага сялянства ў 1920–30-я гг. з'яўлялася праца. Праз стаўленне да працы, на думку дакладчыка, фарміравалася разуменне ўласнасці, перш за ўсё – уласнасці на зямлю, а таксама сацыяльны статус чалавека. Гэты прынцып знайшоў адлюстраванне ў працэсах вядзення калектыўнай гаспадаркі беларускімі сялянамі ў 1930-я гг. У дадатак да гэтага Сяргей Мікалаевіч здолеў паказаць, у якой ступені ўрадам беларускай савецкай дзяржавы былі ўлічаны асаблівасці і традыцыі ў аграрным сектары, якія фарміраваліся стагоддзямі і характарызавалі беларускую нацыю ў папярэдні перыяд.

Пленарную частку канферэнцыі завяршыў даклад загадчыка кафедры міжнародных адносін БДУ

доктара гістарычных навук, прафесара М. Э. Часноўскага «Гісторыя Беларусі савецкай і сучаснай эпох у дысертацыйным адлюстраванні 2010-х гг.». Мечыслаў Эдвардавіч звярнуў увагу на той факт, што ў дысертацыйных даследаваннях апошніх гадоў на тэарэтыка-канцэптуальным узроўні яскрава адлюстравана пераасэнсаванне ходу гістарычных падзей і іх ацэнак. Па меркаванні дакладчыка, бясспрэчным дасягненнем гістарычнай навукі апошніх гадоў з’явілася канцэптуальнае асэнсаванне сутнасці і ролі мадэрнізацыйных працэсаў у эканамічнай, грамадска-палітычнай, сацыяльнай сферах жыцця Беларусі. Акрамя таго, адбылося важкае прырашчэнне навуковых ведаў пра міжнародную дзейнасць і знешнюю палітыку Рэспублікі Беларусь, светапоглядныя ацэнкі дзеянняў беларусаў у розных абставінах.

Пасля перапынку праца канферэнцыі працягвалася на секцыях, дзе былі агучаны даклады большай часткі ўдзельнікаў. Пераважная большасць секцыйных пасяджэнняў прайшла на базе гістарычнага факультэта БДУ.

На секцыі «Дзяржаваўтваральныя працэсы на тэрыторыі Беларусі ў пачатку ХХ ст.» даклады ўдзельнікаў былі прысвечаны сацыяльным перадумовам станаўлення беларускай дзяржаўнасці, што выяўлялася ў змене становішча разнастайных катэгорый насельніцтва ў гэты час. Былі ўзняты пытанні, якія датычыліся палітыкі ўлад розных узроўняў і яе скіраванасці, спроб дзяржаўнага самавызначэння Беларусі напярэдадні і падчас рэвалюцыйных узрушэнняў 1917 г. Секцыя «Улада і грамадства БССР» аб’яднала навукоўцаў, якія падчас выступлення звярнуліся да асаблівасцей сацыяльна-эканамічнага, культурнага і духоўнага жыцця ў БССР. Удзельнікі секцыі «БССР ва ўмовах геапалітычных зрухаў і міжнародных выклікаў» акрэслілі пытанні нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва БССР, адметнасці развіцця Беларусі ў гады ваеннага ліхалецця і пасляваеннага зацішша, асноўныя кірункі дзейнасці БССР на міжнароднай арэне. Паведамленні ўдзельнікаў секцыі «Абвяшчэнне незалежнасці і станаўленне прэзідэнцкай палітычнай сістэмы ў Рэспубліцы Беларусь» былі прысвечаны асэнсаванню падзей, якія разгортваліся на тэрыторыі Беларусі пасля набыцця ёй незалежнасці. На секцыі «Геапалітычны патэнцыял Рэспублікі Беларусь ва ўмовах інтэграцыйных і глабалізацыйных працэсаў сучаснасці» прагучалі даклады, у якіх закраналіся пытанні пашырэння знешнепалітычнага патэнцыялу рэспублікі, яе ўзаемадзеяння з разнастайнымі інтэграцыйнымі блокамі, прагучалі ацэнкі геапалітычнай магутнасці дзяржавы. Секцыя «Геапалітычныя трансфармацыі ў Цэнтральнай і Усходняй Еўропе ў ХХ ст.» аб’яднала даследчыкаў, якія звярталіся да больш шырокай праблематыкі, звязанай з нацыянальна-дзяржаўным будаўніцтвам у цэнтральна- і ўсходнееўрапейскім рэгіёне. Секцыя «Прававыя аспекты дзяржаваўтваральных працэсаў на тэрыторыі Беларусі ў ХХ ст.» прайшла на базе юрыдычнага факультэта. Яе ўдзельнікі звярнуліся да прававога аспекту станаўлення беларускай дзяржаўнасці ў ХХ ст.

Далейшая праца канферэнцыі працягвалася 30 лістапада 2018 г. на базе гістарычнага факультэта БДУ ў фармаце навуковага круглага стала «Моладзь у дзяржаваўтваральных працэсах на тэрыторыі Беларусі ў ХХ ст.», мадэратарамі якога выступілі дэкан гістарычнага факультэта БДУ прафесар А. Г. Каханоўскі і дэкан факультэта філасофіі і сацыяльных навук БДУ дацэнт В. Ф. Гігін. Акрамя прафесарска-выкладчыцкага складу, аспірантаў і студэнтаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, у працы круглага стала прынялі ўдзел першы сакратар Мінскага гарадскога камітэта ГА «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі» С. М. Клішэвіч, начальнік аддзела маладзёжнай палітыкі і маніторынгу інфармацыйнай прасторы Упраўлення выхаваўчай работы з моладдзю БДУ Д. В. Лебедзь, начальнік аддзела аналітыкі і прагназавання БДУ Я. А. Харук. Падчас абмеркавання была паказана роля моладзі і моладзевых арганізацый у дзяржаваўтваральных працэсах на тэрыторыі Беларусі ў савецкі час, а таксама выяўлены патэнцыял моладзі на сучасным этапе развіцця краіны.

Напрыканцы мерапрыемства былі падведзены вынікі канферэнцыі. Кіраўнікі секцый адзначылі высокі навуковы ўзровень падрыхтоўкі ўдзельнікаў і плённы працэс абмеркавання прадстаўленых дакладаў. Праца Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Фарміраванне беларускай дзяржаўнасці ва ўмовах геапалітычных зрухаў ХХ ст.» суправаджалася канструктыўным абменам вопытам і дасягненнямі навукова-даследчай працы паміж беларускімі і замежнымі навукоўцамі. Па выніках канферэнцыі падрыхтаваны і апублікаваны навуковы зборнік артыкулаў, які ў далейшым будзе размешчаны ў электроннай бібліятэцы БДУ.

***А. В. Бурачонак***[1]

[1]*Александр Вячеславович Бурачонок* – кандидат исторических наук, доцент; доцент кафедры истории Беларуси нового и новейшего времени исторического факультета Белорусского государственного университета.

*Аляксандр Вячаслававіч Бурачонак* – кандыдат гістарычных навук, дацэнт; дацэнт кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Aliaksandr V. Burachonak*, PhD (history), docent; associate professor at the department of modern and contemporary history of Belarus, faculty of history, Belarusian State University.

E-mail: *burumag@gmail.com*

# МЕЖДУНАРОДНАЯ НАУЧНАЯ КОНФЕРЕНЦИЯ «ЭТНОКУЛЬТУРНЫЕ ПРОЦЕССЫ НА ТЕРРИТОРИИ БЕЛАРУСИ В I – НАЧАЛЕ II ТЫСЯЧЕЛЕТИЯ Н. Э.», ПОСВЯЩЕННАЯ 90-ЛЕТИЮ ПРОФЕССОРА Э. М. ЗАГОРУЛЬСКОГО

# МІЖНАРОДНАЯ НАВУКОВАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ «ЭТНАКУЛЬТУРНЫЯ ПРАЦЭСЫ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў I – ПАЧАТКУ II ТЫСЯЧАГОДДЗЯ Н. Э.», ПРЫСВЕЧАНАЯ 90-ГОДДЗЮ ПРАФЕСАРА Э. М. ЗАГАРУЛЬСКАГА

# INTERNATIONAL SCIENTIFIC CONFERENCE «ETHNOCULTURAL PROCESSES ON THE TERRITORY OF BELARUS IN THE I – THE BEGINNING OF THE II MILLENNIUM AD» DEDICATED TO THE 90th ANNIVERSARY OF THE PROFESSOR E. M. ZAGORULSKY

У снежні 2018 г. на гістарычным факультэце БДУ адбылася Міжнародная навуковая канферэнцыя «Этнакультурныя працэсы на тэрыторыі Беларусі ў I – пачатку II тысячагоддзя н. э.», якая была прысвечана 90-годдзю выбітнага беларускага археолага прафесара Э. М. Загарульскага.

Эдуард Міхайлавіч Загарульскі нарадзіўся 18 снежня 1928 г. у г. Тула. У 1953 г. ён скончыў гістарычны факультэт Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя М. В. Ламаносава. Але большая частка яго жыцця звязана з Беларуссю і перадусім з Беларускім дзяржаўным універсітэтам. Пасля заканчэння аспірантуры Інстытута гісторыі АН БССР (1957) і некалькіх год працы ў гэтай установе Э. М. Загарульскі перайшоў на гістарычны факультэт БДУ, на якім ён працаваў больш за 50 год і прайшоў шлях ад выкладчыка да прафесара і дэкана. Адным з галоўных дасягненняў Эдуарда Міхайлавіча стала стварэнне ў 1973 г. кафедры археалогіі, этнаграфіі і дапаможных гістарычных дысцыплін.

У працы канферэнцыі «Этнакультурныя працэсы на тэрыторыі Беларусі ў I – пачатку II тысячагоддзя н. э.» прынялі ўдзел 39 даследчыкаў, у тым ліку 14 прадстаўнікоў замежных краін: Расіі, Швецыі і Украіны. Прадстаўленыя ўдзельнікамі матэрыялы былі апублікаваны ў зборніку «Этнокультурные процессы на территории Беларуси в I – начале II тысячелетия н. э.», выдадзеным перад пачаткам мерапрыемства.

Пленарнае пасяджэнне канферэнцыі распачаў прарэктар БДУ па вучэбнай рабоце і інтэрнацыяналізацыі адукацыі С. М. Ходзін. Затым з прывітальнымі словамі выступілі дэкан гістарычнага факультэта А. Г. Каханоўскі і загадчык кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін А. А. Егарэйчанка. Усе выступоўцы адзначылі ўплыў Э. М. Загарульскага як Настаўніка на значную частку сучасных беларускіх гісторыкаў. Эдуарду Міхайлавічу сапраўды ўдзячныя шмат пакаленняў выпускнікоў. Таксама былі выказаны пажаданні паспяховай працы ўдзельнікам канферэнцыі.

Серыю дакладаў, якія былі зачытаны на пленарным пасяджэнні, распачало сумеснае выступленне дацэнта кафедры крыніцазнаўства гістарычнага факультэта БДУ В. Л. Ліпніцкай і старшага навуковага супрацоўніка Інстытута гісторыі НАН Беларусі В. У. Мядзведзевай «Летопись жизни, научной и педагогической деятельности Э. М. Загорульского». У дакладзе былі акрэслены асноўныя вехі навуковага і педагагічнага жыцця юбіляра.

Наступны даклад «Ранние славяне центральной и северной Беларуси по археологическим данным» быў прадстаўлены загадчыкам Цэнтра археалогіі і старажытнай гісторыі Беларусі Інстытута гісторыі НАН Беларусі В. М. Ляўко. У ім былі абагульнены вынікі апошніх даследаванняў помнікаў сярэдзіны – другой паловы I тысячагоддзя н. э. на тэрыторыі цэнтральнай і паўночнай Беларусі. Даклад выклікаў ажыўленае абмеркаванне сярод удзельнікаў канферэнцыі.

Выступленне вядучага навуковага супрацоўніка Інстытута гісторыі НАН Беларусі В. І. Шадыры было прысвечана этнакультурнай сітуацыі на поўначы Беларусі напярэдадні ўтварэння Полацкай дзяржавы. Даследчык звярнуў увагу на лінгва-археалагічны аспект праблемы і прыйшоў да высновы, што ў разглядаемы перыяд тут была зона ўзаемадзеяння балцкага і славянскага насельніцтва.

Завяршыў пленарнае пасяджэнне галоўны навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі НАН Беларусі П. Ф. Лысенка, які выступіў з дакладам «"Берестье" – жемчужина средневековой археологии. К 1000-летию первого упоминания». Дакладчык агучыў гісторыю адкрыцця старажытнарускага Берасця і стварэння на гэтым месцы ўнікальнага музея сярэдневяковага горада.

Адным з кірункаў навуковых даследаванняў Э. М. Загарульскага было вывучэнне помнікаў пер-



шай паловы I тысячагоддзя н. э. Ім праводзіліся раскопкі на гарадзішчах Малышкі і Кісцяні, матэрыялы з якіх сталі эталоннымі для дзвюх археалагічных культур: культуры позняй штрыхаванай керамікі і чачэрскай групы зарубінецкай культуры (так званыя помнікі тыпу Чачэрск – Кісцяні) адпаведна.

Вывучэнню старажытнасцей дадзенай эпохі было прысвечана некалькі паведамленняў беларускіх і расійскіх даследчыкаў, што прагучалі на дзённым пасяджэнні. Так, дацэнт кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін гістарычнага факультэта БДУ В. Г. Белявец распавёў пра распаўсюджанне на тэрыторыі Беларусі фібул тыпу Грудэк-47, якія разглядаюцца аўтарам як індыкатар верхняй храналагічнай мяжы вельбарскай археалагічнай культуры. Гэта культура, якая атаясамліваецца з готамі, магла праіснаваць тут, на думку В. Г. Беляўца, да сярэдзіны V ст.

Паведамленне навуковага супрацоўніка Інстытута археалогіі РАН А. А. Радзюша было прысвечана знаходцы на тэрыторыі Віцебскай вобласці фібулы рэдкага тыпу, якая спалучае ў сабе рысы так званых двухпласцінкавых фібул і вырабаў з выемкавымі эмалямі і датуецца канцом IV – пачаткам V ст. Гэта знаходка з'яўляецца ўнікальнай не толькі для Беларусі, але і для ўсяго шырокага – ад Прыбалтыкі да Дона – арэала варварскіх выемкавых эмаляў.

У выступленні загадчыка вучэбнай лабараторыі музейнай справы гістарычнага факультэта БДУ В. М. Сідаровіча прагучала інфармацыя пра знаходкі медных і бронзавых манет Рымскай імперыі на тэрыторыі Беларусі. Дакладчыкам разгледжаны асаблівасці іх размеркавання ў розных частках краіны і выказана думка аб іх максімальнай распаўсюджанасці ў рэгіёнах з найбольшай канцэнтрацыяй вырабаў з выемкавымі эмалямі, што пацвярджае актыўнае выкарыстанне рымскай манетнай медзі ў якасці сыравіны для бронзаліцейнай вытворчасці.

Кераміка з археалагічнага комплексу Тайманава Быхаўскага раёна Магілёўскай вобласці быў грунтоўна разгледжаны ў выступленні старшага навуковага супрацоўніка Інстытута гісторыі НАН Беларусі Н. М. Дубіцкай. Даследчыкам былі вылучаны асноўныя тыпы посуду, выяўленага падчас шматгадовага даследавання помнікаў.

Наступная група дакладаў датычылася эпохі Вялікага перасялення народаў. Сярод іх вялікую цікавасць выклікалі паведамленні аб даследаваннях помнікаў першай, безумоўна славянскай, археалагічнай культуры – пражскай. Так, кандыдат гістарычных навук В. С. Вяргей прадставіла матэрыялы першай паловы I тысячагоддзя н. э. з селішча Петрыкаў-2 у Гомельскай вобласці, а навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі НАН Беларусі Г. М. Бяліцкая распавяла пра пахаванне раннепражскай культуры каля в. Малы Малешаў Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці.

Вялікую зацікаўленасць выклікалі даклады расійскіх археолагаў. Вучоны сакратар музея «Кулікова поле» А. М. Варанцоў і загадчык аддзела музея «Кулікова поле» Я. В. Сталяроў паведамілі аб групе селішчаў у басейне р. Акі, што належаць да мошчынскай культуры, якая атаясамліваецца з балтамі. Падчас апошніх даследаванняў былі выяўлены шматлікія знаходкі, якія сведчаць пра актыўныя кантакты мясцовага насельніцтва з усходнімі германцамі (готамі). Загадчык аддзела Інстытута археалогіі РАН А. М. Абломскі распавёў пра характэрныя рысы нядаўна вылучанай ім верхневаронежскай культурнай групы, якой уласцівая поліэтнічнасць з перавагай славянскіх і ўсходнефінскіх кампанентаў.




Асноўным кірункам навуковых даследаванняў Э. М. Загарульскага было і застаецца вывучэнне сярэднявечных старажытнасцей Беларусі. Адным з найцікавейшых помнікаў гэтага перыяду з'яўляецца археалагічны комплекс на р. Менцы. Нягледзячы на шматгадовыя даследаванні, дагэтуль застаецца нявырашаным пытанне аб яго структуры, у якую, апрача двух гарадзішчаў, уваходзілі селішчы і курганныя могільнікі. Менавіта гэтаму пытанню было прысвечана паведамленне загадчыка аддзела Інстытута гісторыі НАН Беларусі А. В. Вайцяховіча, які паспрабаваў вызначыць межы і прыкладную плошчу сельскіх паселішчаў, а таксама іх храналогію.

Большасць дакладаў, прысвечаных сярэднявяковай тэматыцы, былі прадстаўлены на ранішнім пасяджэнні другога дня канферэнцыі, якое распачало выступленне супрацоўніка Інстытута гісторыі НАН Беларусі А. Ф. Касюк «Славянскія старажытнасці VIII–X стст. на тэрыторыі Беларускага Палесся». Асаблівая ўвага была нададзена гісторыі вывучэння помнікаў, размешчаных у ваколіцах в. Снядзін Петрыкаўскага раёна Гомельскай вобласці. Менавіта тут найбольш поўна прадстаўлены матэрыялы славянскіх культур другой паловы I тысячагоддзя н. э. на ўсходнім Палессі. Праведзеныя даследаванні пакуль адносна невялікія, але вывучэнне названых помнікаў мае значныя перспектывы.

У дакладзе старшага навуковага супрацоўніка Інстытута гісторыі НАН Беларусі А. В. Іова «Особенности этнической структуры населения раннегородских центров Южной Беларуси в X – начале XI в.» разглядаліся матэрыялы двух помнікаў на тэрыторыі беларускага Палесся: археалагічных комплексаў каля в. Гарадзішча Пінскага раёна Брэсцкай вобласці і в. Юравічы Калінкавіцкага раёна Гомельскай вобласці. Аб асаблівасцях этнічнай структуры жыхароў разглядаемых паселішчаў сведчыць надзвычай разнастайны набор археалагічных знаходак, якія могуць звязвацца як з усходнеславянскімі плямёнамі, так і са скандынаўскім, заходнеславянскім і стэпавым насельніцтвам. Даклад А. В. Іова выклікаў вялікую цікавасць і ажыўленае абмеркаванне сярод удзельнікаў канферэнцыі.

Выступленне прадстаўнікоў Бранскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя акадэміка І. Г. Пятроўскага «Ландшафтный фактор в славянском освоении Среднего и Верхнего Подесенья в IX–XI вв.» В. М. Гур'янава (кіраўнік аддзела навуковых даследаванняў) і А. А. Чубура (дырэктар навукова-даследчага цэнтра комплекснага вывучэння Сярэднедзяснінскага рэгіёна) быў прысвечаны першым спробам суаднесці ландшафт рэгіёна з размяшчэннем у ім славянскіх археалагічных помнікаў. Выступоўцы падкрэслілі, што рассяленне асобных груп насельніцтва было звязана з пэўным тыпам ландшафту, а існаванне незаселеных тэрыторый унутры арэала можа тлумачыцца наяўнасцю непрыдатнага для гаспадарчай дзейнасці асяроддзя.

Вельмі грунтоўны даклад, прысвечаны планіроўцы і забудове сярэдневяковых гарадоў на тэрыторыі Беларусі (на матэрыялах Віцебска і Слуцка), агучыў старшы навуковы супрацоўнік Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі Л. У. Калядзінскі. Былі разгледжаны розныя тыпы жылых і гаспадарчых пабудоў, выкананыя ў розных тэхніках домабудаўніцтва. Надавалася ўвага і асобным канструкцыйным элементам забудовы, спосабам іх мацавання. Было заўважана, што большасць будаўнічых прыёмаў XII – пачатку XIV ст. была характэрна для ўсіх усходнеславянскіх гарадоў. Пры гэтым для Верхняга замка Віцебска гэтага перыяду адзначаецца падабенства з будаўнічымі традыцыямі паўночнарускага драўлянага дойлідства, а для Верхняга замка Слуцка – з будаўнічымі традыцыямі гарадоў Тураўскай зямлі. У пазнейшы час гарадская

забудова ўжо адпавядае традыцыям беларускага народнага дойлідства.

Яшчэ адзін даклад, агучаны Л. У. Калядзінскім, – «Колты XII в. из раскопок детинца летописного Слуцка» – быў падрыхтаваны ім сумесна з вядучым навуковым супрацоўнікам Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея Н. А. Пачобут. Аўтарамі разглядаліся знаходкі трох колтаў, выяўленых у 2016 г. у ходзе даследаванняў майстэрні ювеліра на дзядзінцы старажытнага Слуцка. Упрыгажэнні былі выкананы ў імітацыйных формах. Пры гэтым матрыцы для такіх форм таксама былі знойдзены тут. Такія знаходкі з'яўляюцца дастаткова рэдкімі сярод беларускіх матэрыялаў і ўяўляюць значную цікавасць.

Вельмі актуальнай для ўсходнееўрапейскай археалогіі праблеме – вылучэнню комплексаў рэчаў, характэрных для XVI ст., і вызначэнню на іх падставе мікрахраналогіі перыяду – быў прысвечаны даклад старшага навуковага супрацоўніка Інстытута гісторыі НАН Беларусі М. В. Клімава «Праблема храналагічнай стратыфікацыі XVI ст. (па матэрыялах з Полацкага Падзвіння)». Артэфакты з розных матэрыялаў разглядаліся па чатырох храналагічных групах. Было ўсталявана, што на сёння на падставе іх храналогіі немагчыма вызначыць мікраперыяды для XVI ст. Такая сітуацыя ўскладняецца тым, што выяўлена і апублікавана вельмі мала закрытых комплексаў, характэрных для гэтага перыяду, а таксама тым, што значная частка рэчаў магла быць ва ўжытку доўгі час пасля вырабу.

Даклад навуковага супрацоўніка Інстытута гісторыі НАН Беларусі, дацэнта кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін П. С. Курловіч і аспіранта кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін БДУ А. В. Зыль «Гутныя шкляныя вырабы з Копысі (па матэрыялах раскопак Э. М. Загарульскага ў 1972 г.)» быў прысвечаны характарыстыцы прадметаў са шкла другой паловы XVI – пачатку XIX ст. Найбольшую цікавасць сярод прадстаўленых рэчаў уяўляюць знаходкі цэлых вырабаў са шкла, вырабаў з распісным і гравіраваным дэкорам, шкляных пацерак, а таксама фрагментаў полых шкляных шарыкаў і шкляных стужак, якія могуць быць звязаны з наяўнасцю вытворчасці вырабаў са шкла ў XVII–XVIII стст. у Копысі

Завяршыў ранішняе пасяджэнне даклад прафесара Э. М. Загарульскага «Другого Минска не было», які выклікаў сапраўдную цікавасць сярод удзельнікаў і слухачоў канферэнцыі. Дакладчык прапанаваў завяршыць усе дыскусіі адносна першапачатковага месцазнаходжання старажытнага Мінска. Ён прывёў грунтоўныя аргументы на карысць таго, што горад быў заснаваны на тэрыторыі Замчышча – у месцы ўпадзення р. Нямігі ў р. Свіслач.

Пасля выступлення Э. М. Загарульскага былі падведзены вынікі працы канферэнцыі. Заключнае слова ўзяў дэкан гістарычнага факультэта БДУ А. Г. Каханоўскі. Ён падзякаваў усім дакладчыкам за цікавыя выступленні і плённыя дыскусіі, а таксама пажадаў ім поспехаў у працы. Напрыканцы мерапрыемства ўдзельнікаў канферэнцыі чакала этнаграфічна-археалагічная экскурсія.

Такім чынам, можна канстатаваць, што Міжнародная навуковая канферэнцыя «Этнакультурныя працэсы на тэрыторыі Беларусі ў I – пачатку II тысячагоддзя н. э.» прайшла на высокім прафесійным узроўні. Шырокае геаграфічнае прадстаўніцтва ўдзельнікаў, разнастайная тэматыка і навуковая значнасць іх паведамленняў, а таксама вострыя дыскусіі падчас пасяджэнняў дазваляюць спадзявацца, што правядзенне археалагічных канферэнцый на гістарычным факультэце БДУ стане добрай традыцыяй і дазволіць універсітэту стаць адным з асноўных цэнтраў беларускай археалагічнай думкі.

***П. С. Курловіч***[1],
***В. М. Сідаровіч***[2]

[1]*Полина Сергеевна Курлович* – доцент кафедры археологии и специальных исторических дисциплин исторического факультета Белорусского государственного университета.

*Паліна Сяргееўна Курловіч* – дацэнт кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Palina S. Kurlovich*, associate professor at the department of archaeology and special historical disciplines, faculty of history, Belarusian State University.

E-mail: *nominusster@gmail.com*

[2]*Виталий Михайлович Сидорович* – заведующий учебной лабораторией музейного дела исторического факультета Белорусского государственного университета.

*Віталь Міхайлавіч Сідаровіч* – загадчык вучэбнай лабараторыі музейнай справы гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Vital M. Sidarovich*, head of the laboratory of museology, faculty of history, Belarusian State University.

E-mail: *wital.sidarowicz@gmail.com*

# Юбилеи

# Юбілеі

# Jubilees

## Эдуард Михайлович ЗАГОРУЛЬСКИЙ

## Эдуард Міхайлавіч ЗАГАРУЛЬСКІ

## Eduard Mihailavich ZAGORULSKY



Выдающемуся белорусскому археологу и историку, доктору исторических наук, профессору Эдуарду Михайловичу Загорульскому 18 декабря 2018 г. исполнилось 90 лет, его имя широко известно не только в Беларуси, но и далеко за ее пределами.

Эдуард Михайлович Загорульский родился 18 декабря 1928 г. в г. Туле в семье кадрового офицера Рабоче-крестьянской Красной армии. После окончания средней школы он поступил на исторический факультет Московского государственного университета имени М. В. Ломоносова (МГУ). Именно там под влиянием ведущих ученых А. В. Арциховского и Б. А. Рыбакова у будущего ученого проявился интерес к археологии, которой Э. М. Загорульский остается верен до сих пор. Окончив МГУ в 1953 г., он переезжает в г. Минск, где в 1954–1957 гг. продолжает обучение в аспирантуре Института истории Академии наук БССР. В последующие годы молодой исследователь работает младшим научным сотрудником сектора археологии, ведет активную полевую и исследовательскую работу, завершившуюся защитой кандидатской диссертации в 1963 г.

В 1962 г. Э. М. Загорульский начинает преподавательскую работу в БГУ. В 1973 г. по инициативе Эдуарда Михайловича на историческом факультете была открыта кафедра археологии, этнографии и вспомогательных исторических дисциплин, которую исследователь возглавлял 24 года. С 1986 по 1991 г. Э. М. Загорульский являлся деканом исторического факультета БГУ.

Становление Э. М. Загорульского как ученого относится к годам его аспирантской юности, когда исследователю было поручено продолжить археологическое изучение Минска, начатое В. Р. Тарасенко. Активные полевые исследования города велись на протяжении четырех лет (1958–1961) и дали бле-

стящие научные результаты, которые были обобщены сначала в кандидатской диссертации Эдуарда Михайловича, а потом в научно-популярной книге «Древний Минск» (1963). Однако эта тема продолжала интересовать исследователя. После дополнительных полевых и теоретических изысканий был издан капитальный труд «Возникновение Минска» (1982). Опираясь на археологические и исторические данные, Э. М. Загорульский аргументированно отстаивает идею о возникновении Минска на Свислочи, а не на Менке. Им убедительно пересмотрены основные положения В. Р. Тарасенко о путях возникновения города и его первоначальной территории. Как показал Э. М. Загорульский, возникновение Минска связано с крепостью, а детинец занимал значительно бóльшую территорию по сравнению с той, что отводил ему В. Р. Тарасенко. Монография «Возникновение Минска» до сих пор остается одним из лучших образцов источниковедческого анализа древнерусского города.

Начиная с конца 1960-х гг. в сферу научных интересов исследователя активно входит одна из важнейших тем отечественной археологической науки – проблема происхождения славян и их ранняя история. Точкой отсчета славянского этногенеза Э. М. Загорульский считает культуру шаровидных амфор – одну из самых ярких культур Центральной Европы эпохи ранней бронзы. Касаясь более позднего славянского расселения, он полагает, что колонизация славянами территории Беларуси происходила медленно и окончательно завершилась только к концу 1-го тысячелетия н. э. Узловые моменты этой концепции были изложены ученым в монографии «Древняя история Белоруссии. Очерк этнической истории и материальной культуры до IX в.» (1977), докторской диссертации, защищенной в МГУ в 1984 г., в монографиях «Славяне: происхождение и расселение на территории Беларуси» (2013) и «Белая Русь с середины 1-го тысячелетия до середины XIII века» (2013 г., переиздана с дополнениями в 2014 г.) и в ряде статей. В монографии «Славяне: происхождение и расселение на территории Беларуси», комплексно проанализировав письменные археологические, этнографические и антропологические источники, Э. М. Загорульский охарактеризовал основные этапы этнической истории славян, время и направления их миграций. Исследователь был и остается сторонником существования древнерусской народности, являвшейся основой формирования белорусской, русской и украинской наций.

В монографии «Белая Русь с середины I тысячелетия до середины XIII века» дана характеристика этнической истории с момента появления восточных славян вплоть до татаро-монгольского нашествия. В ней анализируются такие сложные проблемы, как формирование языка местного населения, этничного самосознания, культурной самоидентификации. Много внимания в работе уделено экономической и духовной жизни населения белорусских земель. Фундаментальные труды Э. М. Загорульского не только имеют важное научное значение, но и служат целям патриотического и духовного воспитания граждан Беларуси.

Предметом научных изысканий исследователя остаются древние города на территории Беларуси: материальная культура, быт и занятия горожан, происхождение городов.

Разработка теоретических положений и конкретных научных выводов Э. М. Загорульского во многом базируется на результатах его полевых изысканий, которыми он занимался более 30 лет. Под руководством ученого были осуществлены самые крупные на территории Беларуси раскопки раннесредневекового города Минска. Много лет Э. М. Загорульский посвятил исследованию поднепровских городов и замков (Городища, Копыси, Свислочи, Стрешина, Рогачева и др.). Среди этих работ особого внимания заслуживают раскопки Вищинского замка XII–XIII вв., которые велись на протяжении 1976–1985 гг. В ходе этих полевых исследований стало возможным охарактеризовать оборонительные сооружения, их планировку и застройку, а также материальную культуру обитателей замка. Сенсационным открытием стало обнаружение уникального по своему составу и научной значимости денежно-вещевого клада, в состав которого входили высокохудожественные серебряные украшения древнерусской поры и платежные слитки-гривны различных типов. Итоги кропотливой работы были подведены в монографии «Вищинский замок» (2004). Одновременно с изучением городских поселений Э. М. Загорульский ведет раскопки погребальных памятников восточных славян – курганов в Заславле, Новосадах, Сеннице и других местах. В связи с разработкой этнических процессов исследователь много внимания уделял и изучению более ранних памятников. Им были проведены раскопки городищ железного века (Городища Мядельского района, Кистени и Малышки). Э. М. Загорульский – признанный полевой исследователь, которому всегда был характерен новаторский подход. В его экспедициях прошли полевую практику многие археологи Беларуси, составляющие сегодня ядро национальных кадров.

Особого внимания заслуживает научно-педагогическая деятельность ученого. Его всегда отличали строго выверенные и в то же время яркие по мастерству изложения лекции, которые всегда сопровождались слайдами, а позднее и видеофильмами, подготовленными им самим. Раскрывая эту сторону работы, почти всегда хочется добавить слово «впервые». Задолго до перехода на новую систему подготовки специалистов Э. М. Загорульский уже применял модульно-рейтинговую систему. На историческом факультете он ввел

в практику тестирование студентов сначала на машинах КИСИ-5, а позже и на компьютерах. Э. М. Загорульский – автор первого и пока единственного учебника по археологии «Археология Белоруссии» (1965). По его инициативе и при непосредственном участии сотрудниками кафедры археологии, этнографии и вспомогательных исторических дисциплин был создан учебник «Историческое краеведение Белоруссии» (1980). Существенным подспорьем для студентов исторических факультетов стало учебное пособие «Заходняя Русь IX–XIII стст.» (1998).

Много внимания юбиляр уделяет подготовке учебников для средней школы. Он был одним из авторов учебника «История БССР» (1984). В последние годы им лично написаны школьные учебники по истории Беларуси для четвертых (2001), пятых (1998) и шестых (1999) классов. Для всех интересующихся историей страны Э. М. Загорульский издал «Историю Беларуси в кратком изложении» (2002). Нельзя не отметить участие ученого в подготовке ряда обобщающих трудов: «Гісторыя Беларускай ССР» (1972) и «Гісторыя сялянства Беларусі» (1997). Всего им опубликовано 10 авторских монографий и брошюр и более 100 статей.

Эдуард Михайлович Загарульский является членом Белорусской академии образования (с 1996 г.). Он награжден нагрудным знаком Министерства высшего и среднего специального образования СССР «За отличные успехи в работе», Почетной грамотой Президиума Верховного Совета БССР, Почетной грамотой Национального собрания Республики Беларусь, а также многочисленными грамотами Министерства образования Республики Беларусь и ректората БГУ. В 1996 г. ему было присвоено почетное звание «Заслуженный работник образования Республики Беларусь».

Друзья и коллеги искренне поздравляют юбиляра, желают ему крепкого здоровья и новых публикаций.

***А. А. Егорейченко***[1]

[1]*Александр Андреевич Егорейченко* – доктор исторических наук, профессор; заведующий кафедрой археологии и специальных исторических дисциплин исторического факультета Белорусского государственного университета.

*Аляксандр Андрэевіч Егарэйчанка* – доктар гістарычных навук, прафесар; загадчык кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Alexander A. Yegoreichenko*, doctor of science (history), full professor; head of the department of archeology and special historical disciplines, faculty of history, Belarusian State University.

E-mail: *yegor_alex@mail.ru*

# АННОТАЦИИ ДЕПОНИРОВАННЫХ В БГУ РАБОТ

# АНАТАЦЫІ ДЭПАНІРАВАНЫХ У БДУ ПРАЦ

# INDICATIVE ABSTRACTS OF THE PAPERS DEPOSITED IN THE BSU

*УДК 94(476)«…/13»(075.8)*
*Падалінскі У. А.* **Гісторыя Беларусі ад старажытнасці да канца XIV ст.** [Электронны рэсурс] : электрон. вучэб.-метад. комплекс для спец. 1-21 03 01 «Гісторыя (па напрамках)», напрамак спец. 1-21 03 01-01 «Гісторыя (айчынная і ўсеагульная)» / У. А. Падалінскі ; БДУ. Электрон. тэкставыя дан. Мінск : БДУ, 2018. 55 с. Бібліягр.: с. 52–55. Рэжым доступу: http://elib.bsu.by/handle/123456789/209555. Загал. з экрана. Дэп. 27.11.2018, № 009827112018.

Электронны вучэбна-метадычны комплекс распрацаваны для падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй першай ступені навучання і прызначаны для студэнтаў гістарычнага факультэта БДУ, якія атрымліваюць адукацыю па напрамку спецыяльнасці 1-21 03 01-01 «Гісторыя (айчынная і ўсеагульная)». Складаецца з канспекта лекцый, тэм семінарскіх заняткаў і метадычных рэкамендацый па іх правядзенні, прыкладнай тэматыкі рэфератаў і кантрольных пытанняў па курсе, зместу вучэбнай дысцыпліны, спісу рэкамендаванай літаратуры. Матэрыялы, якія ўтрымлівае дадзены вучэбна-метадычны комплекс, павінны садзейнічаць усебаковаму вывучэнню гісторыі Беларусі ад старажытнасці да канца XIV ст.

*УДК 7.03(100)(075.8)*
*Томашева И. Г.* **Всеобщая история искусства** [Электронный ресурс] : электрон. учеб.-метод. комплекс для спец. 1–23 01 12 «Музейное дело и охрана историко-культурного наследия (по направлениям)» / И. Г. Томашева, Н. Я. Трифонова ; БГУ. Электрон. текстовые дан. Минск : БГУ, 2018. 179 с. Библиогр.: с. 177–179. Режим доступа: http://elib.bsu.by/handle/123456789/211524. Загл. с экрана. Деп. 20.12.2018, № 011020122018.

Электронный учебно-методический комплекс (ЭУМК) предназначен для студентов специальности 1–23 01 12 «Музейное дело и охрана историко-культурного наследия (по направлениям)» для дневной и заочной форм обучения. Содержание ЭУМК предполагает изучение следующих вопросов: этапы развития мирового искусства от первобытности до наших дней, основные понятия искусствоведения как научной дисциплины, необходимые для практической деятельности музейного сотрудника и специалиста в области туристической индустрии. В основу курса положено формирование фундаментальных навыков в анализе, атрибуции и интерпретации художественных произведений в историко-культурном контексте их бытования.

*УДК 930.25(1-87)(091)(075.8)*
*Козак К. И.* **Архивы зарубежных стран** [Электронный ресурс] : электрон. учеб.-метод. комплекс для спец.: 1-21 03 01 «Историко-архивоведение» / К. И. Козак ; БГУ. Электрон. текстовые дан. Минск : БГУ, 2018. 83 с. Библиогр.: с. 81–83. Режим доступа: http://elib.bsu.by/handle/123456789/211558. Загл. с экрана. Деп. 21.12.2018, № 011121122018.

Электронный учебно-методический комплекс (ЭУМК) «Архивы зарубежных стран» предназначен для студентов историко-архивного отделения. Он состоит из четырех разделов, в которых излагаются теоретический (краткий конспект лекций по учебной дисциплине «Архивы зарубежных стран») и практиче-

ский (сборники тематики семинарских занятий для дневной и заочной форм получения высшего образования) материалы. В разделе контроля знаний размещены примерные перечни вопросов для дипломных и курсовых проектов, вопросов и заданий для проведения экзамена. Вспомогательный раздел включает в себя список рекомендуемой литературы. Данный ЭУМК отражает содержание учебной программы «Архивы зарубежных стран» и включает в себя комплексные знания по истории и организации архивного дела в зарубежных странах.

*УДК 069.01(075.8)*
*Якубинская А. Д.* **Основы музееведения** [Электронный ресурс] : электрон. учеб.-метод. комплекс для спец. 1-23 01 13 «Историко-архивоведение» / А. Д. Якубинская ; БГУ. Электрон. текстовые дан. Минск : БГУ, 2018. 70 с. : табл. Библиогр.: с. 69–70. Режим доступа: http://elib.bsu.by/handle/123456789/211633. Загл. с экрана. Деп. 26.12.2018, № 011426122018.

Электронный учебно-методический комплекс (ЭУМК) предназначен для студентов специальности 1-23 01 13 «Историко-архивоведение» дневной и заочной форм обучения. Содержание ЭУМК предполагает изучение следующих вопросов: музееведение как научная дисциплина; музей как социокультурный институт; зарождение и развитие музеев в Беларуси и за рубежом; научно-фондовая, экспозиционно-выставочная, научно-исследовательская и образовательная работа музеев; современные музейные технологии. В основу курса положена задача сформировать фундамент знаний по гостиничному делу на основе изучения достижений мировой и отечественной мысли.

*УДК 008:391(075.8)*
*Воробьёва И. В.* **Мода как феномен культуры** [Электронный ресурс] : электрон. учеб.-метод. комплекс для спец. 1-21 04 01 «Культурология (по направлениям)» / И. В. Воробьёва ; БГУ. Электрон. текстовые дан. Минск, 2018. 62 с. : ил. Библиогр.: с. 61–62. Режим доступа: http://elib.bsu.by/handle/123456789/212524. Загл. с экрана. Деп. 11.01.2019, № 000411012019.

Электронный учебно-методический комплекс предназначен для студентов специальности 1-21 04 01 «Культурология (по направлениям)». Он содержит учебный материал по вопросам, связанным с общим понятием моды, в нем рассматриваются основные теоретические вопросы, возникающие при изучении моды как феномена культуры, история развития моды. Может быть использован студентами других специальностей при изучении данной дисциплины.

## СОДЕРЖАНИЕ


От редакции ........ 8

## К СТОЛЕТИЮ СОЗДАНИЯ БГУ

*Латушкин А. Н.* Роль Белорусского государственного университета в процессах возвращения архивного наследия Великого княжества Литовского в 1920-х гг. ........ 10

*Вайтович А. В.* Становление археологического образования на историческом факультете Белорусского государственного университета в 1934–1941 гг. ........ 23

## ИСТОРИЯ БЕЛАРУСИ

*Гущинский И. Г.* Трансформация судебной системы на территории Беларуси (1772–1796) ........ 34

*Воронич Т. В.* Административно-полицейское регулирование проституции в городах Беларуси: вторая половина XIX – начало XX в. ........ 46

*Острога В. М.* Социально-правовое положение учителей средних учебных заведений Беларуси во второй половине XIX – начале XX в. ........ 57

*Ходин С. Н.* Трансформация единоличного крестьянского хозяйства в Беларуси в 1920–30-х гг. ........ 67

## ВСЕМИРНАЯ ИСТОРИЯ

*Махан М. С.* Культовая архитектура города Борсиппы ........ 76

*Папашвили М., Карчава Т., Цитланадзе Т., Квачадзе Б.* Отношения восточных христиан со святым престолом: Лионский собор 1274 г. и Грузия ........ 83

*Давидович А.* Роль христианских ценностей в политической мысли Национальной партии в Польше (1928–1939) ........ 95

## МУЗЕЕВЕДЕНИЕ

*Ананьев В. Г.* К истории музеефикации Исаакиевского собора в конце 1920-х гг. ........ 102

## КРИТИКА И БИБЛИОГРАФИЯ

*Голубович В. В.* Metryka Litewska. Rejestry podymnego Wielkiego Księstwa Litewskiego. Województwo połockie 1667 i 1690 r. Opracowali Henryk Lulewicz i Andrzej Rachuba [Литовская метрика. Реестры подымного налога в Великом княжестве Литовском. Полоцкое воеводство 1667 и 1690 гг.] ........ 113

## НАУЧНАЯ ЖИЗНЬ

*Шумейко М. Ф., Яновский О. А.* Международная научная конференция «История и историография: объективная реальность и научная интерпретация» (Минск, исторический факультет Белорусского государственного университета, 5 октября 2018 г.) ........ 117

*Бурачонок А. В.* Международная научная конференция «Формирование белорусской государственности в условиях геополитических сдвигов XX в.» ........ 121

*Курлович П. С., Сидорович В. М.* Международная научная конференция «Этнокультурные процессы на территории Беларуси в I – начале II тысячелетия н. э.», посвященная 90-летию профессора Э. М. Загорульского ........ 124

## ЮБИЛЕИ

Эдуард Михайлович Загорульский ........ 128

Аннотации депонированных в БГУ работ ........ 131

## ЗМЕСТ

Ад рэдакцыі ........ 8

### ДА СТАГОДДЗЯ СТВАРЭННЯ БДУ

*Латушкін А. М.* Роля Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта ў працэсах вяртання архіўнай спадчыны Вялікага Княства Літоўскага ў БССР у 1920-я гг. ........ 10

*Вайтовіч А. У.* Станаўленне археалагічнай адукацыі на гістарычным факультэце Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта ў 1934–1941 гг. ........ 23

### ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ

*Гушчынскі І. Г.* Трансфармацыя судовай сістэмы на тэрыторыі Беларусі (1772–1796) ........ 34

*Вароніч Т. У.* Адміністрацыйна-паліцэйскае рэгуляванне прастытуцыі ў гарадах Беларусі: другая палова XIX – пачатак XX ст. ........ 46

*Астрога В. М.* Сацыяльна-прававое становішча настаўнікаў сярэдніх навучальных устаноў Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. ........ 57

*Ходзін С. М.* Трансфармацыя адзінаасобнай сялянскай гаспадаркі ў Беларусі ў 1920–30-я гг. ........ 67

### УСЕАГУЛЬНАЯ ГІСТОРЫЯ

*Махан М. С.* Культавая архітэктура горада Барсіпы ........ 76

*Папашвілі М., Карчава Т., Цытланадзэ Т., Квачадзэ Б.* Адносіны ўсходніх хрысціян са Святым прастолам: Ліёнскі сабор 1274 г. і Грузія ........ 83

*Давідовіч А.* Роля хрысціянскіх каштоўнасцей у палітычнай думцы Нацыянальнай партыі ў Польшчы (1928–1939) ........ 95

### МУЗЕЯЗНАЎСТВА

*Ананьеў В. Г.* Да гісторыі музеефікацыі Ісакіеўскага сабора ў канцы 1920-х гг. ........ 102

### КРЫТЫКА І БІБЛІЯГРАФІЯ

*Галубовіч В. У.* Metryka Litewska. Rejestry podymnego Wielkiego Księstwa Litewskiego. Województwo połockie 1667 i 1690 r. Opracowali Henryk Lulewicz i Andrzej Rachuba [Літоўская метрыка. Рэестры падымнага падатку ў Вялікім Княстве Літоўскім. Полацкае ваяводства 1667 і 1690 гг.] ........ 113

### НАВУКОВАЕ ЖЫЦЦЁ

*Шумейка М. Ф., Яноўскі А. А.* Міжнародная навуковая канферэнцыя «Гісторыя і гістарыяграфія: аб'ектыўная рэальнасць і навуковая інтэрпрэтацыя» (Мінск, гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, 5 кастрычніка 2018 г.) ........ 117

*Бурачонак А. В.* Міжнародная навуковая канферэнцыя «Фарміраванне беларускай дзяржаўнасці ва ўмовах геапалітычных зрухаў XX ст.» ........ 121

*Курловіч П. С., Сідаровіч В. М.* Міжнародная навуковая канферэнцыя «Этнакультурныя працэсы на тэрыторыі Беларусі ў I – пачатку II тысячагоддзя н. э.», прысвечаная 90-годдзю прафесара Э. М. Загарульскага ........ 124

### ЮБІЛЕІ

Эдуард Міхайлавіч Загарульскі ........ 128

Анатацыі дэпаніраваных у БДУ прац ........ 131

## CONTENTS

Editorial .................... 8

### BELARUSIAN STATE UNIVERSITY CELEBRATES 100th ANNIVERSARY

*Latushkin A. N.* The role of the Belarusian State University in the processes of returning the archival heritage of the Grand Duchy of Lithuania in the 1920s .................... 10

*Vaitovich A. U.* The becoming of the archaeological education at the faculty of history of the Belarusian State University in 1934–1941 .................... 23

### BELARUSIAN HISTORY

*Hushchynski I. H.* Transformation of the judicial system in the territory of Belarus (1772–1796) .................... 34

*Voronich T. V.* Administrative and police control of prostitution in the cities of Belarus: the second half of the XIX – early XX century .................... 46

*Astroha V. M.* Social and legal status of teachers of secondary schools in Belarus in the second half of XIX – early XX century .................... 57

*Khodzin S. M.* Transformation of individual peasant economy in Belarus in 1920–30s .................... 67

### WORLD HISTORY

*Mahan M. S.* Religious architecture of the city of Borsippa .................... 76

*Papashvili M., Karchava T., Tsitlanadze T., Kvachadze B.* Relations of eastern Christians with holy see – the Lyon Council of 1274 and Georgia .................... 83

*Dawidowicz A.* The role of Christian values in the political thought of the National Party in Poland (1928–1939) .................... 95

### MUSEOLOGY

*Ananiev V. G.* Towards the history of museumification of St. Isaac Cathedral in the end of 1920s .................... 102

### REVIEW AND BIBLIOGRAPHY

*Halubovich V. V.* Lithuanian Metrica. Grand Duchy of Lithuania household tax registers. Polatsk province 1667 and 1690 .................... 113

### SCIENTIFIC EVENTS

*Shumeiko M. F., Yanouski A. A.* International scientific conference «History and historiography: objective reality and scientific interpretation» (Minsk, faculty of history, Belarusian State University, 5 October, 2018) .... 117

*Burachonak A. V.* International scientific conference «Formation of Belarusian statehood in conditions of geopolitical shifts of the XX century» .................... 121

*Kurlovich P. S., Sidarovich V. M.* International scientific conference «Ethnocultural processes on the territory of Belarus in the I – the beginning of the II millennium AD» dedicated to the 90th anniversary of the professor E. M. Zagorulsky .................... 124

### JUBILEES

Eduard Mihailavich Zagorulsky .................... 128

Indicative abstracts of the papers deposited in the BSU .................... 131

*Журнал включен Высшей аттестационной комиссией Республики Беларусь в Перечень научных изданий для опубликования результатов диссертационных исследований по историческим наукам, а также в области музееведения, консервации, реставрации историко-культурных объектов, документалистики, документоведения и архивоведения.*

*Журнал включен в библиографическую базу данных научных публикаций «Российский индекс научного цитирования» (РИНЦ).*

**Журнал Белорусского государственного университета. История.**
**№ 1. 2019**

Учредитель:
Белорусский государственный университет

Юридический адрес: пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск.
Почтовый адрес: пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск.
Тел. (017) 259-70-74, 259-70-75.
E-mail: jhistory@bsu.by

«Журнал Белорусского государственного университета. История» издается с января 1969 г.
До 2017 г. выходил под названием «Веснік БДУ. Серыя 3, Гісторыя. Эканоміка. Права» (ISSN 2308-9172).

Редакторы *А. С. Люкевич, О. А. Бабашова, С. Е. Богуш*
Технический редактор *Т. А. Караневич*
Корректоры *К. Б. Скакун, Л. А. Меркуль*

Подписано в печать 31.01.2019.
Тираж 100 экз. Заказ 52.

Республиканское унитарное предприятие «Информационно-вычислительный центр Министерства финансов Республики Беларусь».
ЛП № 02330/89 от 03.03.2014.
Ул. Кальварийская, 17, 220004, г. Минск.

© БГУ, 2019

**Journal of the Belarusian State University. History.**
**No. 1. 2019**

Founder:
Belarusian State University

Registered address: 4 Niezaliežnasci Ave., Minsk 220030.
Correspondence address: 4 Niezaliežnasci Ave., Minsk 220030.
Tel. (017) 259-70-74, 259-70-75.
E-mail: jhistory@bsu.by

«Journal of the Belarusian State University. History» published since January, 1969.
Until 2017 named «Vesnik BDU. Seryja 3, Gistoryja. Jekanomika. Prava» (ISSN 2308-9172).

Editors *A. S. Lyukevich, O. A. Babashova, S. J. Bohush*
Technical editor *T. A. Karanevich*
Proofreaders *K. B. Skakun, L. A. Merkul’*

Signed print 31.01.2019.
Edition 100 copies. Order number 52.

Republican Unitary Enterprise «Informatsionno-vychislitel’nyi tsentr Ministerstva finansov Respubliki Belarus’».
License for publishing No. 02330/89, 3 March, 2014.
17 Kaĺvaryjskaja Str., Minsk 220004.

© BSU, 2019